*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 САКАВІКА 2008 г. ЧАЦВЕР

№ 58 (26171)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

## УСЁ ПРА ДАПАМОГУ З АДРАСАМ

З моманту ўвядзення новых умоў аказання адраснай сацыяльнай дапамогі прайшло больш за тры месяцы. Між тым гэта тэма — па-ранейшаму на слыху. Хто можа і хто не можа разлічваць на адрасную падтрымку, на каго з членаў сям'і яна прызначаецца, як вызначаюцца выплаты, што такое сукупны даход і каэфіцыент уліку эфекту ад сумеснага пражывання? Аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць падчас «прамой лініі» з **начальнікам упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Пятроўнай СЯРГЕЕВАЙ.**

***Такім чынам, увага! Наша «прамая лінія» будзе праходзіць 28 сакавіка з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92.***

**Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.**

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ КВАРТАЛЕ!

***Заканчваецца падпіска на II квартал 2008 года***

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **8800** | **26400** | **52800** |
| **63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **8300** | **24900** | **49800** |
| **63858 (ведамасны)** | **14000** | **42000** | **84000** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **12800** | **38400** | **76800** |

## Акцыя «Звязды»:
## Як жывеш, аграгарадок?

У апошнія гады ў нашу гаворку трывала ўвайшло слова «аграгарадок». Практычна яно стала вызначальным ва ўсёй сістэме пераўладкавання вёскі, цэнтральнай ідэяй дзяржаўнай ідэалогіі ў пабудове дастойнага сучаснага ўкладу жыцця на большасці тэрыторыі нашай краіны, якой і з'яўляецца вёска. Але любая ідэя, як вядома, прыгожая сваім увасабленнем. Ці правільна выбраны стратэгічныя накірункі, ці падмацавалі іх удалай тактыкай, ці ўсё здолелі на сённяшні дзень зрабіць, каб прымусіць ідэю максімальна працаваць на вынік? Сітуацыю даследуюць карэспандэнты газеты ў розных рэгіёнах Беларусі. Пачатак размовы — **на 5-й стар.** Запрашаем чытачоў працягнуць яе.

### ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання пачне сваю работу 2 красавіка 2008 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 красавіка 2008 года з 8.30 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

## Міністэрства адукацыі не плануе ўводзіць адзіны экзамен за сярэднюю школу

**Аб гэтым паведаміў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў на online-канферэнцыі на тэму «Выпускнік-2008» у Беларускім тэлеграфным агенцтве.**

«Нам неабходна было вырашыць праблему карупцыі ў час уступнай кампаніі, — растлумачыў міністр, — гэту з'яву неабходна было выкараніць. Вось чаму ўказам кіраўніка дзяржавы было ўведзена цэнтралізаванае тэсціраванне. Яно вельмі падобнае на адзіны дзяржэкзамен, які ўведзены ў Расіі, толькі там яго здаюць у школе, а ў нас — пры паступленні ў ВНУ і ССНУ». «Мы лічым, што наш шлях больш аптымальны, навошта, напрыклад, чалавеку, які не хоча паступаць у ВНУ або ССНУ, праходзіць лішнія іспыты. Ён закончыў школу, здаў экзамены сваім жа школьным выкладчыкам і пайшоў вучыцца далей у ПТВ або ўвогуле вырашыў спачатку папрацаваць», — падкрэсліў міністр. Акрамя таго, такая схема паступлення вырашыла супярэчнасці паміж навучаннем у школе ў 11-м класе і экзаменамі ў ВНУ або ССНУ. Раней школьнікі ў апошнім класе рыхтаваліся да паступлення і не наведвалі «непатрэбныя» прадметы, цяпер жа такога няма, рэзюмаваў Аляксандр Радзькоў. У Беларусі распрацаваны пакет сацыяльных гарантый студэнтам і навучэнцам. У прыватнасці, нагадаў міністр, у рэспубліцы вызначаны парадак аказання матэрыяльнай дапамогі на праезд. Яна можа быць аказана навучэнцам і студэнтам у выглядзе частковай кампенсацыі (у памеры, які не перавышае 50 працэнтаў) кошту праезду (праязнога дакумента) да месца пражывання сям'і (бацькоў) не больш як за дзве паездкі (туды і назад) у месяц на пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносінаў або не больш як на чатыры паездкі (туды і назад) у месяц на пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

**ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) повторно проводят открытый аукцион**

**по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.**

| *Номер лота* | *Номер машиноместа* | *Общая площадь, кв. м* | *Начальная цена, бел. рубли* | *Сумма задатка, бел. рубли* |
|---|---|---|---|---|
| 5. | 5. | 11.9 | 8 499 992 | 849 999 |
| 9. | 13. | 12.2 | 8 714 277 | 871 428 |
| 11. | 17. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 12. | 20. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 14. | 22. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 15. | 27. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 16. | 28. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 17. | 29. | 11.7 | 8 357 135 | 835 714 |
| 18. | 30. | 11.7 | 8 357 135 | 835 714 |
| 28. | 46. | 10.2 | 7 285 707 | 728 571 |

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. **Аукцион состоится 04 апреля 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 03 апреля 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе и порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.03.2008.

**Телефоны для справок: 227 48 36, 227 40 22 – УП «Минский городской центр недвижимости»**

УНП 190398583.



# СЕМ НЯВЕСТАЎ АД СЛЕСАРА АБРАМЧУКА, альбо ЗНАЙСЦІ СВАЮ МОНУ ЛІЗУ

**У сям'і першае дзіця самае жаданае, і найчасцей хочуць, каб гэта быў сын. І так у многіх народаў. Асобы каранаваныя чакаюць наследніка і апошні бядняк жадае мець сына. А калі нараджаюцца толькі дочкі, то на бацьку глядзяць са спачуваннем: вось не шанцуе чалавеку! А можа наадварот? Тым болей, калі ў доме — не адна дачушка, а сем?**

**Але гэта толькі вонкавы бок справы. Здаралася, жанчыны кіравалі імперыямі і дзяржавамі, а наследныя прынцы ні на што не былі прыдатныя.**

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

Ва Ўрадзе

# ІНВЕСТЫЦЫІ ПАДКАЧАЛІ...

**Каб не наступіць на старыя граблі, калі напрыканцы мінулага года краіна сутыкнулася з рэзкім павышэннем інфляцыі, урад ужо на пачатку гэтага года прыняў адпаведныя папераджальныя меры. Як паведаміў на ўчарашнім пасяджэнні Савета Міністраў Беларусі міністр эканомікі Мікалай Зайчанка, за два першыя месяцы інфляцыя склала 3,2 працэнта (між іншым, у Расіі яна дасягнула 3,5 працэнта, ва Украіне — 5,7). На сёння, удакладніў міністр, структура росту індэкса спажывецкіх цэнаў уключае ўжо выкарыстаны ліміт росту кошту паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама частковае ўпарадкаванне цэнаў на прадукцыю аграпрамысловага комплексу.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, чакаецца, што ў першым квартале інфляцыя не выйдзе за межы ў 3,7 працэнта (у сакавіку яна павінна быць на ўзроўні 0,5 працэнта): гэта лічба блізкая да прагнознага значэння. Тым не меней, утрымаць інфляцыю па выніках года ў межах 8 працэнтаў застаецца выключна складанай і напружанай задачай. Як патлумачыў Мікалай Зайчанка, у Мінэканомікі і ва ўрадзе знаходзіцца шэраг прапаноў, у прыватнасці Мінсельгасхарча, Мінэнерга, Мінжылкамгаса, Мітранса, Мінсувязі, Беларускай чыгункі па павышэнні цэнаў і тарыфаў. Аднак, паводле слоў міністра, калі прыняць іх, то аб узроўні інфляцыі ў 8 працэнтаў трэба забыць — яна можа дасягнуць 16—20 працэнтаў. Таму міністэрства да падобных прапаноў будзе падыходзіць вельмі ўзважава і жорстка. «Мы будзем імкнуцца забяспечыць бясстратнае вядзенне гаспадаркі, але пры гэтым не пойдзем на кратнае павышэнне цэнаў і тарыфаў на асобныя віды тавараў і паслуг»,— зазначыў міністр.

Аналізуючы вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця за два месяцы, Мікалай Зайчанка падкрэсліў, што ў лютым у параўнанні з першым месяцам года сітуацыю ўдалося палепшыць. Так, валавы ўнутраны прадукт павялічаны на 9,9 працэнта, прадукцыя прамысловасці — на 12,9, выпуск спажывецкіх тавараў узрос на 14 працэнтаў, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі склала 16,1 працэнта. Разам з тым застаецца і шмат праблемных пытанняў, на якіх спыніўся міністр. Адно з іх — параметр росту вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі, які не выкананы ні ў адной з абласцей. Мінсельгасхарч, паводле слоў Мікалая Зайчанкі, тлумачыць гэта станам хатніх гаспадарак насельніцтва, дзе вытворчасць прадукцыі скарачаецца ўжо на працягу многіх гадоў і за сёлетнія студзень-люты ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам паменшылася яшчэ на 5,6 працэнта.

Не лепшым чынам пачаўся год і па інвестыцыях у асноўны капітал, што, дарэчы, выклікала крытыку з боку кіраўніка ўрада Сяргея Сідорскага. Як чакаецца, у першым квартале тэмп росту інвестыцый складзе каля 12 працэнтаў пры заданні 25 працэнтаў. Прэм'ер, у прыватнасці, узгадаў аб марудных тэмпах прыцягнення інвестыцый на прадпрыемствах Мінпрама, Мінбудархітэктуры, канцэрна «Беллегпрам», у Мінску. Шмат пытанняў у Сяргея Сідорскага выклікала работа, якая датычыцца рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. У краіне цяпер вядзецца маніторынг бізнэс-планавання на 5744 прадпрыемствах, аднак толькі 1759 пачалі рэалізацыю інвестпраектаў. Напрыклад, у Мінску з 437 прадпрыемстваў 135 займаюцца інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасцю. «Вы стварылі бізнэс-планы, узялі грошы ў банках і нічога не робіце, і мы сёння бачым, што толькі палова прадпрыемстваў займаецца фінансава-эканамічным аздараўленнем», — падкрэсліў прэм'ер. Каб работа ў гэтым пытанні ладзілася, на думку Сяргея Сідорскага, міністэрствам неабходна сканцэнтраваць намаганні не на падрыхтоўцы папер і справаздач, а дайсці да кожнага прадпрыемства: інавацыйныя і інвестыцыйныя праекты павінны выконвацца на кожным з іх.

Дакладваючы пра знешнеэканамічную дзейнасць, Мікалай Зайчанка нагадаў прысутным, што сёлета стаіць задача знізіць адмоўнае сальда з леташніх 2,7 мільярда долараў да 1,4 мільярда. У гэтым зніжэнні неабходна пагасіць яшчэ і патэнцыял росту цаны энерганосьбітаў, які працягваецца сёлета. У гэтых мэтах урадам прыняты неабходныя рашэнні і ўстаноўлены, у прыватнасці, паказчыкі апераджальнага росту экспарту. І вынікі першых месяцаў, прызнаўся міністр, усяляюць пэўны аптымізм. Так, за студзень аб'ём знешняга гандлю вырас на 59 працэнтаў, у тым ліку экспарт — на 71,8 працэнта, імпарт — на 48,7. Сальда за першы месяц склалася станоўчым у памеры 33,4 мільёна долараў. Разам з тым міністр папярэдзіў, што не трэба пераацэньваць гэты вынік: у яго аснове знаходзяцца падзеі леташняга студзеня, калі ў разгары быў энергетычны канфлікт з расійскім бокам (адмоўнае сальда ў студзені 2007 года складала амаль 300 мільёнаў долараў). «Для нас важна правільна ацаніць цэнавыя і фізічныя змяненні структуры экспартна-імпартных аперацый», — заўважыў ён. Аналіз паказвае, што, як і летась, у студзені гэтага года павелічэнне вартасных аб'ёмаў знешняга гандлю ў большай ступені абумоўлена рухам цэнаў, і ў меншай — рухам патокаў таварнай масы. За студзень у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам сярэднія цэны экспарту ўзраслі на 39,6 працэнта, а таварная маса — на 37,4, імпарту адпаведна на 22,5 і 21,1 працэнта. Як і летась, асноўнай крыніцай фарміравання адмоўнага сальда па таварах з'яўляліся экспартна-імпартныя аперацыі з энергетычнымі таварамі: адмоўнае сальда па іх склала 264,5 мільёна долараў і павялічылася ў адносінах да мінулага года на 137,2 мільёна. Аднак, дадаў Мікалай Зайчанка, па групе інвестыцыйных і спажывецкіх тавараў, а таксама іншых прамежкавых таварах (за выключэннем энергетычных) забяспечана станоўчае сальда ў памеры 108 мільёнаў долараў, 35 мільёнаў і 7 мільёнаў адпаведна, у той час як у леташнім студзені сальда па гэтых групах было адмоўным.

Агучваючы папярэднія вынікі знешняга гандлю за студзень-люты, міністр эканомікі паведаміў, што сальда ацэньваецца станоўчым і складзе каля 40 мільёнаў долараў. У першым квартале станоўчае сальда захаваецца і складзе каля 20 мільёнаў долараў.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗАЕХАЎ У ДОМ

**У Варнянах мужчына «зайшоў» у дом сужыцелькі... на аўтамабілі.**

Жыхарка вёскі Варняны Астравецкага раёна спала, калі яе сужыцель пасля 24 гадзін вярнуўся дамоў з гасцей на машыне «Аўдзі-100». Маючы ключ ад уваходных дзвярэй, ён (відаць, быў, мякка кажучы, не зусім цвярозы) не змог ім скарыстацца: некалькі разоў спрабаваў трапіць ключом у замок, але безвынікова. Тады ён сеў у сваю машыну, уключыў перадачу і паехаў прама на дзверы. Ад удару яны «выскачылі». Былі пашкоджаны сцены і перад аўтамабіля. Гора-вадзіцель, зразумеўшы, што сужыцелька яму гэтага не даруе, уцёк да родных у вёску Слабада...

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

### АЦАНІЎ ПАСЛУГІ Ў $95 ТЫСЯЧ

**У Мінску супрацоўнікамі падраздзяленняў па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю ГУУС і Цэнтральнага РУУС затрымалі намесніка дырэктара аднаго з заводаў.**

Падазраецца 63-гадовы мінчанін у тым, што падбухторваў намесніка дырэктара прыватнага ўнітарнага прадпрыемства да дачы хабару ў памеры 95 тысяч долараў ЗША. Гэтыя грошы, дарэчы, падазроны атрымаў. Што ж датычыцца самой паслугі, за якую намеснік дырэктара завода назначыў такую высокую цану, то яна заключалася ў вынясенні станоўчага рашэння па продажы трох аб'ектаў нерухомасці.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПОЎНЫ БАК КАШАЛЬКОЎ

**Грамадзянін Літвы падчас вяртання дамоў з нашай краіны заправіў свой аўтамабіль... скуранымі кашалькамі.**

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, у пункце пропуску «Беняконі-1» пры афармленні легкавога аўтамабіля «Фольксваген» у паліўным баку транспартнага сродку былі знойдзены 83 скураныя кашалькі. Адметна, што кашальковую кантрабанду выявіла чатырохногая памочніца памежнікаў — сабака па мянушцы Берта.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### КАЛІ Б НЕ ЭМЭНЭСАЎЦЫ...

Як апынуўся ў лазовых кустах, падтопленых вясновымі водамі ракі Друць, хлопец 1983 года нараджэння, яшчэ трэба высветліць. У яго самога. Бо ні лодкі, ні якіх-небудзь рыбацкіх прылад не было выяўлена. Калі яго выратавалі ад немінучай гібелі эмэнэсаўцы (чалавек, як паведаміў нам прэс-сакратар Гомельскага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Руслан Габрылёў, знаходзіўся ў глыбокім здранцвенні), то паспяшаліся даставіць у рэанімацыйнае аддзяленне рагачоўскай райбальніцы. Там ён цяпер і знаходзіцца.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Закрытое страховое акционерное общество «Бролли»

*220030 г. Минск, ул. Ульяновская, 31. Факс (017) 210-46-33, тел. 222-48-80*

### Годовой баланс за 2007 год

*тыс. руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* |
| **Основные средства** | 3241711,5 | **Источники собственных средств, всего** | 3474363,4 |
| **Нематериальные активы** | 39596,2 | в том числе: уставный фонд | 934817,0 |
| **Финансовые вложения, всего** | 2496433,3 | резервный фонд | 19974,5 |
| в том числе: инвестиции в дочерние общества | — | добавочный фонд | 1512468,6 |
| инвестиции в другие организации | 21582,2 | фонд накопления | 699755,5 |
| облигации и другие долговые обязательства | 2474851,1 | фонд потребления | — |
| прочие финансовые вложения | — | целевое финансирование | — |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | 1780028,7 | нераспределенная прибыль прошлых лет | — |
| **Дебиторы, всего** | 311055,8 | нераспределенная прибыль отчетного года | 307347,8 |
| в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 57036,4 | **Страховые резервы и фонды, всего** | 7818828,6 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | — | в том числе: страховые резервы | 7687786,1 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 254019,4 | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 131042,5 |
| **Прочие активы, всего** | 5153980,2 | гарантийные фонды | — |
| в том числе: незавершенное строительство | — | **Кредиторы, всего** | 649161,4 |
| материальные ценности и затраты | 342262,5 | в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 67041,6 |
| денежные средства | 4811717,7 | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | — |
| собственные акции (доли) | — | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | — |
| прочие активы | — | заемные средства | 46972,1 |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | 481183,7 | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 535147,7 |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | — | **Прочие пассивы** | 1561636,0 |
| **БАЛАНС** | **13503989,4** | **БАЛАНС** | **13503989,4** |

### Отчет о финансовых результатах за 2007 год

*тыс. руб.*

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* |
| **I. Страхование жизни** | | |
| страховые взносы (премии) | 010 | — |
| страховые выплаты | 020 | — |
| изменения резерва по страхованию жизни (+ или -) | 030 | — |
| отчисления в гарантийный фонд | 040 | — |
| расходы на ведение дела | 041 | — |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | 050 | — |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | 10065937,2 |
| изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | 067 | - 1556525,2 |
| оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | 4098777,1 |
| изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | 092 | - 1085797,3 |
| изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | — |
| изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | — |
| отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 31989,8 |
| расходы на ведение дела | 120 | 4067926,6 |
| комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 351881,0 |
| комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 31326,9 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | 130 | - 454524,7 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | | |
| операционные доходы | 140 | 835769,9 |
| операционные расходы | 145 | 69052,3 |
| внереализационные доходы | 150 | 257499,3 |
| внереализационные расходы | 155 | 112311,4 |
| прибыль и убытки | 157 | 457380,8 |
| использовано прибыли | 158 | 150033,0 |
| **Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)** | 170 | 307347,8 |

Достоверность бухгалтерской отчетности подтверждена обществом с дополнительной ответственностью «Промаудит» 25 февраля 2008 года, специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0061721 от 03.02.2004 года выдана Министерством финансов РБ со сроком действия по 02.02.2009 года.

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности

«25» февраля 2008 г. г. Минск

***Адресат:*** генеральный директор ЗСАО «Бролли» С.Н. Ковалев.

***Аудируемое лицо:*** закрытое страховое акционерное общество «Бролли».

***Местонахождение:*** 220030 Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ульяновская, дом 31, литер Е 6/к.

***Государственная регистрация:*** № 100782388 от 23 августа 2001 года. УНП 100782388.

***Аудиторская организация:*** общество с дополнительной ответственностью «Промаудит».

***Местонахождение:*** 220090 г. Минск, ул. Кольцова, дом № 39, корпус 1, комната №1.

***Государственная регистрация:*** № 100073476 от 31 октября 2000 года. УНП 100073476.

***Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности:*** № 02200/0061721 от 03.02.2004 выдана Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2009.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности закрытого страхового акционерного общества «Бролли» за период с 1 января по 31 декабря 2007 года включительно. Бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗСАО «Бролли» состоит из: бухгалтерского баланса страховой организации; отчета о финансовых результатах страховой организации; приложения к балансу страховой организации; отчета об основных показателях финансово-хозяйственной деятельности страховой организации; отчета о движении денежных средств страховой организации; отчета о платежеспособности страховой организации; отчета о размещении страховых резервов; пояснительной записки с приложениями к ней.

Ответственность за подготовку и представление названной бухгалтерской (финансовой) отчетности несет руководство ЗСАО «Бролли». Наша обязанность заключается в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данной отчетности во всех существенных отношениях и соответствии порядка ведения бухгалтерского учета законодательству Республики Беларусь.

Мы провели аудит в соответствии с Законом Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», республиканскими правилами аудиторской деятельности, внутрифирменными правилами аудиторской деятельности, нормативными правовыми актами, регулирующими деятельность аудируемого лица.

Аудит планировался и проводился таким образом, чтобы получить достаточную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений. Аудит проводился на выборочной основе и включал в себя изучение доказательств, подтверждающих значение и раскрытие в бухгалтерской (финансовой) отчетности информации о финансово-хозяйственной деятельности ЗСАО «Бролли», оценку принципов и методов бухгалтерского учета, порядка подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности, определение и анализ существенных оценочных значений, применяемых ЗСАО «Бролли».

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗСАО «Бролли» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность закрытого страхового акционерного общества «Бролли» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год.

**Директор «Промаудит»** **А.В. Анисович**
**Руководитель аудиторской группы** **О.Г. Дроздов**

УНП 100782388

## Уважаемые акционеры!

**«ПРИОРБАНК» ОАО ДОВОДИТ ДО ВАШЕГО СВЕДЕНИЯ ИНФОРМАЦИЮ О РАЗМЕРЕ И ПОРЯДКЕ ВЫПЛАТЫ ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ 2007 ГОДА:**

- размер дивидендов по простым акциям составляет 408,5 рубля на акцию
- размер дивидендов по привилегированным акциям составляет 637,5 рубля на акцию
- телефон для справок: 8(017) 289 90 87

Перечисление дивидендов производится на счета акционеров. Для их получения физическим лицам необходимо иметь при себе паспорт. Получение дивидендов за третьих лиц допускается при наличии доверенности.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 26 апреля 2007 года. УНП 100220190*

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.03.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 3 354,89 |
| 1 латвійскі лат | 4 814,81 |
| 1 літоўскі літ | 971,23 |
| 1 чэшская крона | 131,09 |
| 1 польскі злоты | 950,15 |
| 1 расійскі рубель | 90,68 |
| 1 украінская грыўня | 428,23 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,6559 |
| 10 UAH | 46,8954 |
| 1000 BYR | 11,0143 |
| EUR | 36,9103 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 26.03.2008 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

### Сёння — Міжнародны дзень тэатра

# Трапіць пад млын і выжыць

**Калі нехта ў дні тэатральнага свята разважае аб праблемах беларускай драматургіі, то абавязкова знойдзецца яшчэ нехта, хто возьмецца з ёю працаваць. Тым самым даказваючы: спрэчкі спрэчкамі, а яна такая, якая ёсць, і, магчыма, такая, якія мы. Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ўчора прадставіў віцебскаму гледачу пастаноўку паводле п'есы Аляксея Дударава «Млын».**

Жыццё, як млын, перамолвае ўсе падзеі, якія здараюцца з чалавекам, часам з-за непераможных абставінаў, якія залежаць зусім не ад тваёй волі. Падзеі, якія могуць цалкам ператварыць чалавека ў асобу без імя і без памяці, калі хочацца выкрасліць назаўсёды, забыць, што такое рэпрэсіі, несправядлівыя абвінавачванні і невытлумачаныя пакуты. Істота, якая пакутуе ад таго, што імкнецца знайсці сябе сапраўднага, а гэта магчыма толькі тады, калі асэнсаваць наноў тое, што прайшоў — у дадзеным спектаклі герой Старцаў, чалавек, які стаў сведкам жорсткіх спраў мінулага стагоддзя. Імя і памяць можа страціць адзін чалавек, а можа нават цэлы народ, якому яшчэ прыйдзецца асэнсаваць і ўзважыць: што ж было ім страчана незваротна і што яшчэ можна аднавіць. Сур'ёзна і нават па-філасофску...

А вось сам аўтар вызначыў жанр гэтай п'есы: дэтэктыўная меладрама. Што такое і як можа выглядаць? Напэўна, дэтэктыўнай меладрамай можна лічыць і спектакль паводле ягонай п'есы «Кім» Купалаўскага тэатра. І, натуральна, адчуванні гледача будуць залежаць ад таго, наколькі ўяўленні аўтара пра такі жанр супалі з поглядамі на яго рэжысёра-пастаноўшчыка. А вось тут сапраўдная інтрыга. Першую пастаноўку спектакля паводле твора Аляксея Дударава «Млын» на сцэне Нацыянальнага тэатра ў Віцебску ажыццявіў ... расійскі рэжысёр Юрый Пахомаў, які працуе ў Томску. І да гэтага часу яму ўвогуле не даводзілася працаваць з беларускай драматургіяй. Ці адчуў ён, наколькі гэта загадкавая паненка? Віцебская публіка з вынікам пазнаёмілася ўчора падчас прэм'еры.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Абзац

● **Моцны снегапад, які прайшоў у Віцебскай вобласці, прывёў да адключэння электразабеспячэння ў 60 населеных пунктах. Абясточаныя 13 фермаў, 202 трансфарматарныя падстанцыі, 12 высакавольтных ліній. Паводле інфармацыі Віцебскаблгідрамета, за суткі ў большасці раёнаў вобласці выпала 1—2 дэкадныя нормы ападкаў, а ў Верхнядзвінскім раёне — месячная норма.**



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

● Снегапады працягваюцца ў Швейцарыі, яны сталі прычынай некалькіх сотняў аварый на аўтастрадах краіны. У сталічным раёне за дзень было зафіксавана 90 аварый. Па прагнозах сіноптыкаў, снегапады працягнуцца яшчэ два—тры дні. У апошнія дні зіма вярнулася ва ўсе еўрапейскія краіны. Адным з буйных здарэнняў, звязаных з катаклізмамі надвор'я, стала аварыя на галоўнай шашы Аўстрыі. На трасе, якая злучае Вену з Зальцбургам, сутыкнулася ад 50 да 100 аўтамабіляў. У выніку загінуў па меншай меры 1 чалавек, 30 атрымалі раненні. У адрозненне ад заснежанай Швейцарыі ў Маскве ўсталявалася самае цёплае надвор'е за ўсю гісторыю метэаназіранняў. 25 сакавіка ў 14:00 слупкі тэрмометраў у горадзе паказалі плюс 12,4 градуса. Моцны парыў ветра падняў у паветра зграю катоў у цэнтры Масквы. Інцыдэнт адбыўся ў раёне станцыі метро «Беларуская». Жывёлы ў выніку ўдару стыхіі не пацярпелі.

● **У Кіеве без электрычнасці засталося каля 2 тыс. дамоў. У Крыме і паўднёвых абласцях Украіны, дзе ўжо актыўна квітнелі пладовыя дрэвы, тэмпература за суткі панізілася амаль на 20 градусаў.**

● У Ваўкавыску на тэрыторыі вытворчай зоны выпраўленчай калоніі № 11 пабудавана арыштны дом. Установа размясцілася ў новым двухпавярховым будынк. Арыштны дом разлічаны на ўтрыманне ў камерах 250—270 зняволеных, якія не ўяўляюць асаблівай небяспекі і асуджаны на тэрмін ад 1 да 6 месяцаў, напрыклад, за дробнае махлярства або няплату падаткаў. Штат установы, які яшчэ фарміруецца, будзе складацца з 11 прадстаўнікоў адміністрацыі і 14 кантралёраў. Плануецца, што арыштныя дамы будуць пабудаваныя ў бліжэйшы час у кожнай вобласці рэспублікі. Яны ўжо дзейнічаюць у Баранавічах і Магілёве.

● **У Мінску з 27 сакавіка да 25 красавіка гэтага года зачыняецца рух трамваяў па маршруце № 2 «Мяснікова — Кастрычніцкая». Карэктывы ў рух грамадскага транспарту ўнесеныя ў сувязі з выкананнем рамонтных работ.**

## Поўны абзац

● **У Днепрапятроўску перавярнулася фура, якая перавозіла насенне сланечніка. У выніку больш за 20 тон семак высыпаліся на дарогу і яе абочыну. Вадзіцель абышоўся нязначнымі траўмамі, ад шпіталізацыі адмовіўся. Каб вызваліць праезную частку ад семак, спатрэбілася больш за шэсць гадзін.**

● У невялікім італьянскім горадзе Казамасіма ў дваццаці кіламетрах ад Бары рабаўніка да смерці задушыла сейфам, які ён спрабаваў выкрасці з супермаркета, паведамляюць інфармагенцтвы 33-гадовы Клементэ Каруза, як мяркуецца, з саўдзельнікамі, прабраўшыся ўначы ў краму, пагрузіў на падрыхтаваную транспартную прыладу 500-кілаграмовы сейф і паспрабаваў выкаціць яго на вуліцу. Аднак па незразумелых пакуль прычынах сейф паваліўся і раздушыў няўдачлівага рабаўніка. Саўдзельнікі злачынца схаваліся. Загінулага, у чорнай масцы на твары і пальчатках, выявілі раніцай прыбіральшчыкі крамы.

● **Сумна скончылася спроба двух жыхароў аднаго канадскага раёна знішчыць грызуноў, якіх называюць гаферамі, або мяшэччатымі пацукамі і якія капаннем сваіх нораў прычыняюць вялікія непрыемнасці мясцовым жыхарам. У выніку выкарыстання выбуховага рэчыва мужчыны ўчынілі пажар на тэрыторыі ў 160 акраў (65 гектараў), знішчыўшы ўсяго восем пацукоў і мноства драўляных пабудоў у акрузе. Агульныя страты, нанесеныя пажарам, склалі 200 000 канадскіх долараў (197 000 долараў ЗША). На аднаго з вінаватых пажару заведзена крымінальная справа.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# СВАЯ ПЕСНЯ

**Калі ўспомніць, колькі неабходна было патраціць часу, каб выклікаць таксі, то згадваецца: у свята гэта ўвогуле часта не ўдавалася зрабіць. Можна было гадзінамі круціць тэлефонны дыск, а ў адказ — кароткія гудкі. І гэта пры тым, што у той час існавалі салідныя прадпрыемствы — таксаматорныя паркі. Сёння ў Баранавічах такой структуры няма, а свабодныя таксі стаяць на кожным кроку.**



Доўга шукаў таксіста са стажам, бо ўсё больш трапляліся тыя, хто пайшоў на гэты хлеб выпадкова, усяго год-другі таму, а хацелася пагаварыць з чалавекам, які «з'еў» на асфальце не адну пару шын.

Сяргей Кавалевіч 26 гадоў за рулём як прафесіянал, з іх дванаццаць адпрацаваў у аўтобусным парку. Вазіў на экскурсіі турыстаў у Хатынь, Брэст, Нясвіж...

— Добрыя тады часы былі. Зарплата даходзіла да 300 рублёў, турысты прыязджалі з усяго Саюза, — успамінае мой суразмоўца, — а затым усе гэтыя палітычныя пертурбацыі прывялі да таго, што зарплату пачалі затрымліваць, ды і заробак стаў не той, бо людзям было не да экскурсій. Давялося пакінуць прадпрыемства і ісці на свой хлеб.

Сёння Кавалевіч працуе ў фірме «Спіка», якая не мае нічога агульнага з савецкім таксаматорным паркам. Проста фірма пастаўляе сваім работнікам-вадзіцелям заказчыкаў. Чалавек звоніць на фірму, а дыспетчар накіроўвае па радыётэлефоне на адрас машыну. За гэта фірма бярэ з заказу 12 працэнтаў. Работнік жа працуе на сваім аўтамабілі, запраўляе яго і рамантуе, фактычна за ўсё адказвае ён. Але прынцып работы Сяргея Кавалевіча задавальняе: змена за рулём, а затым двое сутак дома.

Зарплата залежыць ад колькасці пасажыраў. Чым часцей яны садзяцца ў машыну, тым весялей вадзіцелю.

Сітуацыя з пасажырамі змянілася. Напрыклад, пяць гадоў таму стаяць даводзілася 15-20 хвілін, а сёння чакаць пасажыра можна і дзве гадзіны. Здараюцца і канфузы. Аднойчы за суткі не было ніводнага пасажыра, — паскардзіўся Кавалевіч.

Прычына не толькі ў тым, што людзі сталі менш на таксі ездзіць: даймаюць і канкурэнты. Сёння ў тэлефонным даведніку некалькі нумароў, па якіх можна выклікаць таксі. Відавочна, Баранавічы ўжо дастаткова насычаныя гэтым відам транспарту. Рынак можа быць перанасычаны не толькі таварам, але і паслугамі.

Пэўную праблему ствараюць і «левакі»: перахопліваюць пасажыраў, маюць пэўны заробак, а падаткаў не плацяць. І аказалася, што весці з імі барацьбу складана. Вось стаіць перад вакзалам машына, а як даказаць, што яе гаспадар чакае «левага» пасажыра? Вока ў яго спрактыкаванае і падатковага інспектара ў машыну ён стараецца не пасадзіць.

На таксі наляпілі спецыяльныя палосы, далі асобныя нумары, зрабілі іх адметнымі і думалі, што гэта дапаможа хутчэй выявіць чужых, але на справе нічога не змянілася.

А як паводзяць сябе пасажыры? Аказалася, што нашы людзі вельмі законапаслухмяныя. За ўсе гады працы ніякіх надзвычайных сітуацый у Сяргея Кавалевіча не было. Ну, калі не лічыць тых момантаў, калі пасажыр, не заплаціўшы, уцякаў, але такое здаралася рэдка. Магчыма, гэта звязана з тым, што дыспетчар нумар тэлефона заказчыка фіксуе, ці сапраўды мы такія памяркоўныя і рахманыя.

Пра свой заробак суразмоўца нічога не сказаў. Маўляў, не лічу, аддаю жонцы і яна там «бабкі» падбівае. Але я зразумеў, што чалавек ад сваёй працы прыбытак мае, а інакш які сэнс садзіцца за руль?

Кошт адной паездкі па горадзе — шэсць тысяч рублёў і, здавалася б, грошы невялікія, але калі заказы ёсць, то за суткі пэўная сума набіраецца. А найбольшы даход даюць выхадныя і святочныя дні.

Тут неабходна ўлічваць і затраты на ўтрыманне машыны. На старой і з'езджанай многа не заробіш, бо рамонт абыходзіцца ў вялікую суму, ды і машына павінна быць на хаду — рабочы інструмент. І расход паліва па горадзе даволі высокі.

Нядзіўна, што Кавалевіч ужо «з'ездзіў» тры машыны, і апошняя, «Шкода» 2001 года выпуску, пакуль што не падводзіла.

Адназначна, калі чалавек з'яўляецца шафёрам першага класа, то аўтамабіль для яго не таямніца за сямю замкамі. А што датычыцца нейкіх там дарожных здарэнняў, то пры гэтым пытанні Сяргей Сяргеевіч сплюнуў цераз плячо: «Бог мілаваў».

Не было і прэтэнзій з боку работнікаў ДАІ, ды і тэхагляды, а яны двойчы ў год, праходзяць гладка.

Калі чалавек на сваім месцы і спецыяліст у сваёй справе, то многія праблемы адпадаюць. Гэта аматарам машына часта дастаўляе больш клопату, чым радасці.

Падчас размовы Кавалевіч сказаў, што шум рухавіка для яго, як тая песня. І падумалася, а чаму б чалавеку не вярнуцца ў аўтобусны парк, які сёння працуе стабільна, ды сесці за руль аўтобуса і слухаць басавітую песню дызеля — ад зарплаты да зарплаты? Пра гэта я сказаў Кавалевічу.

— Вярнуцца можна, але лепш за ўсё слухаць песню матора свайго аўтамабіля, — быў адказ.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Спорт-тайм

### «МАЛАДЗЁЖКА» АБЫГРАЛА ЛІТОЎЦАЎ

Маладзёжная зборная Беларусі (U-21) на штучным полі пінскага стадыёна «Хваля» правяла таварыскі матч з равеснікамі з Літвы і перамагла — 2:0. Галоўны трэнер нашай каманды Юрый Курненін напярэдадні матчу меў некаторыя кадравыя праблемы. Антона Пуцілу, Ігара Шытава і Андрэя Чухлея выклікаў у нацыянальную зборную Бернд Штанге, а Аляксея Кучука папрасіла не выклікаць кіраўніцтва малдаўскага «Шэрыфа». Беларусы адкрылі лік на 24-й хвіліне, вызначыўся Дзмітрый Камароўскі. Праз шэсць хвілін гаспадары падвоілі перавагу, на гэты раз забіў Сяргей Крывец. Пасля перапынку беларусы маглі давесці гульню да разгрому.

### ІСПАНЕЦ ПАЗБАВІЎ ІЗРАІЛЬЦЯНІНА 12 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Балельшчык «Бецiса», што разбіў твар варатару «Атлеціка» бутэлькай, якую кінуў на поле падчас матча чэмпіянату Іспаніі, пазбавіў ізраільскага знатака футбола 12 мільёнаў долараў. Хуліганскі ўчынак іспанца прывёў не толькі да спынення матча, але і да істотнага змянення памеру галоўнага прыза ў ізраільскай латарэі спортлато. Сустрэча, якая праходзіла 15 сакавіка, была ўнесена ў лік тых, адгадаўшы вынік якой, пераможца мог разлічваць амаль на 15 мільёнаў долараў. Аднак спыненне матча ў Севільі прывяло да таго, што ігрок, які прадказаў 15 вынікаў, атрымаў толькі тры мільёны, паведамляе «Спорт-эскпрэс».

### УЗЯЛІ РЭВАНШ — АТРЫМАЛІ «БРОНЗУ»

Зборная Беларусі заняла трэцяе месца на 8-м чэмпіянаце Еўропы па футзале, які завяршыўся ў Бельгіі. У матчы за бронзавыя ўзнагароды кантынентальнага першынства наша каманда выйграла ў бельгійцаў з лікам 2:1. Да гэтага, на папярэднім этапе спаборніцтваў, гаспадары чэмпіянату абыгралі нашых спартсменаў — 3:2. За «золата» змагаліся расіяне і чэхі. У асноўны і дадатковы час пераможца не быў выяўлены — 3:3, а ў серыі паслематчавых пенальці ўдача была на баку расійскай каманды — 3:2. Зборная Расіі другі раз запар стала лепшай на кантыненце.

Згубленае пасведчанне інваліда серыі 15 № 0041321 на імя **КАПУЦКАГА Віктара Емяльянавіча** лічыць несапраўдным.

## Скралі карову... вартаўнікі

**З фермы ў Шаркоўшчынскім раёне скралі карову вагой пад 550 кілаграмаў. Матэрыяльная страта — прыблізна 2,3 мільёна рублёў. Пра гэта расказаў у РАУС кіраўнік гаспадаркі.**

Здарэнне адбылося, нягледзячы на тое, што жывёл даглядаў вартаўнік. Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама, хутка высветлілася, што на злачынства пайшлі... два вартаўнікі гэтай жа гаспадаркі — мясцовыя жыхары, адзін з якіх раней быў судзімы. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Элитпаркет» за 2007 год**

| Наименование показателей | Ед-ца изм. | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции | млн. руб. | 30 |
| Себестоимость реализованной продукции | млн. руб. | 23 |
| Обеспеченность акции имуществом | тыс. руб. | 1,19 |
| Количество акционеров | лиц | 2 |
| Среднесписочная численность | человек | 37 |

УНН 690613409

**Предложение о покупке простых (обыкновенных) акций Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк»**

| | |
|---|---|
| Наименование, местонахождение покупателя акций | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Валимед», 220012, г. Минск, проспект Независимости, 87а, комн. 11 |
| Наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк», 220012, г. Минск, проспект Независимости, 87а |
| Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции | 24 (Двадцать четыре) белорусских рубля |
| Сроки, форма и порядок оплаты акций | Оплата будет осуществляться в безналичной форме путем перечисления денежных средств на счет продавца в срок до 09 июня 2008 г. с момента вступления договора купли-продажи акций в силу |
| Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций | 220012, г. Минск, проспект Независимости, 87а |
| Даты начала и окончания покупки акций | Дата начала покупки акций — 26.03.2008 г.<br>Дата окончания покупки акций — 30.03.2008 г. |

**Телефон для справок (017) 287 38 45**

УНП 800005506

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 2007 ГОД

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МОНТАЖЛЕГМАШ»**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2008 г.**

*млн. руб.*

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код строки | На начало отчетного года | На конец отчетного года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства (01, 02) | 110 | 922 | 1647 |
| Нематериальные активы (04, 05) | 120 | 2 | 1 |
| Доходные вложения в материальные ценности (02, 03) | 130 | 8 | 110 |
| Вложения во внеоборотные активы (07, 08) | 140 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | 932 | 1758 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 350 | 406 |
| Налоги по приобретенным ценностям (18, 76) | 220 | 12 | 19 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 6 | 4 |
| Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57) | 250 | 1 | — |
| Финансовые вложения (58, 59) | 260 | 10 | 10 |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | 379 | 439 |
| **БАЛАНС** | 300 | 1311 | 2197 |
| **ПАССИВ** | | | |
| **III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ** | | | |
| Уставный фонд (80) | 410 | 45 | 85 |
| Собственные акции, выкупленные у акционеров | 411 | -2 | |
| Резервный фонд (82) | 420 | 22 | |
| Добавочный капитал (83) | 430 | 933 | 1743 |
| Нераспределенная прибыль (84) | 450 | 3 | 4 |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | 1001 | 1832 |
| **IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы (67) | 510 | 66 | |
| Краткосрочные кредиты и займы (66) | 520 | | 87 |
| Кредиторская задолженность | 530 | 242 | 278 |
| Резервы предстоящих расходов | 550 | 2 | |
| **ИТОГО по разделу IV** | 590 | 310 | 365 |
| **БАЛАНС** | 600 | 1311 | 2197 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2007 г.**

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код строки | На начало отчетного года | На конец отчетного года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 1550 | 1671 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 276 | 297 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 1274 | 1374 |
| Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 1287 | 1361 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050) | 060 | -13 | 13 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 070 | 15 | 60 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 071 | 2 | 0 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 080 | 13 | 51 |
| В том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 081 | 7 | 8 |
| от выбытия основных средств и нематериальных активов | 082 | 1 | |
| прочие операционные доходы | 083 | 5 | 43 |
| Операционные расходы | 090 | 18 | 45 |
| В том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 091 | 1 | 1 |
| прочие операционные расходы | 093 | 17 | 44 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (080-090-100-110) | 120 | -5 | 6 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 113 | 77 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в внереализационные доходы) | 140 | 113 | 76 |
| В том числе: прочие внереализационные доходы | 144 | 113 | 76 |
| Внереализационные расходы | 150 | 61 | 52 |
| В том числе: прочие внереализационные расходы | 154 | 61 | 52 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | 52 | 24 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060-120-160) | 200 | 34 | 43 |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | 210 | 30 | 42 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 1 | 1 |
| Чистая прибыль (убыток) (200-210-220) | 240 | 3 | |

**ПУНКТЫ 5—7 И 9—10 ФОРМЫ 1 «ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ»**

**5. Количество акционеров всего — 124, в том числе: юридических лиц — нет, физических лиц — 124**

**6. Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. руб. | 3 | 1 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 1200 | 500 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 648 | 355 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | — | — |
| **7. Информация о задолженности** | | | |
| Просроченная дебиторская задолженность (долгосрочная) | млн.руб. | 0 | 0 |
| Просроченная кредиторская задолженность (долгосрочная) | млн. руб. | 0 | 0 |

**9. Среднесписочная численность работающих (человек) — 64**

**10. Основной вид деятельности,** по которому получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг — **строительные и монтажные работы**

**Директор** **А.С. Чернюк**
**Главный бухгалтер** **Т.С. Колос**

УНП 700099371

# «ТЭЛЕ»АГЛЯД РАБОЧАГА ПАСЁЛКА



*Рабочы пасёлак Рэчыца Столінскага раёна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Міністэрства адукацыі не плануе ўводзіць адзіны экзамен за сярэднюю школу

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Матэрыяльная дапамога аказваецца навучэнцам і студэнтам на праезд з 1 кастрычніка па 30 чэрвеня — у суботнія, нядзельныя і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя нерабочымі, а таксама ва ўсе дні тыдня ў час зімовых канікулаў.

Акрамя таго, можна атрымаць аднаразовую матэрыяльную дапамогу пры праходжанні лячэння ў санаторыях і прафілакторыях, пры крызісных сітуацыях у жыцці. Аказаць яе могуць не толькі навучальная ўстанова, але і прафсаюзная і грамадскія арганізацыі.

Паводле слоў міністра, усе пытанні, якія датычацца матэрыяльнай дапамогі, аддадзены ў веданне кіраўніцтва навучальных устаноў, таму для вырашэння гэтай праблемы студэнтам неабходна звярнуцца ў дэканат.

Яшчэ адным відам падтрымкі дзяржавы маладым людзям Аляксандр Радзькоў назваў стыпендыю. Цяпер памеры вучэбных стыпендый для студэнтаў ВНУ складаюць ад Br89,4 тыс. да Br143,1 тыс. З гэтага года 200 лепшых студэнтаў атрымліваюць стыпендыі Прэзідэнта Беларусі за асаблівыя поспехі ў вучобе, навукова-даследчай і творчай дзейнасці.

Міністэрства адукацыі Беларусі не плануе абмяжоўваць час заканчэння школьных выпускных вечароў.

Пытанні часу і месца правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў вырашае адміністрацыя школы сумесна з бацькоўскімі камітэтамі. «Мы не лічым неабходным перашкаджаць галоўнай традыцыі выпускнікоў школ — сустрэчы світання», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. Час заканчэння вечароў афіцыйна не называецца.

Рэкамендуецца арганізоўваць вечары ва ўстановах адукацыі, а калі некаторыя школы не змогуць умясціць вялікую колькасць удзельнікаў мерапрыемства, то ва ўстановах культуры. У адзінкавых выпадках свята можа прайсці ў кафэ па ўзгадненні з мясцовымі адміністрацыямі і пры наяўнасці адпаведных умоў бяспекі.

У час правядзення выпускных безумоўна будзе ўведзена забарона на продаж спіртных напіткаў і піва. Акрамя таго, міліцыя будзе несці кругласутачнае дзяжурства, удакладніў Аляксандр Радзькоў.

Даведацца аб кватэрах, якія здаюцца ўнаймы, абітурыенты могуць па тэлефонах гарачых ліній ВНУ Беларусі. Аб гэтым паведаміў міністр адукацыі

Паводле яго слоў, каб дапамагчы абітурыентам і студэнтам вырашыць жыллёвае пытанне, па ініцыятыве актываў некаторых студэнцкіх гарадкоў ствараюцца электронныя банкі даных аб кватэрах і пакоях, што здаюцца грамадзянамі ўнаймы. Напрыклад, у БДУ такі банк даных быў створаны ў мінулым годзе, працавала «гарачая» тэлефонная лінія па аказанні дапамогі ў пошуку жылля, засяленне ў інтэрнаты.

Аляксандр Радзькоў падкрэсліў, што вырашыць пытанні жылля можна пры падачы дакументаў на паступленне.

Пры жаданні студэнт-платнік можа атрымаць у ВНУ размеркаванне.

Як растлумачыў міністр, для гэтага студэнту трэба прадаставіць у камісію па размеркаванні ўсе неабходныя дакументы, пасля чаго яго накіруюць на першае месца работы. Такім чынам, ён атрымае ўсе правы маладога спецыяліста.

Аляксандр Радзькоў адзначыў таксама, што ў арганізацыі або ўстановы недзяржаўнай формы ўласнасці студэнты-бюджэтнікі змогуць быць размеркаваны толькі пасля таго, як дзяржаўныя прадпрыемствы-заказчыкі атрымаюць неабходных спецыялістаў.

У 2007 годзе накіраванне па сваім жаданні на першае рабочае месца атрымалі 955 выпускнікоў платных ВНУ рэспублікі.

**БЕЛТА.**

# Норма аб пажыццёвым спадчынным валоданні не выключаецца з новай рэдакцыі зямельнага кодэкса

**Паняцце «пажыццёвае спадчыннае валоданне» не выключаецца з праекта новай рэдакцыі Кодэкса Беларусі аб зямлі. Гэта норма з'яўляецца сацыяльна значнай для грамадзян, заявіў на пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрных пытаннях яе старшыня Міхаіл Русы.**

Нагадаем, што дэпутаты плануюць прыняць праект Кодэкса аб зямлі на маючай адбыцца вясенняй сесіі. Пры падрыхтоўцы дакумента да другога чытання ён быў значна перапрацаваны.

Новая рэдакцыя кодэкса прадугледжвае пераход у асноўным да двух тыпаў правоў на зямлю: уласнасці і арэнды. У той жа час у дакуменце прадугледжана, што ўчасткі на праве пажыццёвага спадчыннага валодання будуць прадастаўляцца грамадзянам Беларусі, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, а таксама ў выпадку пераходу ўчастка ў спадчыну. Для тых, хто атрымаў права пажыццёвага спадчыннага валодання раней, яно будзе захавана.

Міхаіл Русы таксама падкрэсліў, што ў новай рэдакцыі кодэкса «дакладна ўрэгуляваны пытанні па ўступленню ў спадчыну, цяпер гэтыя нормы размыты ў заканадаўстве». У прыватнасці, устаноўлены крайні тэрмін для афармлення дакументаў на зямельны ўчастак пры яго атрыманні ў спадчыну — не пазней за 18 месяцаў з дня адкрыцця спадчыны. Калі грамадзянін не аформіць дакументы за гэты час, то можа запускацца працэдура адабрання зямлі на карысць дзяржавы.

**Наталля ІЛЫЧОВА, БЕЛТА.**

## СУПРАЦОЎНІКІ МІЛІЦЫІ ПАЦЯРПЕЛІ Ў ЧАС НЕСАНКЦЫЯНАВАНАЙ ВУЛІЧНАЙ АКЦЫІ Ў МІНСКУ

**Супрацоўнікі міліцыі пацярпелі ў час несанкцыянаванай вулічнай акцыі, якая прайшла 25 сакавіка ўвечары ў цэнтры Мінска. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Анатоль Куляшоў.**

«Пацярпелі два супрацоўнікі міліцыі. Абодва знаходзяцца ў шпіталі. У аднаго з іх пашкоджана калена», — расказаў Анатоль Куляшоў. Паводле яго інфармацыі, у ходзе спынення несанкцыянаванай акцыі міліцыя затрымала 88 чалавек. 13 непаўналетніх грамадзян былі перададзены бацькам, 2 адпушчаны без складання пратаколаў. У адносінах да астатніх былі складзены пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях — парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў. Сёння яны будуць дастаўлены ў раённыя суды. У час несанкцыянаванай акцыі супрацоўнікі міліцыі забяспечвалі грамадскі парадак і спрабавалі не дапусціць учынення супрацьпраўных дзеянняў з боку ўдзельнікаў акцыі.

## ТРАГІЧНЫ МАНЕЎР

Буйное дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінула дзіця, адбылося на дарозе ў Капыльскім раёне. Рабочы аднаго з прадпрыемстваў Салігорска, які знаходзіўся за рулём аўтамабіля «Фольксваген», выехаў на сустрэчную паласу, па якой рухаўся МАЗ. Сам кіроўца легкавушкі атрымаў цялесныя пашкоджанні і трапіў у бальніцу. А вось яго родныя — сын і ўнук, які нарадзіўся ў 2003 годзе, загінулі на месцы ДТЗ.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**

Полн. наименование

**Открытое акционерное общество «Радиотехника»**

*Адрес: г. Ошмяны, ул. Я. Коласа, 1. Т/ф: 45 546*

Полное Ф.И.О. руководителя: **Барковский Вацлав Степанович**

Полное Ф.И.О. гл. бухгалтера: **Давкша Янина Станиславовна**

Единица измерения: **млн. руб.**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 января 2008 года**

| АКТИВ | Код стр. | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 5316 | 5786 |
| Нематериальные активы | 120 | 1 | |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 3 | 169 |
| В том числе: незавершенное строительство | 141 | 3 | |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| **Итого по разделу I** | 190 | 5320 | 5955 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 1224 | 1186 |
| В том числе: | | | |
| сырье, материалы и другие активы | 211 | 418 | 490 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| незавершенное производство и полуфабрикаты | 213 | 153 | 129 |
| расходы на реализацию | 214 | | |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 646 | 562 |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | 3 | 1 |
| прочие запасы и затраты | 219 | 4 | 4 |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 40 | 3 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 163 | 510 |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 231 | 121 | 197 |
| поставщиков и подрядчиков | 232 | 16 | 286 |
| разных дебиторов | 233 | 26 | 26 |
| прочая дебиторская задолженность | 234 | | 1 |
| Расчеты с учредителями | 240 | | |
| В том числе: | | | |
| По вкладам в уставный фонд | 241 | | |
| Прочие | 242 | | |
| Денежные средства | 250 | 1 | 42 |
| В том числе: | | | |
| Денежные средства на депозитных счетах | 251 | | |
| Финансовые вложения | 260 | 5 | 5 |
| Прочие оборотные активы | 270 | | |
| **Итого по разделу II** | 290 | 1433 | 1746 |
| **БАЛАНС** | 300 | 6753 | 7701 |
| **ПАССИВ** | | | |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 670 | 670 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | 1 | 1 |
| В том числе: | | | |
| резервы, созданные в соответствии с законодательством | 421 | 1 | 1 |
| резервы, созданные в соответствии с учредительными документами | 422 | | |
| Добавочный фонд | 430 | 5047 | 5801 |
| Прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | | |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -165 | -172 |
| Целевое финансирование | 460 | | 266 |
| Доходы будущих периодов | 470 | | |
| **Итого по разделу III** | 490 | 5553 | 6566 |
| **IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | | 90 |
| Краткосрочные кредиты и займы | 520 | 713 | 598 |
| Кредиторская задолженность | 530 | 482 | 443 |
| В том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 531 | 169 | 155 |
| перед покупателями и заказчиками | 532 | 15 | 15 |
| по оплате труда | 533 | 100 | 118 |
| по расчетам с персоналом | 534 | 1 | 1 |
| по налогам и сборам | 535 | 118 | 56 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 536 | 34 | 39 |
| разных кредиторов | 537 | 45 | 59 |
| прочая кредиторская задолженность | 538 | | |
| Задолженность перед учредителями | 540 | 5 | 4 |
| В том числе: | | | |
| по выплате доходов, дивидендов | 541 | 2 | 1 |
| прочая | 542 | 3 | 3 |
| Резервы предстоящих расходов | 550 | | |
| Прочие виды обязательств | 560 | 1 | 1 |
| **Итого по разделу IV** | 590 | 1200 | 1135 |
| **БАЛАНС** | 600 | 6753 | 7701 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 5437 | 4644 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 891 | 763 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020) | 020 | 4546 | 3881 |
| Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 4409 | 3776 |
| Управленческие расходы | 040 | | |
| Расходы на реализацию | 050 | | 16 |
| **Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)** | 060 | 137 | 89 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 070 | 482 | 310 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 071 | 7 | 4 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 080 | 475 | 306 |
| В том числе: | | | |
| От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 081 | | |
| От выбытия основных средств и нематериальных активов | 082 | 17 | |
| Прочие операционные доходы | 083 | 458 | 306 |
| Операционные расходы | 090 | 458 | 305 |
| В том числе: | | | |
| От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 091 | | |
| От выбытия основных средств и нематериальных активов | 092 | 1 | |
| Прочие операционные расходы | 093 | 457 | 305 |
| Прибыль (убыток) от совместной деятельности | 100 | | |
| Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций | 110 | | |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090±100±110)** | 120 | 17 | 1 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 22 | 41 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | | |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 140 | 22 | 41 |
| В том числе: | | | |
| От списания кредиторской задолженности | 141 | 3 | 1 |
| Курсовые и суммовые разницы | 142 | 1 | 1 |
| Безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи) | 143 | | |
| Прочие внереализационные доходы | 144 | 18 | 39 |
| Внереализационные расходы | 150 | 96 | 41 |
| В том числе: | | | |
| От списания дебиторской задолженности | 151 | 2 | |
| Курсовые и суммовые разницы | 152 | 1 | 2 |
| Безвозмездно переданные активы (включая денежные средства) | 153 | 9 | |
| Прочие внереализационные расходы | 154 | 84 | 39 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | 160 | -74 | |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+120+160)** | 200 | 80 | 90 |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 210 | 67 | 64 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 9 | 21 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)** | 240 | 4 | 5 |
| Справочно (из строки 240). Сумма льготы по налогу на прибыль | | | |

| | |
|---|---|
| **Данные отчетности подтверждены** *(наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)* | **ООО «Белросаудит-Плюс» лицензия 2200/0038212 выдана Министерством финансов Республики Беларусь, выдана 13.01.2005 г.** |

| Кол-во акционеров | Всего | 459 | Юридических лиц | 2 | Физических лиц | 457 |
|---|---|---|---|---|---|---|

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| *Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде* | *Миллионов рублей* | 4,027509 | 4,582729 |
| *Дивиденды, приходящиеся на одну акцию включая налоги* | *Рублей* | 24,043 | 27,3576 |
| *Обеспеченность акции имуществом Общества* | *Тысяч рублей* | 37,6 | 33,15 |
| *Количество простых акций, находящихся на балансе Общества* | *Штук* | — | — |
| **Информация о задолженности** | | | |
| *Просроченная дебиторская задолженность* | *Миллионов рублей* | 54 | 44 |
| *Просроченная кредиторская задолженность* | *Миллионов рублей* | 42 | 36 |
| **Среднесписочная численность работающих (человек)** | | 297 | |

| | |
|---|---|
| **Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **Производство электрооборудования для транспортных средств** |

11 марта 2008 года — УНП 500227068

Зварот у карпункт

# ЧАМУ ДАМАФОН ДАРАГІ?

## *Альбо Дайце мне Кнігу заўваг!*

У віцебскі карпункт «Звязды» звярнуўся наш чытач з Новалукомля. Ён прасіў разабрацца ў канфліктнай сітуацыі

**— Вашу газету наша сям'я выпісвае даўно. Я — падпісчык, бацька газету выпісваў. Пытанне ў мяне камунальнае. Чаму так дорага каштуе падключэнне дамафона ў кватэры?**

**Мая цётка, якая жыве ў Калінінградзе, купіла кватэру ў Новалукомлі. Фірма «Кварц-аўта» бярэ у Новалукомлі за падключэнне дамафона болей за 165 тысяч беларускіх рублёў. Для параўнання: у доме дзе я жыву, такое падключэнне каштуе толькі 93 тысячы, — расказвае мужчына. — Наколькі я зразумеў, фірма дзейнічае і ў Віцебску, а ў нашым горадзе іх інтарэсы прадстаўляе толькі адзін спецыяліст — жанчына. Яна так і не растлумачыла мне канкрэтна, чаму можа быць такая розніца ў расцэнках? Я папрасіў Кнігу заўваг і прапаноў, а яна сказала, што Кнігі ў яе няма. Куды звярнуцца па дапамогу?**

Спачатку я звязаўся з прадстаўніком фірмы ў Новалукомлі. Ірына Гаўрылюк мне растлумачыла, што ўсе расцэнкі прыходзяць з Віцебска. Кніга заўваг ёсць у віцебскім філіяле. У Новалукомлі толькі прымаюцца заяўкі, займаюцца афарбоўкай дзвярэй... Што датычыцца, на думку чытача, высокай цаны, у лютым гэтага года было падаражанне. Калі б дамафон быў устаноўлены раней, безумоўна, гэта абышлося б танней.

Начальнік вытворчасці віцебскага філіяла фірмы Неда Корабава растлумачыла, што ўсе расцэнкі прыходзяць з Мінска — з Міністэрства прамысловасці, што з'яўляецца заснавальнікам фірмы: «Мы працуем строга ў рамках законнасці. Самавольна расцэнкі не прыдумваем. Усе грошы, атрыманыя ад жыльцоў, праходзяць праз банк. У канкрэтнай сітуацыі можна адзначыць наступнае. Былы ўладар кватэры не аформіў з намі дагавор, бо проста не пажадаў плаціць за ўстаноўку дамафоннай сувязі».

Дырэктар віцебскага філіяла Вольга Маслюкова дапоўніла адказ калегі: «Калі новыя гаспадары кватэры ў такім выпадку хочуць карыстацца дамафонам, яны павінны аплаціць нашы выдаткі на момант падключэння. Трубка, праводка, работа — усё гэта каштуе грошай. Аналагічных прыкладаў нямала. А бывае, спачатку жыльцы нейкай кватэры адмаўляюцца ад падключэння і проста атрымліваюць ключ ад пад'езда, а потым усё-такі хочуць мець дамафон. І мы ажыццяўляем «даўстаноўку» па існуючых на той момант расцэнках. Дом, дзе пражывае непасрэдна чытач, напэўна, абслугоўвае іншая фірма. Таму адпаведна там і іншыя расцэнкі. На жаль, некаторыя грамадзяне проста не вельмі разумеюць спецыфіку нашай работы. Пра Кнігу заўваг магу сказаць наступнае. Калі чытач пажадае, ён можа прыехаць у Віцебск і мы яму прапануем напісаць адпаведную заўвагу».

Сітуацыю я папрасіў пракаментаваць начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці Мікалая Кляцко. Ён адзначыў, што Кніга заўваг і прапаноў абавязкова павінна быць даступная для спажыўца. І калі ў тым жа Новалукомлі грамадзянін хоча пісьмова паскардзіцца, яму павінны даць такую магчымасць. Без усякага тлумачэння прычын адсутнасці гэтай Кнігі.

І зноў я звязаўся з дырэктарам віцебскага філіяла фірмы. Вось што сказала Вольга Маслюкова: «Кніга скаргаў ёсць у віцебскім філіяле. А ў Новалукомлі працуе тэхнік па абслугоўванні дамафонных сістэм, якая лічыцца на рабоце ў Віцебску. У яе Кнігі скаргаў няма, таму што яна проста прадстаўляе нашу фірму. І нават офіса ў яе няма».

Быццам бы банальная сітуацыя? Хочацца спадзявацца, што спажывец і пастаўшчык паслуг потым самі змогуць зразумець адзін аднаго.

Калі матэрыял рыхтаваўся да друку, кіраўнік філіяла фірмы выказала гатоўнасць звязацца з чытачом і растлумачыць правамернасць дзеянняў супрацоўнікаў

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Кватэрнае пытанне

## Сям'я з дзецьмі ад розных бацькоў — таксама шматдзетная

**Я ўдава. Выхоўваю дзвюх дачушак, пабудавала двухпакаёвую кватэру, для чаго брала крэдыт (на 20 гадоў пад 5 % гадавых). Сустрэла цяпер чалавека. Ён таксама ўдавец, таксама з дваімі непаўналетнімі дзецьмі і састарэлай маці. Таксама будуе жыллё на тых жа ўмовах. Калі мы сыдземся, створым сям'ю, ці будзе яна лічыцца шматдзетнай? Ці зменяцца ўмовы крэдытавання, ці можам мы разлічваць на субсідыю?**

**Т.М.,**
*Магілёўская вобласць.*

Ліст гэты па просьбе рэдакцыі быў разгледжаны ў Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва. Як паведаміў першы намеснік міністра спадар Абрамчук, у адпаведнасці з тлумачэннем Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 15.12.2005 г. № 01-02-08/2537, накіраваным у камітэты па працы і сацыяльнай абароны аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца дзеці ад розных шлюбаў мужа і жонкі (пасынкі і падчарыцы), мае права прэтэндаваць на атрыманне пасведчання шматдзетнай сям'і. Факт усынаўлення (удачарэння) пасынкаў (падчарыц) або адсутнасць гэтага ў дадзеным выпадку значэння не мае.

Такім чынам, у вашай сітуацыі пры рэгістрацыі шлюбу сям'я становіцца шматдзетнай, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзіцца чацвёра непаўналетніх дзяцей. Пры гэтым змяняюцца ўмовы, на якіх вам быў выдзелены крэдыт: яго тэрмін павялічваецца да 40 гадоў, плата за карыстанне крэдытам устанаўліваецца ў памеры 3 працэнтаў гадавых, зыходзячы з сумы запазычанасці на дату падачы дакументаў у ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» (падпункт $1.4^{1}$ пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.04.2000 № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў»).

З улікам указанай сумы запазычанасці і пры наяўнасці не менш як траіх непаўналетніх дзяцей на пагашэнне прадастаўленага вам ільготнага крэдыту павінна быць накіравана фінансавая дапамога дзяржавы (частка другая падпункта $1.13^{1}$ пункта 1 Указа № 185).

Па пытанні льготнага крэдыту ў выпадку ўключэння ў склад маладой сям'і каго-небудзь з бацькоў мужа або жонкі паведамляем, што склад маладой сям'і ўстаноўлены падпунктам 1.11 пункта 1 Указа № 185: да членаў сям'і маладога грамадзяніна (маладой сям'і) адносяцца яго муж або жонка (незалежна ад узросту) і іх дзеці (родныя, усыноўленыя, удачароныя). Пры расшырэнні складу сям'і за кошт уключэння іншых сваякоў статус сям'і мяняецца і грамадзянам выдаецца на іх выбар або льготны крэдыт, або аднаразовая бязвыплатная субсідыя.

Пры аб'яднанні вашых сем'яў і ўтварэнні шматдзетнай сям'і варта ўлічваць, што ў адпаведнасці з падпунктам 1.131 пункта 1 Указа № 185 да членаў шматдзетнай сям'і, як і маладой, адносяцца муж (жонка) і іх дзеці. Акрамя таго, незалежна ад умоў выдзялення льготных крэдытаў, вызначэнне льготна крэдытуемай плошчы жылога памяшкання ажыццяўляецца з улікам агульнай плошчы жылога памяшкання, якое знаходзіцца ва ўласнасці членаў сям'і.

## *Як прызнаць чалавека недзеяздольным?*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Як прызнаць чалавека недзеяздольным з мэтай яго далейшага ўладкавання ў спецінтэрнат? Такім было чарговае пытанне, што паступіла ў рэдакцыю па «гарачай лініі» (з этычных меркаванняў адрас, прозвішчы заяўнікаў, іншыя падрабязнасці мы агучваць не будзем).**

Знайсці адказ на гэта пытанне людзі спрабавалі ў аддзеле сацабароны па месцы жыхарства, аднак, паводле іх слоў, нічога канкрэтнага не пачулі. А праблема перад заяўнікамі стаіць актуальная, паколькі чалавек, пра якога ідзе гаворка, «мае праблемы з галавой». Як самы бяскрыўдны прыклад, можа, не кантралюючы сябе, нагаварыць па тэлефоне на значную суму. Даглядаць гэтага чалавека робіцца ўсё цяжэй: адна з такіх асобаў ужо даўно пенсіянерка («а калі памрэ?»), другая — зусім маладзенькая («а калі возьме шлюб і з'едзе ў іншы горад?»).

Паводле слоў галоўнага псіхіятра Міністэрства аховы здароўя Паўла Рынкова, найперш трэба ведаць, ці сапраўды, як сказалі самі заяўнікі, памянёны чалавек «мае праблемы з галавой». Калі не, прызнаваць яго недзеяздольным не трэба, такая асоба можа быць уладкавана ў дом-інтэрнат агульнага тыпу (трэба дадаць, што размова ідзе яшчэ і пра інваліда II групы) — па ўласнай заяве такога чалавека.

У процілеглым выпадку сітуацыя іншая. Калі ў чалавека ёсць праблемы з псіхічным здароўем, ён павінен стаяць на адпаведным уліку. Калі родныя маюць намер уладкаваць яго ў спецінтэрнат, яны павінны напісаць адпаведную заяву ў суд (зрабіць гэта можа любы паўналетні член сям'і). Апошні павінен прызначыць судова-псіхіятрычную экспертызу (сама экспертыза праводзіцца на працягу 20 дзён), пасля чаго, на падставе атрыманага заключэння, выносіцца адпаведнае рашэнне. Ужо з гэтым рашэннем — калі чалавека пазбавілі дзеяздольнасці, — родныя звяртаюцца з заявай у аддзел сацабароны па месцы жыхарства, каб недзеяздольную асобу паставілі ў чаргу на атрыманне месца ў інтэрнаце. У залежнасці ад яго тыпу і рэгіёна чарга на прадастаўленне месца можа быць рознай. У нашым канкрэтным выпадку заяўнікам лепш звярнуцца па больш падрабязную інфармацыю да галоўнага штатнага псіхіятра ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама.

## *Замест адраснай можа быць аказана аднаразовая дапамога*

**Так атрымалася, што пасля таго, як адну з дачок пазбавілі бацькоўскіх правоў, выхоўваць траіх яе дзетак, уласных унукаў, давялося састарэлай ужо бабулі, жыхарцы Бераставіцкага раёна. Сталы ўжо хлопец з'ехаў у сталіцу, аднак фактычна на руках у жанчыны засталіся яшчэ дзве ўнучкі — навучэнка вучылішча і больш старэйшая дзяўчына, хворая на цэрабральны параліч. Апошняя як інвалід атрымлівае пенсію ў 107 тысяч рублёў. Пенсія ў самой бабулі, здаецца, нядрэнная, але ж дзве дзяўчыны... Словам, паспрабавала яна звярнуцца па месцы жыхарства па атрыманне адраснай дапамогі, аднак ёй адмовілі. Чаму?**

Гэтае пытанне па «гарачай лініі» задала ўжо другая дачка жанчыны, якая пражывае ў Слуцкім раёне (усе адрасы і прозвішчы ў рэдакцыі ёсць). «З-за вялікай адлегласці мы не можам часта наведваць і дапамагаць маці і пляменніцам. Таму хацелася б з вашай дапамогай больш падрабязна разабрацца: чаму нашым родным не можа быць аказана адрасная дапамога?»

Паводле слоў вядучага спецыяліста аддзела пенсій і дапамог упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Бераставіцкага райвыканкама Яўгеніі Курловіч, пры разглядзе пытання аб аказанні адраснай дапамогі прымаюцца да ўвагі ўсе даходы членаў сям'і, бярэцца сукупны даход. І калі ён на аднаго чалавека не перавышае 200 080 рублёў на дадзены момант — бюджэт пражытковага мінімуму — можа быць выплачана розніца паміж вышэйназванай сумай і сумай, якая рэальна прыпадае на кожнага члена сям'і. У нашых заяўнікаў даход на аднаго чалавека перавышае 230 тысяч рублёў, паколькі ў сукупны даход уваходзяць пенсіі бабулі і дзядулі, пенсія па інваліднасці адной унучкі (115 300 рублёў на цяперашні час) і кошт харчавання другой унучкі — навучэнкі вучылішча. Таму, у адпаведнасці з вышэйвыкладзеным, адрасная дапамога заяўніцы і не магла быць аказана.

Праўда, як дадала напрыканцы Яўгенія Іванаўна, можа быць разгледжана пытанне аб аказанні дзяўчыне-інваліду па яе заяве аднаразовай дапамогі, якая прызначаецца раз у год. Паколькі яе пенсія па інваліднасці складае цяпер 115 300 рублёў, ёй можа быць аказана дапамога ў памеры каля трох базавых велічынь — да сумы мінімальнага пражытковага мінімуму. Суразмоўца паабяцала давесці гэтую інфармацыю да зацікаўленых заяўнікаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## *У кожным доме свая!*



**Паштальён вёскі Гарадная Столінскага раёна Святлана ПЯШКО аддае перыёдыку вясковаму падпісчыку Аўрааму БАСАЎЦУ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Або вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды»

# АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!

## Усмешка негра

Згадзіцеся: пірог з такою назваю нельга пячы ў дрэнным настроі! У мяне ж тады — ён проста цудоўны...

Як вядома, галоўная работа студэнтаў — гэта вучоба, але ж есці таксама трэба? Гатаваць самім — значыць, купляць прадукты, стаяць ля пліты, траціць час... Іншая справа — сталоўка!

У той раз чарга там цягнулася аж да дзвярэй, але мая сяброўка Каця ўбачыла знаёмых бліжэй да раздачы, падышла да іх, стала побач: прынцып «Займі чаргу знаёмаму, некалі ён зойме табе» ніхто ж не адмяняў?.. У выніку дзяўчына хутка апынулася ля касы, хутка разлічылася, паставіла абед на свабодны столік, праз усю залу панесла назад паднос.

Якое ж было здзіўленне, калі, вяртаючыся, убачыла — за яе столікам сядзіць... негр і... есць яе боршч.

У тыя часы цемнаскурых і, як кажуць, жыўцом, у нас не бачыў ніхто (у Брэсце іх проста не было), але ж па тэлевізары — паказвалі, гаварылі, як цяжка яны жывуць, як галадаюць. Каця магла б паспагадаць... Каб самой ёй есці не хацелася. А так...

Падышла, села побач, падцягнула пад сябе талерку з бульбай-катлецінай, стала есці. Пры гэтым левай, свабоднай рукой (каб негр не забраў) яна трымала шклянку з кампотам.

Сусед, між тым, даеў першае, паблажліва паглядзеў на суседку, усміхнуўся ёй і, паклаўшы ля шклянкі тры рублі, пайшоў да выхаду. «О-о, не слаба ён за боршч разлічыўся! Загаварыла-такі сумленне», — узрадавалася дзяўчына.

Лічы, у той жа момант побач з'явілася сяброўка. Сказала:

— Каця, што ты ясі? Мы твой абед за свой стол перанеслі.

...Карацей, усмешку негра мы ўспамінаем дагэтуль.

**Галіна Сідараўна БАБАРЫКА,**
*в. Мачуль, Столінскі раён.*

## Жаночая логіка

Як казаў адзін сатырык, у жанчын адно ў галаве, што ў мужчын адно ў галаве *(калі сэнс слоў «з лёту» не дайшоў, фразу можна прачытаць яшчэ раз. —* **В.Д.**). Сведчаннем таму выпадак, які адбыўся з маёй знаёмай. Яна тады, лічы, «у ягадках» была. Працавала лабаранткай на ферме, вазіла на малочны завод розныя аналізы.

Выправілася вось у чарговы раз, на дарозе прагаласавала. Пытае ў кіроўцы:

— Давязеш да малочнага?..

Той кажа:

— Садзіся.

Села. Едуць... Моўчкі. А на пад'ездзе да горада — гаёк бярозавы ёсць, невялічкі, прыгожы. І праз яго — дарога да «Сельгасхіміі». Пад'ехалі яны, — вадзіцель рэзка ўлева, на тую дарогу. Спадарожніца ў крык:

— Ты куды мяне вязеш, га?! Ты за каго мяне прымаеш? Я табе што?!..

Ну і гэтак далей.

Вадзіцель, знячэўку, ледзь руль не выпусціў. Кажа:

— На малочны вязу... У «Сельгасхімію» на хвілінку — накладныя пакінуць.

Спадарожніца тады сціхла, сагнулася і... вельмі пакрыўдзілася.

Не, не ў сэнсе таго, што яна хацела, каб яе ў іншае месца завезлі... Але ж тое, што гэтага ў мужчыны, нават і ў думках не было, — чамусьці абразіла.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## Сведка не прабалбочыцца?

Гады са два таму, зімой, я сабраўся на лецішча, што пад Мінскам. «Ці не здурнеўшы? — спытала жонка, — паглядзі, як мяце, адумайся!»

У іншы раз я, відаць, і паслухаў бы яе, але ж тады паабяцаў з сябруком сустрэцца...

Карацей, паехаў, потым — пайшоў з электрычкі. Вецер, літаральна, валіў мяне з ног, мяцеліца — выла і плакала. Але ж святло на дачы, дзякаваць Богу, было. Я ўключыў электрарадыятар, схадзіў па ваду, згатаваў вячэру. Сябра — усё не ехаў. Трывога разоў колькі выганяла мяне на двор: добра ж, як той перадумаў, а як заблудзіўся?.. Я нават гукаў там.

Потым, страціўшы надзею, сеў вячэраць адзін. Пасля кілішка гарэлкі, надзіва смачнай падалася кіслая капустка з алеем і цыбуляю, смажаная свініна, салата, каўбаса. Перад вачыма паплылі ўспаміны: я — малы, сяджу ў цёплай бацькавай хаце, пазіраю ў акно...

У акне ў гэты час з'явілася... морда. Аж мароз па скуры — воўк!..

Прыгледзеўся — не, сабака. Суседаў... Летам яны часта заходзілі і Атланта я частаваў. Ён, відаць, гэта помніў, таму цяпер — прасіўся ў хату. Я адчыніў яму, паклаў колькі бульбін, два кавалачкі мяса... Думаў, што і сусед зараз з'явіцца. Але таго не было...

— Сабака не ў цябе? — пастукаў ён у дзверы раніцай.

— А што, прапаў? — «занепакоіўся» я.

— Ну... Мы з ім позна прыехалі. Я — да знаёмай зайшоў, сабаку на вуліцы кінуў... Няўжо ён гэтак пакрыўдзіўся і ў Мінск падаўся?

— А ты, можна падумаць, такое дараваў бы?.. Кінуць... На марозе, памяняць яго, сябра, брата меншага, на нейкую жанчыну...

— Усё, кранты, я прапаў, — нерваваўся далей сусед. — Калі ён прыйдзе дамоў без мяне, жонка, Таня мая, пра ўсё здагадаецца.

Сабака, пачуўшы любае імя, прыветна гаўкнуў.

— Атлант! Атланцік! — кінуўся да яго гаспадар, але той толькі ашчэрыўся — як на чужога...

— Бач, прынцыповы... Не падпускае... Не даруе мне. Не паедзе са мной дамоў... Усё, развод! — ледзь не плакаў сусед.

Сабака ўвесь час сядзеў ля мяне...

Чаго не зробіш для захавання сям'і: у Мінск, пасля снедання, я паехаў з імі — «давёз» да самага дома. Атлант там кінуўся ў свой пад'езд. Гаспадар яго, ўдзячна пацiснуўшы мне руку, падаўся следам.

**Мікола ДУБОЎСКІ,**
*г. Мінск.*

## Развітанне з сябрамі

У 1946 годзе ў Магілёве адкрылася культасветвучылішча імя Крупскай. Адкрылася на вуліцы Камсамольскай, дом № 20. У гэтым будынку, казалі, некалі была гасцёўня і ў ёй па дарозе ў Малдавію спыняўся сам Пушкін. Але ж гэта — раней. Калі мы паступалі, будынак быў досыць занядбаны, рамантавалі яго палонныя немцы. Рамы з вокнаў яны падаставалі і пасастаўлялі ў класах узбоч сцяны, самі сцены якраз бяліліся.

З мэблі ў нас былі толькі доўгія сталы на козлах і такія ж лаўкі на пяць чалавек. Падручнікаў мы не мелі, пісалі на абгортачнай паперы. Нас было мала, але мы па-сапраўднаму сябравалі.

На іспытах, напрыклад, за першым сталом садзіліся экзаменатары, за другім — тыя, хто рыхтаваўся адказваць, за трэцім — «падавальшчыкі» за шпаргалак, ну а потым ужо астатнія. «Канвеер» працаваў бездакорна, пакуль аднойчы на іспыт не прыйшоў дырэктар вучылішча. Сеў ён чамусьці з боку стала і стаў глядзець на рамы. Туды ж, следам, скіравала позіркі і галёрка. Відовішча было — ну чыстае кіно! Вось Фёдар (адзін з адказных за шпаргалкі...), пачуўшы нумар білета, падбірае патрэбную паперку (а ў шыбе ж усё адбіваецца!) вось складвае яе, засоўвае паміж пальцамі на босай назе, штурхае ёю ў тое месца, на якім наперадзе сядзіць сябрук. Той нахіляецца, бярэ шпаргалку...

Пасля вайны мы былі самымі першымі студэнтамі. Нас тады вельмі шкадавалі, заплюшчвалі вочы на многае. У тым ліку і на шпаргалкі.

«Адкрывалі», аднак, таксама. Адна з маіх сябровак неяк позна сядзела над канспектамі, потым — памыла штосьці з бялізны, пайшла на балкон павесіць. А ноч на дварэ — цёплая-цёплая, ясная-ясная. Дзяўчына пастаяла, палічыла зоркі, падзівілася на месячык. Але ж час і справу зрабіць. А для гэтага — трэба да парэнчы прывязаць вяроўку. Толькі пачала, — немы крык знізу:

— Дзяўчо! Ты што?!. Пачакай, не вешайся!

Крычаў гэта малады міліцыянер. Яны потым доўга сябравалі.

Быў сябрук і ў мяне. Прычым вельмі цікавы. Ля майго ложка, у вугельчыку пацукі прагрызлі досыць ладную дзірку, — прыходзілі ў госці. Як свае... Ды і я, як ні галадна было, але што-кольвечы з ежы ў дзірку засоўвала: цікава было адчуваць, як пацук грызе — з рукі...

Дык вось. Прыйшла я аднойчы з экзамену, прылягла на ложак і, пасля дзвюх бяссонных начэй, у той жа момант заснула...

Праз нейкую гадзінку прачынаюся, — у мяне на грудзях... пацучок ляжыць. Харошанькі такі — вочкі заплюшчаны, хвосцік адкінуты... Спіць.

Цяпер я, вядома ж, нарабіла б ляманту, ці нават самлела, а тады — лагодненька пагладзіла. Аднак сябрук, з спрасонку, пяшчоты маёй не прыняў — шмыгнуў у норку.

Назаўтра мы рассталіся назаўсёды: вучоба была скончана, і я вярнулася дамоў.

**М.К. ЛЮБАСКІНА,** *г. Бабруйск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
***Ад яе ж заўсёднае — пішыце!***


Заславский городской исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Заславле:

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Кадастровый номер | Начальная цена | Наличие инженерных сетей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минский район, г. Заславль, ул. Минская, д. 35 А | 0,0834 га | 623650100001003377 | 22 000 000 руб. | электроснабжение, водопровод, газопровод |
| 2 | Минский район, г. Заславль, ул. Загородная, д. 6 | 0,0874 га | 623650100001003376 | 17000 000 руб. | электроснабжение, водопровод; (газоснабжение возможно при условии проектирования) |
| 3 | Минский район, г. Заславль, ул. Молодечненская, д. 21 | 0,1100га | 623650100001003375 | 19000 000 руб. | электроснабжение; (водоснабжение и газоснабжение возможно при условии проектирования) |
| 4 | Минский район, г. Заславль, ул. Молодечненская, д. 19 | 0,1036 га | 623650100001003372 | 18000 000 руб. | электроснабжение; (водоснабжение и газоснабжение возможно при условии проектирования) |
| 5 | Минский район, г. Заславль, ул. Молодечненская, д. 17 | 0,1098 га | 623650100001003373 | 19000 000 руб. | электроснабжение; (водоснабжение и газоснабжение возможно при условии проектирования) |
| 6 | Минский район, г. Заславль, ул. Зеленая, д. 16 | 0,0871 га | 623650100001003371 | 20000 000 руб. | электроснабжение, водопровод; (газоснабжение возможно при условии проектирования) |
| 7 | Минский район, г. Заславль, пер. Загородный, д. 3 | 0,0938 га | 623650100001003370 | 14000 000 руб. | электроснабжение, водопровод, канализация; (газоснабжение возможно при условии проектирования) |
| 8 | Минский район, г. Заславль, ул. Механизаторов | 0,0704 га | 623650100001003369 | 14000 000 руб. | электроснабжение, водопровод; (газоснабжение возможно при условии проектирования) |

*Залог в размере 5 % от начальной цены земельного участка и специальный сбор за участие в аукционе в размере 4 базовых величин перечисляются на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за земельный участок должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 29.04.2008 г. в 15.30 по адресу: г. Заславль, ул. Великая, 1, актовый зал Заславского горисполкома. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.*

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ЗВЯЗДА 27 сакавіка 2008 г.

# ТВАЕ ПРАВЫ

Інфармацыя. Парады. Дапамога.

№ 5 (9)

**Кватэрнае пытанне**

## Рамонт — яшчэ не рэканструкцыя

**Мае бацькі жывуць у адным з райцэнтраў, у яшчэ дзядулевай хаце. Ці можна ўзяць ільготны крэдыт (на якіх умовах?), каб зрабіць капітальны рамонт, рэканструкцыю?**

**А. САФОНАВА**, *г. Віцебск.*

Так, такія крэдыты выдаюцца ў адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы ад 7 лютага 2006 года № 75 ашчадным банкам «Беларусбанк» (у памеры да 90 працэнтаў кошту затрат на рэканструкцыю, на тэрмін да 10 гадоў, пад 3 працэнты гадавых) дзеяздольным грамадзянам, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. чалавек, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае двухразовага сярэднямесячнага сярэднядушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з 4 чалавек, налічанага за 12 месяцаў, што папярэднічалі месяцу падачы дакументаў для ўключэння гэтых грамадзян у спісы на атрыманне льготных крэдытаў (даведка: пастановай Мінпрацы і сацабароны ад 18.01.2008 № 16 МПБ зацверджаны ў памеры 311 050 руб. На перыяд з 1 лютага па 30 красавіка 2008 г.).

Пад рэканструкцыяй маецца на ўвазе не проста рамонт і нават не капітальны рамонт існуючага жылога дома, пры якім устараняюцца дэфекты зношаных канструктыўных элементаў. Рэканструкцыя — гэта комплекс работ, звязаных са змяненнем асноўных тэхніка-эканамічных паказчыкаў (колькасці і плошчы кватэр, умоў пражывання). У выніку рэканструкцыі павінна быць зроблена абнаўленне пабудовы з павелічэннем, напрыклад, памеру плошчы жылых памяшканняў.

Для заключэння крэдытнага дагавора грамадзянін абавязаны падаць ва ўстанову ААТ «ААБ Беларусбанк», нароўні з іншымі дакументамі, дакумент, які пацвярджае права ўласнасці на дом, дазвол мясцовай адміністрацыі на будаўніцтва прыбудовы, надбудовы да дома і даведку за подпісам галоўнага архітэктара раёна, якая ўтрымлівае наступныя звесткі аб індывідуальным жылым доме, што рэканструюецца: памер агульнай і жылой плошчы, каштарысны кошт рэканструкцыі ў базісных цэнах 1991 г. і ў бягучых цэнах, пры пачатай рэканструкцыі — рэшткавы рахункавы кошт рэканструкцыі ў базісных цэнах 1991 г. і ў бягучых цэнах.

## На субсідыю разлічваць можна

**Я стаю на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў толькі па месцы працы. Але наша прадпрыемства ў апошнія гады нічога не будуе. Ці магу я атрымаць субсідыю на будаўніцтва кватэры ў выканкаме па месцы жыхарства?**

**А. ДОРАХАЎ.**

У адпаведнасці з пунктам 5 Палажэння аб прадастаўленні грамадзянам Рэспублікі Беларусь аднаразовых бязвыплатных субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.04.2002 г. № 555) грамадзяне, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў толькі па месцы працы, маюць права падаць заяву на атрыманне субсідыі ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, на тэрыторыі якога знаходзіцца арганізацыя, што паставіла іх на ўлік, пры адсутнасці магчымасці прадаставіць субсідыю па месцы працы (за выключэннем грамадзян, якія прыняты на ўлік па льготных падставах згодна з калектыўным дагаворам).

Субсідыі прадастаўляюцца ўказаным грамадзянам у парадку, прадугледжаным для тых, хто знаходзіцца на ўліку ў мясцовым выканаўчым і распарадчым органе, зыходзячы з часу прыняцця іх на ўлік як маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у арганізацыі.

Для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства і па месцы працы, чарговасць атрымання субсідыі, а таксама яе памер вызначаюцца па больш ранняй даце пастаноўкі на ўлік.

**Віктар САВІЦКІ.**

# ПАРАДАК ТАМ, ДЗЕ ГРОШЫ

## Большасць працоўных ахвяраў маюць узрост ад 40 да 50 гадоў

ЗВЯЗДА · Беларускае радыё

**Статыстыка сведчыць, што па колькасці няшчасных выпадкаў на кожныя сто тысяч насельніцтва Беларусь мае самы нізкі паказчык сярод усіх краін СНД, прычым узровень вытворчага траўматызму працягвае зніжацца. І ў той жа час нельга не заўважыць: пакуль тут мы ўсё яшчэ прыкметна саступаем Заходняй Еўропе, літаральна штогод падчас непасрэднага выканання сваіх працоўных абавязкаў у нашай краіне гінуць ці становяцца інвалідамі сотні чалавек.**

**Галоўныя прычыны вытворчага траўматызму, якія прафесіі і галіны з'яўляюцца найбольш «рызыкоўнымі», чым пагражаюць парушэнні заканадаўства кіраўніку і непасрэдна работніку? Усе гэтыя пытанні сталі тэмай чарговай «прамой лініі» Беларускага радыё і газеты «Звязда» з удзелам дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Анатоля САДАЎНІЧАГА і намесніка начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння дэпартамента Вадзіма БРАТАША.**

### 15 заўваг на праверку

Калі складаць своеасаблівы «рэйтынг» найбольш небяспечных прафесій, то ў ім апынуцца вадзіцелі аўтамабіля, трактарысты-машыністы, цесляры, падсобныя рабочыя, слесары-рамонтнікі, вартаўнікі, станочнікі дрэваапрацоўчых станкоў, бетоншчыкі і муляры. А што да асобных галін, то тут «лідары» два — будаўніцтва і сельская гаспадарка.

Тым часам, у Беларусі ўжо пачалася пасяўная. Якая верагоднасць таго, што яна абыдзецца без ахвяраў?

— На працягу апошніх гадоў колькасць няшчасных выпадкаў падчас пасяўной стабільна змяншаецца, — адзначае Анатоль Садаўнічы. — І не ў апошнюю чаргу гэта тлумачыцца стварэннем спецыяльных мабільных груп, задача якіх — выехаць у сельгаспрадпрыемствы, праверыць спраўнасць тэхнікі, наяўнасць на ёй блакіровак і агароджванняў, высветліць, наколькі работнікі ведаюць тэхніку ўласнай бяспекі, падказаць наймальнікам «слабыя месцы». Работа мабільных груп працягнецца і сёлета, і, больш за тое, у красавіку запланаваны месячнік кантролю за бяспечнымі ўмовамі ў АПК. Прычым, апроч дзяржінспекцыі працы, удзел у месячніку прымуць Мінсельгасхарч, прафсаюзы, санітарны нагляд і дзяржаўтаінспекцыя.

Між тым, працягвае Анатоль Садаўнічы, вынікі пасяўной будуць шмат у чым залежаць ад кіраўнікоў і спецыялістаў сельгаспрадпрыемстваў. Парушэнняў з іх боку па-ранейшаму шмат, і ў тым ліку парушэнняў падчас прыцягнення да работ непаўналетніх.

— Практыка ўдзелу ў сельгасработах школьнікаў сталася традыцыйнай, аднак не менш звычайнымі аказваюцца і звязаныя з гэтым праблемы, — кажа Анатоль Садаўнічы. — Так, варта падкрэсліць: прыцягваць да работ вучняў нельга без працоўнага ці грамадзянска-прававога дагавора, непаўналетнім трэба вызначыць няпоўны працоўны дзень, ім забаронена начная работа, работа з павышанай небяспекай, нарэшце, ім нельга працаваць на складанай тэхніцы. Аднак на вялікі жаль, усе ўмовы вытрымліваюцца далёка не заўсёды, і мы па-ранейшаму можам бачыць вучняў на трактарах ці камбайнах.

Падчас праверак дэпартамента ў мінулым годзе ў адной арганізацыі сельскай гаспадаркі ў сярэднім было выяўлена... па 15 самых розных парушэнняў. «Канкураваць» па гэтым сумным паказчыку з сельгасвытворцамі могуць толькі арганізацыі канцэрна «Беллеспапераапрам» (16), арганізацыі Белкаапсаюза і арганізацыі камунальнай уласнасці (па 14 парушэнняў на праверку).

### Мараторый... на кар'ерны рост

Невыкананне кіраўнікамі і спецыялістамі сваіх абавязкаў па ахове працы, недастатковы інструктаж работнікаў, выкарыстанне няспраўнай тэхнікі, нездавальняючая арганізацыя працоўных месцаў — вось асноўныя прычыны вытворчага траўматызму. Нездарма, адзначаюць у дэпартаменце, па выніках праверак летась 8963 службовыя асобы былі аштрафаваныя на агульную суму больш за 1,5 млрд рублёў. А яшчэ на 115 чалавек (у асноўным тых жа кіраўнікоў і спецыялістаў) нават завялі крымінальныя справы.

— Ахова працы — гэта перш-наперш сродкі, а лішніх грошай, як вядома, не бывае, — зазначае Анатоль Садаўнічы. — Тым не менш эканоміць тут нельга, кожны рубель, укладзены ў бяспеку, вяртаецца ўтрая. Трэба толькі нагадаць, што арганізацыі, якія не шкадуюць на забеспячэнне вартых умоў сваім работнікам, выйграюць на «бальнічных» і на адлічэннях на страхаванне ад няшчасных выпадкаў і прафзахворванняў. А непасрэдна кіраўнікі выйграюць на штрафах і... сваім іміджы. Ёсць нават адназначнае патрабаванне: пры вылучэнні кіраўніка ці службовай асобы на больш высокую пасаду абавязкова павінна брацца пад увагу адсутнасць «надзвычайных здарэнняў» па месцы папярэдняй работы.

### Найбольш небяспечны ўзрост

Зрэшты, «спісваць» усе праблемы выключна на кіраўнікоў таксама нельга. Аналіз дэпартамента паказаў: прычынай 38 працэнтаў інцыдэнтаў з'яўляецца віна непасрэдна работнікаў — асабістая неасцярожнасць, грэбаванне інструкцыямі па тэхніцы бяспекі, невыкарыстанне сродкаў індывідуальнай абароны, а таксама... ужыванне «моцных» напояў.

— Прычым у дадзеным выпадку назіраецца даволі парадаксальны малюнак, — канстатуе Анатоль Садаўнічы. — Насуперак распаўсюджанай думцы, часцей за ўсё парушаюць дысцыпліну зусім не маладыя работнікі, а людзі са стажам, якія, напэўна, лічаць, што ім «ужо можна ўсё». Але менавіта такая самаўпэўненасць дае такі вынік: большасць людзей, што пацярпелі на вытворчасці, маюць узрост ад 40 да 50 гадоў.

### Прамаўчаць — атрымаць завядзёнку

Даўно заўважана, што пытанняў з дысцыплінай не ўзнікае перш-наперш там, дзе маюць добрую зарплату і да таго ж атрымліваюць яе ў тэрмін. Сапраўды, праблема неплацяжоў ужо нібыта адышла ў мінулае. Але не зусім, прынамсі, падчас праверак летась несвоечасовыя разлікі з работнікамі былі «знойдзены» ў 34 арганізацыях краіны.

Нялішне заўважыць, што ў выпадку высвятлення «збояў» кіраўніка дзяржаўнай арганізацыі могуць не толькі аштрафаваць, але і пазбавіць пасады. А ў дачыненні да арганізацыі недзяржаўнай можа быць нават прынятае рашэнне... аб ліквідацыі. Таму, як правіла, нармальныя тэрміны выплаты заробкаў аднаўляюцца адразу пасля звароту работнікаў «праблемных» суб'ектаў гаспадарання да дзяржінспектараў працы або ў суд. Аднак ці варта звяртацца сюды з улікам... магчымых «наступстваў» у далейшым?

— Баяцца тут не варта, бо пры любой раскладцы чалавек патрабуе не чужыя, а менавіта свае грошы, — падкрэслівае Вадзім Браташ. — Пры гэтым рашэнне проста «прамаўчаць» часта мае свае сумныя наступствы — практыка затрымак зарплаты становіцца... пастаяннай.

**Сяргей ГРЫБ.**

**Открытое акционерное общество «Каскад 93»**

**Отчет о прибылях и убытках за 2007 год ОАО «Каскад 93» г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | миллионов рублей | 16009 | 10244 |
| Себестоимость реал. товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | миллионов рублей | 13727 | 8757 |
| Прибыль (убыток) за отчетный период, всего | миллионов рублей | 2275 | 1663 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции (работ, услуг) | миллионов рублей | 2282 | 1487 |
| в том числе: прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | миллионов рублей | 81 | 207 |
| в том числе: прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | миллионов рублей | -88 | -31 |
| Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | миллионов рублей | 578 | 533 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | миллионов рублей | 1697 | 1130 |

**УНП 100016908**

# ЗАО «Трастбанк»

*г. Минск, ул. Игнатенко, 11*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2008

***(в миллионах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | **2 751,6** | **2 233,6** |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | **4 213,7** | **12 369,5** |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | **7 497,4** | **6 642,9** |
| | для торговли | — | 3 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | — | 3.1 | — | — |
| | в наличии для продажи | — | 3.2 | **7 497,4** | **6 642,9** |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | **18 787,4** | **21 872,6** |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | **53 075,6** | **71 033,9** |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | **98,0** | **59,4** |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | **24 277,4** | **21 992,3** |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | **4 759,0** | **6 711,1** |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | **115 460,1** | **142 915,3** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национально банка | 1202 | 9 | — | — |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | **32 505,2** | **35 201,7** |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | **38 270,4** | **61 111,6** |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | — | — |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | **4 572,1** | **9 265,3** |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | **75 347,7** | **105 578,6** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | **14 501,0** | **14 501,0** |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | **2 754,2** | **2 353,4** |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | **2 876,2** | **2 541,9** |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | **19 981,0** | **17 940,4** |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | **40 112,4** | **37 336,7** |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | **115 460,1** | **142 915,3** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | **70 002,9** | **48 652,1** |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | **38 216,5** | **33 422,4** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2007 год

***(в миллионах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 13 141,3 | 10 260,1 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 8 930,3 | 5 960,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 4 211,0 | 4 299,9 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 9 197,6 | 7 002,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 709,9 | 348,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 8 487,7 | 6 654,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 1 194,9 | 927,3 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | (-0,4) | (-18,7) |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 6,6 | — |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 1 672,7 | 2 038,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 2 468,7 | 2 734,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 12 577,0 | 10 822,3 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 999,2 | 885,5 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 384,5 | 356,9 |
| 15 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | | | **735,1** | **493,6** |
| 16 | Базовая прибыль на простую акцию | | | 0,60 | 0,40 |
| 17 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | — | — |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2007 год

***(в миллионах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статей капитала / Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонд переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* |
| 1 | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 2 | Остаток на 1 января 20 _06_ г. | 3011 | 14501,0 | — | 2403,3 | 2142,2 | 14196,4 | 33242,9 |
| 3 | Изменения статей капитала | 3012 | — | — | (-49,9) | 399,7 | 3744 | 4093,8 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 3.1 | прибыль (убыток со знаком «минус») | 30121 | x | x | x | 493,6 | x | 493,6 |
| 3.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | — | x | — | — | x | — |
| 3.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | — | — | x | — | x | — |
| 3.3.1 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | — | — | x | x | x | — |
| 3.3.2 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | — |
| 3.3.3 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | — | x | x | x | x | — |
| 3.4 | проведение переоценки статей баланса | 30124 | x | x | x | x | 3600,2 | 3600,2 |
| 3.5 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | — | — | — | — | — | — |
| 3.6 | прочие изменения | 30126 | — | — | (-49,9) | (-93,9) | 143,8 | — |
| 4 | Остаток на 1 января 20 _07_ г. | 3013 | 14501,0 | — | 2353,4 | 2541,9 | 17940,4 | 37336,7 |
| 5 | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 6 | Остаток на 1 января 20 _07_ г. | 3011 | 14501 | — | 2353,4 | 2541,9 | 17940,4 | 37336,7 |
| 7 | Изменения статей капитала | 3012 | — | — | 400,8 | 334,3 | 2040,6 | 2775,7 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 7.1 | прибыль (убыток со знаком «минус») | 30121 | x | x | x | 735,1 | x | 735,1 |
| 7.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | — | x | 400,8 | (-400,8) | x | — |
| 7.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | — | — | x | — | x | — |
| 7.3.1 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | — | — | x | x | x | — |
| 7.3.2 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | — | x | — |
| 7.3.3 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | — | x | x | x | x | — |
| 7.4 | проведение переоценки статей баланса | 30124 | x | x | x | x | 2040,6 | 2040,6 |
| 7.5 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | — | — | — | — | — | — |
| 7.6 | прочие изменения | 30126 | — | — | — | — | — | — |
| 8 | Остаток на 1 января 20 _08_ г. | 3013 | 14501,0 | — | 2754,2 | 2876,2 | 19981 | 40112,4 |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2007 год

***(в миллионах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 | 2006 |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 7010 | | 13 141,3 | 10 260,3 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 7011 | | -9 000,6 | -6 138,0 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 7012 | | 9 197,3 | 7 003,4 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 7013 | | -745,1 | -486,9 |
| 6 | Чистый доходы по операциям с иностранной валютой | 7014 | | 1 194,9 | 1 254,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 7015 | | -0,4 | -18,7 |
| 8 | Доход в форме дивидендов | 7016 | | 6,6 | - |
| 9 | Прочие полученные доходы | 7017 | | 867,8 | 2 730,5 |
| 10 | Прочие уплаченные расходы | 7018 | | -11 471,1 | -10 705,7 |
| 11 | Уплаченный налог на прибыль | 7019 | | -320,3 | -426,1 |
| 12 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах | 701 | | 2 870,4 | 3 473,2 |
| 13 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 7020 | | -3 470,9 | 1 604,3 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах | 7021 | | 906,0 | 1 002,8 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) кредитов и других денежных средств в банках | 7022 | | -3 614,9 | 10 512,5 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) кредитов, выданных клиентам | 7023 | | -18 081,9 | 5 341,4 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 7025 | | -17 420,4 | 6 895,4 |
| 18 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | -41 682,1 | 25 356,4 |
| 19 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 7030 | | — | — |
| 20 | Чистый прирост (снижение) кредитов и других средств банков | 7032 | | -3 950,6 | 5 099,4 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 7033 | | -23 105,2 | 16 114,3 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 7034 | | — | -430,5 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 7035 | | -20 895,1 | 8 447,4 |
| 24 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | -47 950,9 | 29 230,6 |
| 25 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | -3 398,4 | 7 347,4 |
| 26 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | | |
| 27 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 7110 | | -2 201,4 | -3 439,1 |
| 28 | Реализация основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 7111 | | 1 564,0 | 2 957,0 |
| 29 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений | 7112 | | -38,6 | — |
| 30 | Реализация долгосрочных финансовых вложений | 7113 | | — | — |
| 31 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7114 | | — | — |
| 32 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7115 | | — | — |
| 33 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | -676,0 | -482,1 |
| 34 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | | | |
| 35 | Эмиссия акций | 7211 | | — | — |
| 36 | Выкуп собственных акций | 7212 | | — | — |
| 37 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 7213 | | — | — |
| 38 | Выплата дивидендов | 7214 | | — | — |
| 39 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | — | — |
| 40 | Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 207,4 | 73,4 |
| 41 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | -3 867,0 | 6 938,7 |
| 42 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 1 | 11 363,1 | 4 424,4 |
| 43 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 1 | 7 496,1 | 11 363,1 |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк»** **А.Д. Осмоловский**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Бродик**

**Достоверность баланса подтверждена. Директор АООО «Аудитэл»** **А.И. Папковский**

УНП 100789114

**Твае правы**

# КАНТРАКТ ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ НЕ СПЫНЯЮЦЬ

## І ў тым ліку — з-за нізкай зарплаты

**Калі для большасці невялікіх сельскагаспадарчых раёнаў праблема лішніх вакансій застаецца па-ранейшаму актуальнай, то ў вялікіх і сярэдніх гарадах малюнак ужо іншы. Выбар варыянтаў працаўладкавання тут ёсць. І, як вынік, на першае месца пачынае выходзіць пытанне... звальненне з ранейшага месца. Ці можна скасаваць кантракт з-за нізкай зарплаты або пагаршэння стану здароўя, як пацвердзіць парушэнне працоўных дамоўленасцяў з боку наймальніка, ці адносіцца да такіх парушэнняў прапанова працаваць па некалькіх прафесіях адначасова, нарэшце, па якіх правілах робіцца канчатковы разлік — аб усім гэтым і іншым ішла гаворка падчас чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў Баранавіцкім раёне.**

### Зарплата яшчэ не падстава

У сітуацыі, калі чалавек заняты згодна з бестэрміновым працоўным дагаворам, асаблівых цяжкасцяў узнікнуць не павінна. Пры жаданні звольніцца дастаткова падаць заяву. Калі наймальнік не пагаджаецца яе падпісаць адразу, неабходна адпрацаваць роўна месяц. Пасля ж заканчэння тэрміну папярэджання можна проста спыніць работу. І гэта не будзе лічыцца прагулам.

Нашмат складаней скасаваць кантракт. Зрабіць гэта датэрмінова магчыма толькі паводле двухбаковага пагаднення паміж работнікам і наймальнікам. Калі ж такой згоды няма, давядзецца дапрацаваць да канца тэрміну. Спыніць кантракт па ўласным жаданні работнік не можа, і ў тым ліку — з прычыны нізкай зарплаты.

— У дадзеным выпадку застаецца толькі адна па-сапраўднаму важкая падстава — парушэнне ўмоў кантракта з боку наймальніка, — кажа начальнік упраўлення юрыдычнага забеспячэння і нагляду Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Алена Камісарава. — Прычым устанавіць такія парушэнні павінен не сам работнік, а спецыяльна ўпаўнаважаны дзяржаўны орган нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы, прафсаюз або суд. І толькі пасля таго, як гэтыя інстанцыі пацвердзяць факт парушэння, з'явіцца магчымасць патрабаваць звальнення.

Звярнуцца ў прафсаюз ці ў дзяржінспекцыю працы патрэбна непасрэдна работніку. А перад тым ён мусіць «вывучыць» уласны кантракт. Другі экзэмпляр кантракта павінен абавязкова выдавацца работніку «на рукі». Калі ж гэтага чамусьці не зроблена, неабходна падысці ў аддзел кадраў і нагадаць аб патрабаваннях працоўнага заканадаўства.

### Два ў адным. Глядзім на ўмовы?

Апроч невысокіх заробкаў, даволі распаўсюджанай прычынай для жадання звольніцца становіцца патрабаванне кіраўніцтва «сумяшчаць» дзве прафесіі — скажам, без дадатковай аплаты выконваць работу стропальшчыка і кранаўшчыка або вадзіцеля і грузчыка. Ці лічыцца такое патрабаванне парушэннем?

— Дакладныя працоўныя абавязкі павінны вызначацца ў тым жа кантракце, — адзначае Алена Камісарава. — І калі ў кантракце запісана, што супрацоўнік мусіць паралельна выконваць работу стропальшчыка і кранаўшчыка, даплата за «дадатковыя абавязкі» сапраўды неабавязковая. Зарплату налічаць толькі па «асноўнай» прафесіі, па якой і быў аформлены гэты работнік. Да, слова, паводле артыкула 19 Працоўнага кодэкса працоўны дагавор або кантракт можа заключацца як па адной, так і па некалькіх прафесіях, пасадах, спецыяльнасцях адначасова.

### Вердыкт выносяць медыкі

Таксама «папулярная» падстава для звальнення — пагаршэнне стану здароўя. Наколькі важкая гэта прычына?

— Калі выконваць работу немагчыма па стане здароўя, то неабходна звярнуцца ў медыка-рэабілітацыйную экспертную камісію, — падкрэслівае Алена Камісарава. — І ў сваю чаргу, калі камісія дасць заключэнне, што знаходзіцца на ранейшым месцы немагчыма, наймальнік павінен здзейсніць перавод на іншую работу паводле медыцынскіх паказанняў. Пры гэтым калі «патрэбнай» работы не аказалася ці калі на перавод не пагаджаецца сам работнік, адбываецца звальненне з выплатай 2-тыднёвай выхадной дапамогі.

### «Вярнуў» аванс — няма пытанняў

Не зусім звычайная сітуацыя, але абысці яе ўвагай таксама нельга. І работнік, і кіраўнік нібыта не супраць скасаваць кантракт датэрмінова. Калі б не адна акалічнасць: сёлета работнік ужо скарыстаўся сваім правам на працоўны водпуск, прычым водпуск быў прадстаўлены авансам...

— Калі насамрэч ёсць згода, падстаў «утрымліваць» работніка няма, — зазначае Алена Камісарава. — Іншая справа, што ў такой сітуацыі пры канчатковым разліку падчас звальнення з работніка могуць спагнаць прааванасаваныя «адпускныя».

Праўда, заканадаўства вызначае шэраг падстаў для звальнення, пры якіх утрыманні не робяцца. У прыватнасці, гаворка тут ідзе аб падставах, прадугледжаных у артыкуле 107 Працоўнага кодэкса.

### Затрымка дорага каштуе

Канчатковы разлік быў і застанецца тэмай для асобнай гутаркі. Работніку, які звальняецца, выдаць усе зробленыя грошы павінны ў апошні дзень знаходжання на ранейшым месцы. Пры гэтым, калі па тых ці іншых прычынах выплата затрымалася больш чым на месяц, атрымаць зарплату можна з улікам індэксацыі.

Не менш цікавы нюанс — працоўная кніжка. Выдаць «на рукі» яе абавязаны таксама ў апошні дзень работы. У адваротным выпадку дата звальнення пераносіцца на дату ўручэння працоўнай кніжкі. І за кожны дзень пратэрміноўкі работніку налічваецца яго сярэдняя зарплата.

Дарэчы, нагадвае Алена Камісарава, работніку, які ўладкаваўся ўпершыню, завесці працоўную кніжку абавязаны не пазней чым праз тыдзень. Пры гэтым адсутнасць у арганізацыі саміх кніжак — праблема выключна наймальніка.

### Прычыны назавуць не ўсім

Між тым, ці варта спяшацца пакідаць ранейшае месца — пытанне далёка не простае. Зноў-такі канкрэтны выпадак. Чалавек, якога не задавальняюць заробкі і ўмовы працы, звальняецца па ўласным жаданні. Потым у пошуках вакансіі звяртаецца адразу ў шэсць арганізацый і паўсюль... чуе адмову. І ўсё ж, ці абавязаны наймальнік аддаваць перавагу прэтэндэнту з больш высокім узроўнем адукацыі? І ўвогуле, ці павінен наймальнік тлумачыць свой выбар на карысць таго ці іншага работніка?

— Выбар работніка з'яўляецца выключным правам наймальніка, пры гэтым ён мае поўнае права аддаць перавагу з больш нізкім узроўнем адукацыі, але з большым вопытам работы, — тлумачыць Алена Камісарава. — Тут жа варта заўважыць, што наймальнік не можа адмовіць (або, павінен пісьмова патлумачыць прычыны адмовы) толькі некаторым катэгорыям грамадзян — цяжарным жанчынам, работнікам, якім прадастаўлена першае працоўнае месца, работнікам, што прынятыя ў сувязі з пераводам ад іншага наймальніка і г.д. Што ж да ўсіх астатніх, то ніякіх дадатковых гарантый для іх пры самастойным пошуку няма. Таму калі ўзнікаюць цяжкасці з уладкаваннем, можна параіць адно — звярнуцца па дапамогу ў службу занятасці насельніцтва.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Мінск — Баранавічы.*

# ЗАСТАЦЦА Ў ВЁСЦЫ

**Сёлета ў Магілёўскай вобласці з'явяцца 36 новых аграгарадкоў. Калі праграма адраджэння вёскі будзе выканана, то ў рэгіёне будуць 204 аграгарадкі: цяпер працуюць столькі ж сельскіх гаспадарак і кожная з іх будзе мець аграгарадок.**

Рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады і стварэнне аграградкоў штомесяц абмяркоўваюцца ў Магілёўскім аблвыканкаме на спецыяльных селектарных нарадах.

Яшчэ на першай з іх кіраўнік вобласці Барыс Батура запатрабаваў рэальных вынікаў ад стварэння аграгарадкоў: вялізныя грошы выдаткаваны на прывядзенне ў парадак вёсак, развіццё вытворчай і сацыяльнай сфераў. Эканамічны эфект павінен быць адпаведны: істотнае павелічэнне аб'ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

— Выдаткоўваем вялікія сродкі на сельскую гаспадарку, аднак на 100 працэнтаў аддачы не маем, — пацвярджае старшыня Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Літвінаў. — У вобласці сур'ёзна павялічылі вытворчасць малака і мяса, і ў першую чаргу, у тых гаспадарках, дзе сёння ёсць дастойныя аграгарадкі. Аднак хочацца большага, таму і ставяцца вялікія задачы.

Летась ураджай збожжавых на Магілёўшчыне дасягнуў 1,2 мільёна тон. Сёлета сельскагаспадарчыя арганізацыі плануюць сабраць 1,3 мільёна. Увогуле аб'ёмы вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, паводле прагнозных паказчыкаў, павінны павялічыцца на 8,5 працэнта.

За мінулыя тры гады ў вобласці створана 116 аграгарадкоў. Вяскоўцы высока ацэньваюць камфортнасць, гарадскія выгоды і ўзровень сацыяльнай сферы. Цяпер жыхары аграгарадкоў могуць бадай што ўсе свае жыццёвыя праблемы вырашыць на месцы, і ездзіць нікуды не трэба.

> «Хутчэй бы стала цёпла, каб з фермаў перамясціць на зялёныя пашы жывёлу, пачаць рамонт і рэканструкцыю».

Выхадзец з сельскай мясцовасці Валерый Літвінаў са свайго вопыту расказвае, што часам дастаткова толькі добрай дарогі, каб вёска перастала марнець, там засталіся людзі, пабудавалі жыллё і нарадзілі дзяцей.

Яшчэ болей шанцаў, калі ёсць медыцынскае абслугоўванне: каму хочацца вазіць сваё малое далёка да доктара? А калі ёсць нармальная школа, і вясковец упэўнены, што яго дзіця атрымае добрыя веды і паспяхова паступіць у навучальную ўстанову, то куды ж ён паедзе? «Застанецца ў вёсцы і будзе там жыць і працаваць», — упэўнены кіраўнік сельскай гаспадаркі рэгіёна.

— Аднак перадусім трэба мець сур'ёзную вытворчасць, — падкрэслівае Літвінаў. — Яна павінна ўсё ж быць на першым плане. Таму што чалавеку трэба зарабляць грошы. Вясковец купляе тавары ў краме і карыстаецца бытавымі паслугамі. Аднак нічога бясплатнага ў нас няма, за ўсё трэба плаціць. А для гэтага — працаваць і зарабляць. У адваротным выпадку не будзе развівацца і сацыяльная сфера, якая створана ў аграгарадках.

Далёка не ўсе аграгарадкі выконваюць патрабаванні кіраўніцтва па павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці. Напрыклад, гэта не атрымліваецца ў Баркалабаве Быхаўскага раёна, пра сітуацыю ў якім нядаўна распавядала «Звязда». У гэтым шэрагу ёсць і іншыя аграгарадкі.

Крытыку на месцах прызнаюць, але тлумачаць хібы слабай матэрыяльнай базай гаспадарак, якая была створана яшчэ за савецкім часам. Мяркуецца, што абноўленая і аснашчаная новым прадукцыйным абсталяваннем, яна з цягам часу дасць большую аддачу.

Напрыклад, у Крычаўскім раёне ёсць гаспадарка «Звездаагро», цэнтр якой — сімпатычны аграгарадок Бацвінаўка. Там пасля вялікага тэрміну эксплуатацыі практычна адрадзілі жывёлагадоўчы комплекс, замянілі абсталяванне. Паводле слоў Валерыя Літвінава, аддача ёсць: прывагі жывёлы сталі на 25—30 працэнтаў большымі.

Паказальным аграгарадком рэгіёна называюць Арэхаўку ў Клімавіцкім раёне. Гэта цэнтральная сядзіба моцнай гаспадаркі «Добраахвотнік». Арэхаўка была адным з першых аграгарадкоў, дзе шмат увагі надалі знешняму выгляду. Але галоўнае, што там моцная сацыяльная сфера спалучаецца з магутнай вытворчай.

— Я павінен сказаць, што аддача ад выдаткаваных сродкаў залежыць ад шмат якіх фактараў: ад якасці зямлі, матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў і іншых, — зазначае старшыня абласнога Камітэта па сельскай гаспадарцы і дэманструе табліцу. — Паглядзіце: ва ўсе сельскія раёны мы далі практычна аднолькавыя бюджэтныя грошы. І на кожны бюджэтны рубель аддача ўсюды розная. Напрыклад, у Магілёўскім раёне з аднаго рубля атрымалі 4,4, у Кіраўскім — 2,1, У Бабруйскім — 2. А ў Касцюковіцкім раёне — толькі 1,1, у Чавускім — 1 рубель уклалі — рубель атрымалі. І не таму, што яны лянівыя ці неразумныя. Спецыялізацыя і ўрадлівасць зямлі — сур'ёзныя фактары.

Селектарная нарада, якая адбылася напярэдадні, была прысвечана тэмпу работ на будаўніцтве аграгарадкоў. Яны пакуль не задавальняюць абласное кіраўніцтва. Хоць на большасці аб'ектаў у аграгарадках, паводле справаздач кожнага з раёнаў, да працы прыступілі, але сродкаў асвоена яшчэ мала. Праектная дакументацыя шэрагу аб'ектаў знаходзіцца альбо на экспертызе, альбо яшчэ завяршаецца яе распрацоўка, і работы там мяркуецца распачаць літаральна бліжэйшымі тыднямі.

Між тым, сёлета трэба будзе асвоіць у вёсцы амаль 140 мільярдаў рублёў, з іх амаль 54 мільярды — непасрэдна ў аграгарадках.

Трэба адрамантаваць 63 фермы. Фінансаванне ёсць, набываецца абсталяванне, але не паўсюдна пачалася праца.

— Асноўная аб'ектыўная праблема — гэта надвор'е, — сказаў Валерый Літвінаў. — Хутчэй бы стала цёпла, каб з фермаў перамясціць на зялёныя пашы жывёл, пачаць рамонт і рэканструкцыю.

Больш за 80 аб'ектаў у аграгарадках сёлета курыруе абласное ўпраўленне гандлю і бытавога абслугоўвання. Адрамантаваць 12 аб'ектаў аховы здароўя ў аграгарадках плануецца да 1 ліпеня, а капітальныя работы і новае будаўніцтва завершацца да 1 кастрычніка.

Буйнымі аб'ектамі сёлета выпадае займацца ўпраўленню культуры: адзін з іх месціцца ў Касцюшкавічах Крычаўскага раёна. Там у будынку з цікавай архітэктурай мяркуецца размясціць не толькі клуб, але і ўсю сферу абслугоўвання. Каб зрабіць усё належным чынам, спатрэбіцца 1,7 мільярда рублёў.

Галоўны спартыўны аб'ект — рэканструкцыя спартыўнага збудавання ў Лясной Слаўгарадскага раёна. Гэты аграгарадок увогуле павінны быць гатовы да святкавання напрыканцы жніўня 300-годдзя перамогі рускіх над шведамі. Аднак без сувязі з юбілеямі, кіраўніцтва вобласці запатрабавала ўсе аб'екты спорту і адукацыі завяршыць да пачатку навучальнага года, 1 верасня.

Дарэчы, у двух аграгарадках, якія будуць уведзены сёлета, не будзе школ. Мяркуецца вазіць дзяцей на аўтобусах у суседнія вёскі. Адлегласці не перавышаюць дзесятка кіламетраў, а адкрываць школы для 30—40 дзяцей немэтазгодна, настойвае абласное ўпраўленне адукацыі. Аднак Барыс Батура лагічна запытаўся: «Ці можа быць аграгарадок без школы, калі мы гаворым пра гарадскія ўмовы жыцця, альбо максімальна набліжаныя да іх?..»

Каб актывізаваць працу на будаўніцтве аграгарадкоў, у Магілёўскай вобласці будзе распрацаваны штомесячны графік асваення сродкаў, каб адсочваць выкананне планаў 2008 года ў вытворчай і сацыяльнай сферах у вёсцы.

**Ілона ІВАНОВА.**

# АХ, ЯК ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА Ў АГРАГАРАДОК?

**На Віцебшчыне да 2010 года запланавалі пабудаваць 256 аграгарадкоў. Па іх колькасці Прыдзвінскі край будзе на другім месцы пасля Мінскай вобласці. Летась былі «ўведзены ў строй» 39 такіх сучасных вёсак. А сёлета іх стане на 44 больш.**

«Аграгарадкі — гэта, перш-наперш, новыя тэхналогіі ў жывёлагадоўлі і раслінаводстве, без якіх немагчыма акупіць укладзеныя ў сельскую гаспадарку сродкі», — такі прыярытэт агучыў на адным з пасяджэнняў старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Андрэйчанка. Летась пры прыёме аграгарадкоў абавязкова ўлічвалася наяўнасць у іх адноўленых механізаваных майстэрняў, зернесушыльных комплексаў, фермаў.

На жаль, нярэдка ўзнікаюць цяжкасці пры ўводзе ў эксплуатацыю самых розных аб'ектаў. Вось самы свежы прыклад. Як расказаў «Звяздзе» намеснік начальніка ўпраўлення па кантролі за работай аграпрамысловага комплексу, лесагаспадарчага і прыродаахоўнага комплексу Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці Мікалай Хацкевіч, ёсць праблемы ў правераным нядаўна аграгарадку Веркуды Ушацкага раёна. Устаноўлена, што работы па асобных аб'ектах, прынятых у склад аграгарадка напрыканцы 2007 года, і на сёння не завершаны, а аб'екты рэканструкцыі і будаўніцтва не прыняты ў эксплуатацыю ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам.

На жаль, тут не завершаны работы па бягучым рамонце пункта, дзе сушаць насенне: разбіты шыфер, ёсць і іншыя «недапрацоўкі». Пра што гаварыць, калі ў сельскім Савеце не дарамантавалі столі, а ў краме працякае дах, і вада трапляе ўнутр гандлёвай залы. Яшчэ не завяршылі рэканструкцыю дзіцячага садка пад аддзяленне кругласутачнага знаходжання пенсіянераў. Аналагічная сітуацыя і на рэканструкцыі кацельні, сховішча зерня. І цяпер у гэтым аграгарадку жыхары чакаюць, што ўрэшце пачнецца добраўпарадкаванне вуліц Маладзёжная і Садовая. Больш за тое, на момант праверкі высветлілася, што не распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя для ажыццяўлення рэканструкцыі водазабору з будаўніцтвам воданапорнай вежы.

Пры праверцы дзейнасці мясцовай гаспадаркі «Дуброўка» высветлілася, што нягледзячы на завершаную восенню мінулага года рэканструкцыю фермы, смецце побач прыбіраць не спяшаюцца. Механізаваны двор прыведзены ў парадак, заасфальтаваны. А побач тэхніка, стаіць як безгаспадарчая, металалом валяецца.

Якія б гіганцкія сродкі ні ўкладваліся ў стварэнне аграгарадкоў, калі не памяняецца менталітэт і кіраўніцтва гаспадаркі, і жыхароў, нічога добрага, напэўна, з цікавай ідэі аднаўлення вёсак не атрымаецца. Такіх прыкладаў і ў іншых аграгарадках шмат. Не ўсюды створаны і ўмовы для інтэнсіўнага развіцця вытворчасці. Безумоўна, патрэбен час, каб вялікія грошы, патрачаныя на стварэнне аграгарадкоў, пачалі прыносіць прыбытак.

Добра, што ёсць з каго браць прыклад. Калі летам 2005 года кіраўнік дзяржавы наведаў гарадскі пасёлак Копысь, дзе жывуць каля 900 чалавек, адзначыў, што гэты населены пункт — узор для стварэння астатніх аграгарадкоў на Віцебшчыне. Тут знаходзяцца керамічны цэх, пякарня, развіваюцца іншыя інвестыцыйныя праекты. У Копысі, акрамя ўсяго іншага, вельмі перспектыўная і турыстычная сфера: праз пасёлак пралягае папулярны турыстычны маршрут. Такім чынам парадак на вуліцах і добры сэрвіс паралельна могуць прыносіць прыбытак за кошт турыстаў.

Цікавы вопыт развіцця прамысловай інфраструктуры ў Пастаўскім раёне ў знакамітым сельскагаспадарчым кааператыве «Навасёлкі — Лучай». Нагадаю, тут вырошчваюць рапс, робяць з яго біяпаліва, на якім працуюць трактары. Стабільна працуюць сырзавод, хлебазавод, разводзяць свіней і экзатычных страўсаў. А які непаўторны турыстычны куточак «Салаўіны гай» створаны вяскоўцамі! Цікава, што ў аграгарадку Камаі гэтага ж раёна два гады таму ва ўрачэбнай амбулаторыі пачалі прымяняць методыку дыстанцыйнага кансультавання. Вынікі даследавання перадаюцца як у райцэнтр, так і ў Віцебск...

Не сакрэт, што многія маладыя вяскоўцы ўжо даўно пакідаюць родныя мясціны і шукаюць шчасця ў гарадах. Ды і даросле насельніцтва мігрыруе. Несумненна, калі ў аграгарадках будзе створана ўсё неабходнае для дастойнага жыцця (і не толькі ў выглядзе справаздач на паперы пра выкананне сацыяльных стандартаў), будзе жыць і развівацца вёска!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ГАСПАДАР ЛІЧЫЦЬ ГРОШЫ

**Зрабіць жыццё вяскоўцаў прывабным, узняць яго да еўрапейскага ўзроўню — ідэя пахвальная. Але ж і за савецкім часам імкнуліся падцягнуць вёску да горада. І як тут не ўспомніць вёску Раздзялавічы, што ў Ганцавіцкім раёне. У Маскве задумалі, а ў вёсцы сярод балота і лесу ўзвялі пяціпавярховыя дамы. Ды не сталі жыхары гэтых дамоў гараджанамі. Цяжка жыць палешукам, бо насіць з пятага паверха вёдры з кормам для хатніх гадаванцаў няпроста.**

**Але гэта ў мінулым. Сёння для вясковага чалавека ўзводзяцца асобныя дамы. Памылкі развітога сацыялізму былі ўлічаныя, але час паставіў новыя праблемы.**

Аграгарадок — добрая задума, але падыход павінен быць узважаным. Магчыма, узвядзенне дамоў па дзяржаўнай праграме не павінна быць самамэтай. Калі жыллё ёсць, а работы няма ці заробак мізэрны, то каштоўнасць атрыманага дома падае. Жыллё і праца — гэтыя два фактары цесна звязаныя. Ды ўвогуле, калі чалавек мае магчымасць зарабіць грошы, то праблема жылля не такая і актуальная. Ёсць грошы — дом будзе. Забеспячэнне людзей працай — самая важная задача.

А наконт скаргаў, што жыллё ў вёсцы ўзводзіцца няякасна і людзі не хочуць часам у яго засяляцца, то гэта мае месца, але ж такая сітуацыя склалася па віне мясцовай улады, кіраўнікоў гаспадарак.

У сталіцы прынялі рашэнне, а старшыня сельгаскааператыва выйшаў за вёску і махнуў рукой: «Тут будзем будаваць!» І выстраіліся ў шарэнгу тыя домікі пад шыфернымі дахамі, аднолькавыя і бяздушныя.

Будаўніцтва гэтых дамоў кладзецца цяжарам на гаспадаркі. А людзі, як пры камунізме атрымліваюць іх, і не баліць у чалавека галава, што нешта трэба падправіць, прыбіць... Калі ёсць прэтэнзіі да будаўнікоў, то чуецца: «А што яны хочуць, атрымалі «халяўнае» і яшчэ незадаволеныя!» Ды нешта падобнае можна пачуць і ад мясцовых кіраўнікоў. Маўляў, нічога страшнага, калі рукі да нечага там і прыкладуць. Аказваецца, у нас яшчэ дзяржаўныя грошы ўспрымаюцца як «халяўныя». І дамы, якія людзі атрымліваюць па дзяржаўнай праграме адраджэння вёскі, таксама — «халява».

У Баранавіцкім раёне, які на Брэстчыне бадай што самы буйны, актыўнае будаўніцтва вядзецца ў сельгаскааператыве «Прыгарад». Тут ужо дваццаць дамоў заселена і яшчэ столькі ж узводзіцца. Сваёй чаргі на жыллё чакаюць 29 чалавек.

А вось што пра гэта думае кіраўнік гаспадаркі Алена Койпаш.

— Адразу некалькі слоў наконт якасці будаўніцтва жылля. Мы гэтую праблему, можна сказаць, закрылі і вялікіх прэтэнзій да будаўнікоў у нас няма. У некалькіх дамах адклеіліся шпалеры і па гэтай прычыне аддзелачныя работы праводзяцца не зімой, а летам, калі дом прасохне. Гаспадарка мае сёння майстра па наглядзе, і Дзмітрый Жыдзік сочыць за якасцю выкананай работы. Проста будаўнікоў неабходна трымаць пад кантролем, а не спадзявацца на іх сумленне. Вось адваліліся шпалеры, то няхай бракаробы і перарабляюць. А галоўнае, мне здаецца, што мы павінны прынцыпова змяніць усю схему будаўніцтва ў вёсцы. Нельга людзям раздаваць гэтыя дамы. Неабходна, каб яны ўдзельнічалі ў іх будаўніцтве — выплачвалі крэдыты, адчувалі сябе гаспадарамі і ў той жа час былі ўдзячныя сельгаскааператыву, прывязаныя да яго. Вось малады чалавек атрымаў дом, а праз дзесяць гадоў, калі яму перавалiць за трыццаць і ён поўны сілы, ужо можа распараджацца гэтым домам. Так не павінна быць. Жыллё службовае, бо той крэдыт выплачвае гаспадарка. Штомесяц за 20 дамоў нам неабходна адлічваць 20 мільёнаў — грошы вялікія, і далёка не кожны сельгаскааператыў такія выплаты пацягне. Калі ісці шляхам раздачы дамоў, то не будзе з кім працаваць. Напрыклад, у дзевяностыя 10 калгасных дамоў прыватызавалі, і цяпер з іх гаспадароў у сельгаскааператыве засталіся адзінкі — горад побач, дом ёсць, дык навошта той калгас. Мы спрабавалі разабрацца, хацелі крэдыты нейкім чынам перавесці на жыльцоў, але тлумачэння па гэтым пытанні так і не атрымалі. А будаўніцтва гаспадарцы патрэбна, каб захаваць кадры, бо жыллё, у асноўным, атрымліваюць маладыя, каб у вёсцы Лаўрынавічы пульсавала жыццё. Адным словам, тут ёсць сур'ёзныя заканадаўчыя недапрацоўкі.

Ад сябе дадам, што ў размове з Аленай Леанідаўнай высветлілася яшчэ многае. Вось узводзіцца 16 аднатыпных дамоў — усе як блізняты, а за праект кожнага з іх бяруць грошы, за 16 дамоў неабходна заплаціць 25 мільёнаў рублёў, хоць для аднаго дома ён каштуе крыху больш за мільён.

За ўсё плаціць гаспадарка, а колькі грошай і часу патрэбна, каб пабудаванаму дому надаць статус службовага жылля. Здараецца, што з гэтай прычыны дом месяцамі не засяляецца.

Бывае, атрымаўшы дом, чалавек у ім і не гаспадар, а чужы: жыве як у інтэрнаце. Гадамі ні за што не бярэцца.

Але і пабудаваць пры «сваім-чужым» доме гараж ці хлеў няпроста. Неабходна атрымаць рашэнне праўлення СВК, сельсавета, аформіць тэхнічную дакументацыю.

Не будзем забываць і пра тых, хто сам пабудаваў дамы і даўно працуе ў гаспадарцы.

«Я трыццаць гадоў адпрацаваў, гарбом нажыў той дом і мне нічога не належыць, а тут раздаюць катэджы направа і налева», — абураецца чалавек. І ён мае рацыю. Сельгаскааператыў — гаспадарка калектыўная і крэдыты выплачваюцца з прыбытку ўсіх работнікаў, а не тых, хто засяліўся ў дамы. Многія з іх не зарабілі яшчэ і рубля.

З Аленай Койпаш зайшлі ў некалькі дамоў. Юлія Навумовіч жыве ў такім доме два гады і ў яе няма ніякіх прэтэнзій. Муж сказаў, што ў гэтым доме і памрэ — прыжылася сям'я. А гэты дом каштуе ўсяго 52 мільёны, а праз дарогу ўзводзяцца катэджы па 152 і 204 мільёны рублёў. Можна ўявіць, якія гэта харомы ў два паверхі! Але зноў жа, чаму толькі дзяржава за ўсё гэта плаціць? Дамы ўзводзяцца сёння, а грошы дзяржаве (народу) будуць вернутыя толькі праз 40 гадоў і, напэўна, яны ўжо не будуць мець сённяшняй вагі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



*Юлія НАВУМОВІЧ і Алена КОЙПАШ.*

## У Лагішыне – лагічна



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*На ўскрайку г. п. Лагішына Пінскага раёна ўзводзіцца аграгарадок.*

**Пытальнік**

## Хто адшукае «шэры заробак»?

**«Атрымліваю зарплату ў 250 тыс. рублёў і адна выхоўваю 13-гадовую дачку. Пры гэтым паколькі былы муж аформіў на сябе догляд брата-інваліда І групы, афіцыйна ён атрымлівае толькі дапамогу на догляд і плаціць з яе аліменты ў памеры 11 тыс. рублёў. Разам з тым, наколькі мне вядома, адначасова муж працуе ў прыватнай фірме. Як можна пацвердзіць факт работы і, адпаведна, атрымаць большыя аліменты?»**

**Валянціна Анатольеўна,** *Клецкі раён.*

Варта сказаць адразу, што пацвердзіць факт работы без афармлення (а, мяркуючы па ўсім, маецца на ўвазе менавіта такі выпадак) будзе вельмі складана — тут спатрэбяцца прамыя доказы і, зразумела, канкрэтныя звесткі аб месцы ўладкавання мужа. Прычым для пацвярджэння лепш за ўсё звярнуцца ў Дэпартамент фінансавых расследаванняў ці ў аддзел па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю органаў унутраных спраў.

Да слова, Валянціна Анатольеўна, варта заўважыць — у выпадку, калі ў вашай сям'і склалася па-сапраўднаму цяжкая сітуацыя, можаце звярнуцца па сацыяльную падтрымку, і, у прыватнасці, па адрасную сацыяльную дапамогу.

# ПАСПЯШАЛІСЯ АДРАПАРТАВАЦЬ

## Аграгарадок «Ляхавецкі» Маларыцкага раёна здадзены з вялікімі агрэхамі

Летась у Маларыцкім раёне быў здадзены аграгарадок «Ляхавецкі». Спяшаліся зрабіць гэта ў 2007 годзе, бо так было запланавана. Але калі на месца выехалі супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці, то ўпэўніліся, што ў парадку хіба што дакументы на новы аграгарадок. А вось агрэхі і недапрацоўкі засталіся.

Галоўнай праблемай сельскагаспадарчага прадпрыемства, аднайменнага з аграгарадком, можна лічыць адсутнасць сучаснай вытворчай базы. Паводле слоў начальніка ўпраўлення аграпрамысловага комплексу абласнога КДК Мікалая Расіча, будаўніцтва кароўніка на 200 галоў з даільна-малочным блокам у Ляхаўцах не скончана. На старых жа фермахdояць, як паўвека таму, у даільныя вёдры. А ў той дзень, як на аб'ект завіталі кантралёры, даільнае абсталяванне нават было дрэнна памыта. Не бліскуча выглядаюць і паказчыкі работы жывёлагадоўлі гэтай гаспадаркі. За мінулы год у параўнанні з папярэднім паменшылася пагалоўе кароў. Не ўдалося выканаць план здачы ў лік дзяржзаказу малака, здадзена толькі 91,2 працэнта. А вось у вышэйшы гатунак залічана толькі 12,6 працэнта малочнай прадукцыі, з-за чаго па сутнасці недаатрымана болей за 96 мільёнаў рублёў. Паменшыліся сярэднясутачныя прывагі маладняку на адкорме. Яно і нядзіўна. Напрыклад, на ферме, дзе ўтрымліваюцца цяляты ва ўзросце да шасці месяцаў, было далёка да парадку: плёнка на вокнах пашкоджана, дзверы развалены.

Спецыялісты Камітэта дзяржкантролю ўважліва праверылі аб'екты сацыяльнай інфраструктуры новаздадзенага аграгарадка. І там праблем аказалася вельмі шмат. Яшчэ ў лютым у будынку комплекснага прыёмнага пункта, які павінен быў даўно працаваць, ва ўсю ішлі работы па рэканструкцыі і рамонце. Не была гатова да прыёму наведвальнікаў і вясковая лазня. Ляхавецкія Дом культуры і школа таксама не маглі пахваліцца выглядам, які адпавядае статусу ўстаноў аграгарадка.

Калі ж справа дайшла да праверкі выканання патрабаванняў сацыяльных стандартаў, аказалася, што і тут не ўсё ў парадку: не выконваецца адзін з найважнейшых — забеспячэнне жыхароў вёскі водаправоднай вадой. Згодна з патрабаваннямі, у аграгарадках такую ваду павінны мець не менш чым палова жыхароў. У Ляхаўцах водаправодам карыстаецца фактычна менш за чвэрць насельніцтва. Хоць канавы для водаправодных сетак пракапалі, справу да канца не давялі.

Як сказаў карэспандэнту «Звязды» Мікалай Расіч, праверкі па названых і іншых аграгарадках праводзіліся ў студзені-лютым. Аб выніках рэйдаў былі праінфармаваны органы выканаўчай улады. Выкрытыя недахопы сталі прадметам абмеркавання і арганізацыйных высноў на пасяджэннях абласнога і раённых выканкамаў. І некаторыя з названых вышэй агрэхаў ужо выпраўлены. Але работу неабходна фарсіраваць, каб укладзеныя дзяржавай грошы ў будаўніцтва аграгарадкоў хутчэй прынеслі чаканыя вынікі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ДАРАГАЯ РЫБА

**На вадасховішчы «Сялец», што ў Баранавіцкім раёне, супрацоўнікамі аховы прыроды былі затрыманы двое, якія займаліся незаконным ловам рыбы.**

У браканьераў канфіскавалі 110 кг рыбы і сеткі даўжынёй больш за паўкіламетра. Затрыманым давядзецца за нанесеныя страты прыродзе заплаціць 6 млн рублёў і штраф.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# МНОГІЯ АБ'ЕКТЫ АГРАГАРАДКОЎ НЕ АДПАВЯДАЮЦЬ СЁННЯШНЯМУ ДНЮ

## На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае саветнік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Казімір РАМАНОЎСКІ

— Галоўны вынік рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі за 2005—2007 гады — 27-працэнтны прырост аб'ёмаў валавой сельскагаспадарчай прадукцыі. У грамадскім сектары адзначаецца стабільны рост вытворчасці. За кошт прымянення інтэнсіўных фактараў летась сабрана 7,2 мільёна тон збожжа ў чыстай вазе (у тым ліку ўпершыню 540 тыс. т зерня кукурузы), 3,6 млн т цукровых буракоў, 900 тыс т бульбы, 380 тыс т агародніны. За апошнія тры гады вытворчасць малака павялічылася амаль на трэць, яек — на 21 працэнт, рэалізацыя жывёлы і птушкі — на 35 (прычым аб'ёмы вытворчасці курацiны ўзраслі больш чым удвая). Паводле падлікаў спецыялістаў, выпрацаваная сельскагаспадарчай прадукцыі дастаткова для задавальнення ўнутранага попыту і паставак на экспарт прыкладна на 1,8 мільярда долараў. Чысты прыбытак у сельскагаспадарчых прадпрыемствах падвоіўся, а колькасць стратных гаспадарак зменшылася з 269 да 5. Такія асноўныя вынікі ад інвестыцый (за тры гады ў вытворчую сферу ўкладзена 9,1 трыльёна рублёў) у межах праграмы адраджэння вёскі. Дарэчы, яе рэалізацыя павінна прывесці да паляпшэння якасці жыцця вяскоўцаў: павелічэння даходаў, прэстыжнасці працы, фарміравання пасяленняў новага тыпу — аграгарадкоў.

**— Калі ў вытворчай сферы заўважныя змены да лепшага, то што адбываецца ў сацыяльнай?**

— Летась сярэдняя заработная плата вяскоўцаў дасягнула 200 долараў. Разам з тым гэта толькі 62 працэнты ўзроўню аплаты працы па народнай гаспадарцы і крыху больш чым палова — у прамысловасці. На развіццё і ўтрыманне сацыяльнай сферы выдаткавана 10,7 трыльёна рублёў. Пабудавана 25,8 тысячы жылых дамоў, працягваецца далейшая газіфікацыя, паляпшаецца энергазабеспячэнне, водазабеспячэнне. 95,7 працэнта вёсак маюць стацыянарную ці мабільную сувязь. Праводзіцца рэканструкцыя дарог, арганізавана каля 200 бальніц сястрынскага догляду. Адкрыта 208 гандлёвых аб'ектаў, адноўлена работа крамаў у 496 населеных пунктах, у аграгарадках пачалі працаваць 178 новых комплексных прыёмных пунктаў па бытавым абслугоўванні насельніцтва.

**— Наколькі ўдалым атрымаўся вопыт стварэння аграгарадкоў?**

— Гаспадаркі, цэнтральныя сядзібы якіх пераўтвораны ў аграгарадкі, маюць 38 працэнтаў агульнай плошчы сельскагаспадарчых палеткаў. Летась на іх долю прыпадала 45 працэнтаў усяго аб'ёму вытворчасці малака і мяса, больш за палову таварнай прадукцыі і прыбытку. Так што эканамічны эфект укладанняў відавочны, чаго, праўда, не скажаш пра «сацыялку». У адпаведнасці з заканадаўствам, аграгарадок — добраўпарадкаваны населены пункт, дзе створана вытворчая і сацыяльная інфраструктура для забеспячэння сацыяльных стандартаў мясцовага насельніцтва і жыхароў прылеглых тэрыторый. Адпаведны статус прысвойваецца рашэннем раённага Савета дэпутатаў па ўзгадненні з абласным Саветам і ўрадам. Што павінна быць у аграгарадку? Абавязкова добраўпарадкаванае жыллё з усімі выгодамі (цэнтральным водазабеспячэннем і каналізацыяй, ацяпленнем і гарачай вадой, прыродным газам і тэлефонам), школа і дзіцячая дашкольная ўстанова сучаснага тыпу, медыцынская арганізацыя, стадыён, клуб з бібліятэкай, лазня, крама, прадпрыемства па аказанні комплексу бытавых паслуг. Калі выконваецца ўвесь гэты сэрвісны «пакет», то можна весці гаворку аб населеным пункце новага тыпу. За тры гады было створана 666 аграгарадкоў, а ўсяго, як плануецца, да 2010-га будзе сфарміраваны 1481.

**— І ўсе аграгарадкі адпавядаюць свайму статусу?**

— Шэраг з іх у поўнай меры адпавядаюць свайму статусу, тут прыменены цікавыя праектныя рашэнні, якія карысныя для далейшага распаўсюджвання. Аднак, на вялікі жаль, такая якасць інфраструктуры не ва ўсіх аграгарадках. Падчас фарміравання спецыяльнай праграмы кіраўнікі мясцовых органаў улады, спадзеючыся на шчодрае дзяржаўнае фінансаванне, імкнуліся ўключыць у яе як мага больш населеных пунктаў. Нярэдкія выпадкі, калі аграгарадкі ствараліся ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах, якія маюць 2,5—3 тысячы гектараў палеткаў і з-за невялікіх памераў ужо сталі ці праз пэўны час трапяць у лік неперспектыўных. Пасля ўзбуйнення гаспадарак атрымалася, што ў асобных з іх стала па два населеныя пункты новага тыпу. У першыя гады рэалізацыі праграмы адраджэння вёскі ствараліся на базе лепшых пасёлкаў у раёне і на прывядзенне іх у адпаведнасць з патрабаваннямі сацыяльных стандартаў не патрабаваліся значныя сродкі. З цягам часу спатрэбіцца ўсё больш грошай. Мяркуйце самі: калі ў 2005-м для абуладкавання вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры аднаго аграгарадка ў сярэднім выкарыстоўвалася 1,9 мільярда рублёў, то ў 2006 г. — ужо 4 млрд рублёў, у 2007 г. — 4,6 млрд рублёў, а сёлета, па падліках, будзе неабходна каля 5,4 млрд. У гэтых населеных пунктах у галоўным забяспечаны асноўныя сацыяльныя стандарты. Але гэта па форме, паколькі па змесце многія найважнейшыя аб'екты, як паказалі праверкі, не адпавядаюць сучасным патрабаванням — патрабуюць рамонту альбо знаходзяцца ў прыстасаваных памяшканнях. Здараецца, што сацыяльныя стандарты выконваюцца за кошт мабільных крамаў і комплексных прыёмных пунктаў. На працягу апошніх трох гадоў пабудавана толькі 5 школ, 3 установы аховы здароўя, 4 пазашкольныя стадыёны, 2 грамадскія лазні і іншыя аб'екты. Між тым, у здадзеных аграгарадках «не хапае» 33 школ, 166 дзіцячых садкоў, 58 устаноў культуры, 483 пазашкольныя стадыёны. У шэрагу месцаў няма грамадскіх лазняў, патрабуецца рэканструкцыя альбо павелічэнне магутнасці водаправодных сетак, адсутнічае прыродны газ. Застаюцца не выкананымі работы па 89 аб'ектах культуры, 45 — адукацыі, 227 — камунальнай гаспадаркі. Для іх завяршэння патрабуецца 150 мільярдаў рублёў.

**— Чаму так адбываецца?**

— Як і раней, сродкі для сацыяльнай інфраструктуры вёскі выдзяляліся паводле рэшткавага прынцыпу. Напрыклад, летась удзельная вага інвестыцый у аграгарадкі ад агульнай сумы інвестыцый у сферы адукацыі склала 5 працэнтаў, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, фізічнай культуры і спорту — 0,3, гандлю і грамадскага харчавання — 0,5, культуры — 3,4, камунальнай гаспадаркі — 4,6 працэнта. Адсюль і такія вынікі. Дэфіцыт сродкаў, напэўна, будзе адчувацца і сёлета — для стварэння сацыяльнай інфраструктуры 271 аграгарадка неабходна 1,3 трыльёна рублёў, аднак рэальна праглядаецца толькі каля 1 трлн. Неабходна ўсур'ёз задумацца аб змяшчэнні акцэнту ў інвестыцыях у сацыяльную сферу не толькі аграгарадкоў, але і раённых цэнтраў, малых гарадоў і пасёлкаў. У выніку развіцця матэрыяльна-тэхнічнай аграпрамысловага комплексу ў шэрагу рэгіёнаў вызваляецца пэўная колькасць занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці. Іх можна працаўладкаваць, да прыкладу, на прыватных прадпрыемствах па аказанні паслуг, развіцці рамёстваў, перапрацоўцы прадукцыі, агратурызме. Для прадукцыйнай дзейнасці прадпрыемстваў малога бізнэсу ў вёсцы ствараюцца спрыяльныя ўмовы. Прыватны сектар здольны даць дадатковы імпульс для таго, каб актывізаваць развіццё глыбінкі. У спалучэнні са значнымі дзяржаўнымі інвестыцыямі ў межах праграмы адраджэння вёскі гэты фактар дапаможа вырашыць шэраг сацыяльных праблем.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## «Біяразнастайныя» браканьеры

**На вадасховішчы «Сялец» Бярозаўскага раёна былі затрыманы браканьеры, якія нанеслі ўрон прыродным рэсурсам у асабліва буйным памеры.**

Напачатку падчас прыродаахоўнага рэйда ўвечары дзяржінспектары заўважылі замаскіраваны ў хмызняку на беразе аўтамабіль, а затым у бінокль — лодку з двума рыбакамі, якія даставалі з вады сеткі. У прысутнасці выкліканых міліцыянераў Бярозаўскага РАУС з пяці мяхоў, што належалі затрыманым, на свет з'явіліся: 11 сетак агульнай даўжынёй 538 метраў і рыба вагой 114 кілаграмаў. Прычым ва ўлове быў прадстаўлены практычна ўвесь спектр відаў, якія жывуць у вадаёме: 45 таўсталобікаў, 11 белых амураў, 86 ляшчоў, 63 плоткі, 3 судакі, па два шчупакі, ліні і акуні. Здабыча, згодна з устаноўленымі таксамі, «пацягнула» амаль на 6 мільёнаў рублёў. Менавіта такую суму браканьерам давядзецца заплаціць з уласнай кішэні за нанесены ўрон. Рыба, незаконныя прылады лоўлі і гумавая лодка канфіскаваныя. Далейшы лёс затрыманых вызначаць праваахоўныя і судовыя органы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Ледзь не развярнуў хату

**У Бярозе п'яны вадзіцель урэзаўся ў жылы драўляны дом па вуліцы Леніна. Жыллё настолькі пацярпела, што камісія прыняла рашэнне часова адсяліць у інтэрнат дзве сям'і, якія там пражывалі.**

22-гадовы ліхач ужо здзейсніў злачынства, калі сеў за руль, бо правоў ён быў пазбаўлены да гэтага, тым больш, калі сеў за руль нецвярозым. Цяпер давядзецца адказваць.

**Яна СВЕТАВА.**

Загадкі гісторыі

# Ахутаныя тайнай

## Хто яны, масоны на землях Беларусі?

**«Слова да прафанаў» — так назваў доктар гістарычных навук, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Вячаслаў Швед прадмову да сваёй новай кнігі «Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII — першая чвэрць XIX стагоддзя). Ніякай абразы чытачоў тут няма, паколькі менавіта так, прафанамі, масоны называлі тых, хто не ведае іх таямніцаў.**

Пагадзіцеся, што і сапраўды нашы веды аб удзельніках гэтага руху, традыцыі якога пазычаны ад сярэднявечных цэхаў будаўнікоў-муляраў і ордэна тампліераў, вельмі абмежаваныя. А калі нешта і ведаем, то знаходзімся пад уплывам шэрагу стэрэатыпаў у вызначэнні масонства. Некаторыя ўяўляюць яго патаемнай, злачыннай, усемагутнай арганізацыяй, якая імкнецца да сусветнага панавання на пачатках вучэння аб выбраным народзе. Другія лічаць масонаў атэістамі, што выступаюць супраць царквы і рэлігіі. Трэція бачаць у іх дзейнасці недзяржаўную змову супраць народаў. Чацвёртыя паказваюць масонства як падпольны рэвалюцыйны рух. Масонаў абвінавачваюць у захопе ўплывовых пазіцый у дзяржаўных і грамадскіх структурах кіравання, у сферы ідэалогіі і культуры, у развале дзяржаў і эканамічным застоі...

Дык хто ж яны, гэтыя вольныя муляры? Як і чаму з'явіліся на беларускіх землях і якіх поглядаў прытрымліваліся? Чым адрозніваліся ад сваіх братоў у Англіі (першая ў свеце Вялікая ложа арганізавалася 24 чэрвеня 1717 года ў Лондане), Францыі ці Германіі? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні Вячаслаў Швед шукаў у архіўных і бібліятэчных сховішчах Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі, Германіі. У выніку атрымаўся нарыс гісторыі масонства на нашых землях, а таксама прыводзяцца спісы братоў масонскіх ложаў, звесткі аб патаемных таварыствах, у якіх удзельнічалі масоны і іх дзеці.

Сёння Вячаслаў Вітальевіч знаёміць чытачоў «Звязды» толькі з некаторымі фактамі, якімі і павінен аперыраваць гісторык.

— На землях Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX стагоддзя дзейнічала да 16 масонскіх ложаў, якія налічвалі не меней за 1060 братоў. Напрыклад, 22 мая 1770 года ў Магілёве пачала працаваць ложа «Двух Арлоў». У 1776-м ці 1777 годзе прафесар Маскоўскага ўніверсітэта І. Шварц з дазволу гросмайстра расійскіх ложаў І. Ялагіна заснаваў у Магілёве ложу «Геркулес у Калысцы». Другім цэнтрам распаўсюджання масонства на Беларусі стаў Полацк, куды ў 1777 годзе перанесла працу з Масквы ложа «Талія». У 1791 годзе ў Шклове працавала ложа «Мудрасць». А ложа «Шчаслівае вызваленне» ўзнікла ў 1781 годзе ў Гродне. У бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ёсць пергамент з подпісамі 17 братоў гэтай ложы, прычым майстрам кафедры ў ёй быў знакаміты вучоны, заснавальнік першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі медыцынскай акадэміі і ўнікальнага батанічнага саду Ж.-Э. Жылібер.



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.




*НА ЗДЫМКАХ: дом на вуліцы Ажэшкі, дзе калісьці размяшчалася штаб-кватэра гродзенскіх масонаў; пячаткі і штампы масонскіх ложаў на землях Беларусі.*

Росквіт масонства на беларускіх землях адбыўся ў 1816—1821 гадах пад апекай Аляксандра І, які сам быў масонам. Менавіта ў гэты час у Навагрудку ўзнікла ложа «Багіня Цэрэра», якая хутка змяніла назву на «Вузел Еднасці», у Гродне — «Сябры чалавецтва», у Мінску — «Паўночная Паходня», «Святыня Поўначы», «Гара Табар», у Слуцку — «Уладзіслаў Ягайла», у Нясвіжы — «Святыня Спакою»...

**— Што адметнага было ў структуры, іерархічнай пабудове беларускіх масонскіх ложаў?**

— Ложа — гэта ячэйка масонскага таварыства, супольнасць абраных, аб'яднаных духоўнымі вузамі і адпаведнай клятвай. Таксама ложай называлася памяшканне, дзе праходзілі пасяджэнні. Вокны выходзілі на тры бакі: усход, захад і поўдзень. Ложы былі сімвалічныя і капітулярныя. У сімвалічных працы вяліся ў першых трох ступенях: вучня, чаляднíка (паўмайстра) і майстра. Капітулярныя ложы працавалі ў наступных ступенях — кавалер абраны, кавалер шатладскі, кавалер Усходу, кавалер Ружовага Крыжа. Ступень залежала ад узроўню пасведчанасці ў масонскія таямніцы. Асноўная праца кожнай ступені заключалася з падрыхтоўкі і прыняцця брата ў сваю ступень. Скажам, навука масонаў дзвюх першых ступеняў складалася з выпрацоўкі сямі абавязкаў: даверу, шчырасці, міласэрнасці да бедных, паслухмянасці, лагоднасці, адвагі і маўчання. А масон сёмай ступені (кавалер Ружовага Крыжа) ведаў, што «той, хто праз сваю працу і пошукі адкрые таямніцу, высокія праўды замыкаючую, будзе ўпэўнены, што знайшоў шчасце, па якім кожны смяротны ўздыхае, дні яго будуць шчаслівыя, рукі яго будуць чыстыя, а нястача і слабасць не будуць мець перавагу».

**На землях Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX стагоддзя дзейнічала да 16 масонскіх ложаў**

Дарэчы, сцены памяшканняў і фартухі братоў у ложах першых дзвюх ступеняў былі блакітнага колеру. А сцены памяшканняў, дзе адбываліся пасяджэнні братоў і абраных кавалераў, мелі чорны колер.

Кожны год 1 сакавіка (гэта першы дзень масонскага года) адбываліся выбары адміністратараў ложы. Яны абіраліся на адзін год: майстра кафедры, ягонага намесніка, дазорцы, прамоўцы, падскарбія, суддзі, ядмузніка (збіральніка міласціны). Майстар — адміністрацыйны кіраўнік ложы. У яго адсутнасць справамі ложы кіраваў намеснік. Прамоўца, які павінен быў добра ведаць Статут, звычаі і прадпісанні ордэна, выступаў і даваў заключэнне па сутнасці кожнай справы. Звычайна пасля яго выступлення старшыня пасяджэння пачынаў дыскусію. Пад апекай падскарбія знаходзіўся бюджэт ложы і фінансавыя разлікі. Суддзя вырашаў судовыя справы братоў. Ялмузнік збіраў і размяркоўваў грошы для дапамогі бедным, наведваў хворых братоў, на яго імя падаваліся прашэнні аб дапамозе.

Масоны былі дзейныя і ганаровыя. Калі разгледзець якасны склад 672 беларускіх масонаў, то сярод іх пераважалі вайскоўцы — 122 чалавекі. Другая па колькасці група (102) — гэта шляхціцы і памешчыкі. 97 масонаў былі служачымі па судовай частцы, 78 — чыноўніцтва мясцовай адміністрацыі і дваранскіх органаў кіравання. Вылучалася таксама група ўрачоў, дактароў медыцыны, аптэкараў — 25 чалавек. Да масонства таксама належалі настаўнікі, музыканты, дактары філасофіі...

Што датычыцца адметных рысаў гэтага руху на Беларусі, то цікавую характарыстыку літоўска-беларускіх масонаў даў І. Ходзька ў сваіх «Літоўскіх замалёўках»: «Уступіўшы ў ложу, польскі (чытай ліцвінскі. — **В.Ш.**) брат масон шукаў перш за ўсё навінаў, адкрыцця таямніцы, наўмысна зацямнёнай баламутнай сімволікай і яшчэ больш баламутнай масонскай легендай... Польскі брат масон зашмат не думаў. Не дакрануўшыся таямніцы так хутка, як таго прагнуў, угаворваў сябе, што яна ёсць, але так узвышана, высакародна і так глыбока ўкрыта, што ён яе адшукаць не здолее. Супакоіўшы сябе такім чынам, сядзеў у масонстве і далей, пакуль яго адтуль не выгнаў аляксандраўскі ўказ».

Але не толькі цікавасць штурхала ў лона ложаў. Некаторых прываблівалі матэрыяльны інтарэс, перамяшчэнне па службовай лесвіцы, уваходжанне ў элітныя колы. Кагосьці, мажліва, цікавіла вячэра пасля пасяджэння ложы. І. Ходзька пісаў: «Слабы літаратар, журналіст і кнігавыдаўца ўступае ў ложу, бо «браты» яго літаратурныя і журналісцкія опусы як вяршыню мудрасці, ведаў і дасціпнасці разнясуць па свеце і кнігі купяць у кнігарнях «брата», але дадуць і рэкамендацыю, а нават і грошы і дапамогуць да добрай кар'еры...».

**— Якімі былі грамадска-палітычныя, рэлігійныя погляды беларускіх масонаў?**

— Іх галоўнай мэтай было самаўдасканаленне, самавыхаванне, «пераўтварэнне першапачаткова змарнаванай чалавечай натуры». Масоны казалі пра роўнасць людзей, неабходнасць жыць адзіным грамадствам. Шмат увагі надавалася праяўленню чалавечнасці. Адзін з абавязкаў масона сфармуляваны так: «Любі бліжняга, як самаго сябе, не рабі яму ніколі таго, што сабе не зрабіў бы». Масон не павінен быў устыдацца на людзях чалавека ніжэйшага, але пачцівага, якога абдымаў, як брата ў ложы.

Палітычныя погляды масонаў былой Рэчы Паспалітай былі розныя, бо ложы складаліся з дробнай шляхты, з буйных магнатаў, мяшчанства, прыхільнікаў і праціўнікаў манархіі. Прычым некаторыя масоны пайшлі далей размоў. Яны ўдзельнічалі ў паўстаннях, у прыватнасці, былі касцюшкаўцамі. А, да прыкладу, слуцкі масон Вішчынскі ў чэрвені 1819 года заявіў на пасяджэнні ложы, што вызваліў навечна ад падданства свайго селяніна Пуцяту з сям'ёй, бо той праз яго стаў масонам, а значыць, яго родным братам.

Такім чынам, масонства не варта ідэалізаваць, але не трэба і рабіць з яго нейкую таямнічую «страшылку». Сярод беларускіх масонаў было шмат цікавых, духоўных людзей, патрыётаў, рамантыкаў, якія марылі аб удасканаленні грамадства. Масонства — гэта з'ява, якая пацвярджае еўрапейскасць нашай гісторыі і якую, дарэчы, можна выкарыстаць у дзейнасці турыстычных прадпрыемстваў.

...Пасля забароны масонства многія дакументы, знакі былі знішчаны, практычна не захаваліся пратаколы пасяджэнняў ложаў. Таму дзейнасць масонаў па-ранейшаму ахутаная тайнамі і загадкамі, а значыць, яшчэ шмат наперадзе працы ў гісторыкаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

ПлацдАрм

# БЕЛАРУСКАЯ АРМІЯ АДМОВІЦЦА АД БОТАЎ,

## а на салдацкім стале хутка з'явяцца сыр, смятана, маянэз, кетчуп, болей яек...

**Напярэдадні 90-годдзя з дня стварэння тылу Узброеных Сілаў Беларусі (святкуецца 28 сакавіка) журналісты азнаёміліся з найноўшымі ўзорамі ваеннай формы, якая ўжо ўведзена ці яшчэ праходзіць праверку, а таксама асартыментам харчавання ваеннаслужачых.**



У беларускай арміі ўжо тры гады няма такой формы вопраткі, як шынель. Замест яе выкарыстоўваюцца камufляваныя ўцепленыя курткі. Праз год-паўтара цалкам адмовяцца і ад ботаў: іх заменяць бацінкі з высокімі берцамі, якія ўжо носяць у шэрагу гарнізонаў. Аб гэтым паведаміў генерал-маёр Аляксандр Балігатаў, начальнік тылу Узброеных Сілаў Беларусі.

Апошняя навінка беларускіх дызайнераў — баявая форма з асабліва моцнай арміраванай тканіны, што распрацавана «Магатэкс» па заяве Міністэрства абароны Беларусі. Яна даволі ўніверсальная: падыдзе і танкістам, і мотастралкам, і г. д. Форма зручная ў выкарыстанні (хутка сохне і лепей пераносіць мыццё). Фарба нанесена на тканіну лічбавым метадам і мае інфрачырвоную рэмісію, а значыць, сілуэт ваеннаслужачага будзе расплывацца пры выкарыстанні інфрачырвоных прыцэлаў і прыбораў начнога бачання. Аднак такая форма будзе не больш чым на 10 працэнтаў даражэйшая за аналагічную форму з іншага віду тканіны, камплект якой абыходзіцца прыкладна ў 60 тысяч рублёў. Цікава, што вага новага абутку баявой формы вопраткі (ліццявога метаду прымацавання падэшвы) меншая за тую, дзе выкарыстоўваўся цвіковы ці клеяпрашыўны метад прымацавання падэшвы.

Таксама распрацавана спецыяльная форма для сілаў спецыяльных аперацый. Пры гэтым улічваліся павышаная нагрузка ў экстрэмальных умовах і адпаведнасць маскіровачных якасцяў нашаму кліматычнаму поясу ў любую пару года. Не забыліся дызайнеры і аб жанчынах. Раней у іх не існавала выбару, апрануць штаны ці спадніцу. З 2006 года спецыяльна для прыгожай паловы створаны новыя жаноцкія мадэлі ваеннай формы і галаўных убораў, якія засталіся практычнымі, зручнымі ў выкарыстанні, але пры гэтым адпавядаюць эстэтычным патрабаванням жанчын. Гэта спадніцы, туфлі на абцасах, асаблівы від гальштука, арыгінальныя мадэлі шапак з каракулю ці аўчыны.



Фота БЕЛТА.

— Удасканаленне ваеннай формы, праведзенае летась, дазволіла на 100 працэнтаў забяспечыць асабісты склад баявой, паўсядзённай, парадной і спецыяльнай формамі адзення. Многае з лёгкай прамысловасці СССР было сканцэнтравана ў Беларусі, таму цяпер нам не патрэбна запазычваць замежныя методыкі, — заявіў палкоўнік Алег Лапцеў, начальнік рэчавага ўпраўлення Міністэрства абароны. — У нашай краіне распрацоўваецца ваенная форма, якой варта аддаваць прыярытэт у сучасных умовах.

Што датычыцца харчавання, то да канца гэтага года ва Узброеных Сілах Беларусі плануецца ўвесці палепшаны асартымент прадуктаў. У 2006 годзе спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены рэкамендавалі збалансаваць харчаванне не па схеме — энергазатраты — калорыі, а бялкі — тлушч — вугляводы. На салдацкім стале хутка з'явяцца сыр, смятана, маянэз, кетчуп, болей яек. Замест 100 грамаў хлеба ўведзена булачка з пшанічнай мукі першага гатунку. Перавага аддаецца прадуктам без халестэрыну. І ўсё ж акцэнт зроблены на павелічэнне бялкоў у рацыёне ваеннаслужачага. Пашыраецца колькасць сокаў, агароднiны і садавіны, у прыватнасці, яблыкаў. Святочны ж абед прадугледжвае палепшаны асартымент круп, катлеты, цукеркі і пячэнне. У палявых умовах будзе выкарыстоўвацца мінеральная вада ці фруктовыя газаваныя напоі. У лепшы бок мадэрнізавана ўпакоўка для сухога пайка.

**Ірына ПРЫМАК.**

# Меч Рамзэса Другога, кінжалы Клеапатры...

**«Халодная зброя» — так называецца выстаўка розных відаў баявой халоднай зброі, якая працуе ў Дзяржаўным літаратурным музеі імя Янкі Купалы.**

Сярод экспанатаў выстаўкі не толькі добра выкананыя копіі лепшых узораў, але і арыгінальныя прадметы. Большую частку экспазіцыі займае ўзбраенне эпохі Сярэднявечча: мячы, дзіды, шаблі, кінжалы і шмат іншага. Асаблівую цікавасць для наведвальнікаў прадстаўляе калекцыя легендарнай зброі: меч Одзіна — бога вайны ў скандынаўскай міфалогіі, Эскалібур — легендарны меч караля Артура, меч правіцеля Рамзэса Другога, аднаго з самых вядомых егіпецкіх фараонаў, а таксама кінжалы Клеапатры. Акрамя гэтага, наведвальнікі змогуць пабачыць вялікую калекцыю японскай цырыманіяльнай зброі. Багата прадстаўлена на экспазіцыі калекцыя дагестанскай зброі. Тут жа размешчаны прыгожыя дываны і традыцыйныя рогі для віна, з якіх пілі пасля перамогі ў бітвах.





Выстаўка арганізавана сумесна з аб'яднаннем «Ramzes Expo», яна будзе працаваць да 20 красавіка.

**Уладзімір СТАЛОВІЧ.**
**Фота аўтара.**



## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

БАНКОВСКИЙ ПРОЦЕССИНГОВЫЙ ЦЕНТР

www.npc.by

### Годовой бухгалтерский баланс за 2007 год

*млн. рублей*

| Актив | Код стр. | Сумма | Пассив | Код стр. | Сумма |
|---|---|---|---|---|---|
| Основные средства | 110 | 14204 | Уставный фонд | 410 | 5362 |
| Нематериальные активы | 120 | 50 | Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | 30 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | 676 | Резервный фонд | 420 | 174 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 483 | Добавочный фонд | 430 | 10417 |
| Запасы и затраты | 210 | 5527 | Нераспределенная прибыль | 450 | 3656 |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 693 | Доходы будущих периодов | 470 | 4034 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 6529 | Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 3608 |
| Денежные средства | 250 | 2028 | Кредиторская задолженность | 530 | 6622 |
| Финансовые вложения | 260 | 3668 | Задолженность перед учредителями | 540 | 10 |
| | | | Резервы предстоящих расходов | 550 | 5 |
| БАЛАНС (110+120+130+140+210+220+230+250+260) | **300** | **33858** | БАЛАНС (410-411+420+430+450+470+510+530+540+550) | **600** | **33858** |

### Отчет о прибылях и убытках за 2007 год

*млн. рублей*

| Наименование показателя | Код стр. | Сумма | Наименование показателя | Код стр. | Сумма |
|---|---|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **30899** | Операционные расходы | 090 | 239 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 5258 | Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций | 110 | 1 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | **25641** | Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+110) | 120 | **220** |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 19002 | Внереализационные доходы | 130 | 8 |
| Расходы на реализацию | 050 | 301 | Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 140 | 8 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050) | 060 | **6338** | Внереализационные расходы | 150 | 950 |
| Операционные доходы | 070 | 491 | Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | **-942** |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 071 | 33 | Прибыль (убыток) (060+120+160) | 200 | **5616** |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 080 | 458 | Налоги, сборы и платежи из прибыли, производимые из прибыли | 210 | 1340 |
| | | | Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 6 |
| | | | Чистая прибыль (убыток) (200-210-220) | 240 | **4270** |

### Информация об открытом акционерном обществе

Количество акционеров — всего: 9, в том числе юридических лиц — 9

**ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период |
|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 1071 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 1721486 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 31475 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 1 |

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период |
|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 15 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | — |

Численность работающих (человек) — 163.

Основные виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: оптовая торговля, оказание услуг по процессингу.

Баланс и отчет подтверждены аудиторским обществом с ограниченной ответственностью «КвалитетАудит» — зарегистрировано решением Минского горисполкома от 27.07.2000 г. № 854 (в ЕГР № 101172919). Лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0061713 от 12.03.2004 г. действительна до 11.03.2009 года.

УНП 190381773


Інфарм-укол

## Шампіньёны супраць пухлін

**Шампіньёны надзвычай папулярныя ў многіх краінах свету і выкарыстоўваюцца ў розных кухнях.**

Яны ўтрымліваюць у сваім складзе рэчывы, якія разбураюць халестэрынавыя бляшкі і нават валодаюць супрацьпухлінавай актыўнасцю. Шампіньёны — гэта восем відаў амінакіслот, якія не сінтэзуюцца ў арганізме чалавека, а паступаюць толькі з ежай, гэта такія мікраэлементы, як цынк і барый, магній і малібдэн, волава і ёд, а таксама шэраг вітамінаў. Вось асноўныя шампіньёнавыя характарыстыкі:

- Крыніца паўнацэннага бялку, мінімум калорый.
- Шмат вітамінаў, мікраэлементаў і харчовых валокнаў.
- Выводзяць таксіны з арганізма.
- Умацоўваюць сардэчна-сасудзістую сістэму.
- Валодаюць антыбактэрыяльным дзеяннем.

Шампіньёны з'яўляюцца цудоўным дапаўненнем да смажанай бульбы або салатаў.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

# СЕМ НЯВЕСТАЎ АД СЛЕСАРА АБРАМЧУКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Многае ў гэтым пытанні трымаецца на ўстаноўках мінулага, прымхах. Маўляў, жанчына істота слабая. І ўсё ж у цывілізаваным грамадстве жанчыны не толькі ні ў чым не саступаюць мужчынам, а часта ў многіх пытаннях абганяюць іх. І тут не важна — у сям'і сыны ці дочкі. Для бацькоў галоўнае, каб дзеці былі разумныя ды ўдалыя. Гэта гаворачы па вялікім рахунку, але ж існуе яшчэ і штодзённае жыццё, і на кожнай сям'і ляжыць цяжар бытавых праблем. Напрыклад, бацькі сталі нямоглымі, і хто іх будзе даглядаць — сын ці дачка?

Вось у састарэлай тры сыны і столькі ж дачок. Калі захварэла, то жыве з дочкамі — па два гады ў кожнай. А сыны жанатыя і далёка не кожная нявестка хоча жыць са свякроўкай. Хоць і ёсць выпадкі, калі яны між сабой ладзяць і ў састарэлай з нявесткай лепшы кантакт, чым з дачкой. Проста яна разумная і цярплівая, бо таксама чыясьці дачка.

Калі ў цябе сыны, то цяжка рабіць нейкія высновы наконт дачок, але адзін мой знаёмы іншым разам ды і паскардзіцца. Маўляў, жонка скажа слова, а дочкі тут жа яе падтрымаюць, а аднаму абарону трымаць цяжкавата.

На адным дабрачынным мерапрыемстве выпала пазнаёміцца з Ірынай Абрамчук, а ў яе сем дачок, вось і напрасіўся на сустрэчу, бо надзвычай цікава ведаць: як у такім сямейным калектыве складваюцца адносіны?

Жывуць Абрамчукі на ўскраіне горада ў драўляным доме. Жыллё невялікае — усяго два пакоі, але ўжо сям'я атрымала 90 млн крэдыту і пачала будаваць дом. Закупілі матэрыялы і вырашылі ўзводзіць яго сваімі сіламі. Але ж у сям'і адны дзяўчаты...

— А нічога, вось фундамент клалі, то старэйшыя дапамагалі — нешта падносілі, раскладалі раствор, — растлумачыў бацька. Віктар Аляксеевіч не толькі спецыяліст па аўтамашынах, але і муляр не горшы. Вось і спадзяюцца Абрамчукі, што справяцца з будоўляй, а гэта будзе намнога танней.

А знаёмства з сям'ёй пачалося з чытання дзённіка, які вядзе гаспадар. Там — не толькі фіксаванне пражытых дзён, але і разважанні, свае погляды на жыццё. Упершыню сустракаю простага чалавека, у якога клопату штодзённага хапае, а ён нешта яшчэ занатоўвае. А галоўнае, што напісанае датычыцца сям'і, чалавечых адносінаў, маралі...

Вось я і даведаўся, як Віктар Аляксеевіч ажаніўся, як прайшло вяселле і як на лодцы плыў з жонкай. А яна ў белым вянчальным уборы... Не было спачатку палкага кахання і заляцанняў, Абрамчук сябе не дужа высока ставіў. А ў Ірыне ён убачыў Мону Лізу (падабенства ёсць) і спытаў толькі: «Выйдзеш за мяне замуж?», а праз некалькі месяцаў паўтарыў тое ж самае. І толькі пазней прыйшло каханне, і тады Віктар зразумеў, якое шчасце выпала яму.

І як вынік таго кахання, дочкі: Ала, Ларыса, Іра, Анжаліка, Віка, Света, і, як мне падалося, большасць з іх падобныя на бацьку.

— Дочкі ва ўсім падтрымліваюць бацьку, а мне гэта прыемна, — гаворыць гаспадыня, — бо ён у нас адзін.

**«Мы выхоўваем сем нявестаў, імкнёмся, каб яны выраслі добрымі жонкамі і маці. Гадуйце нам дастойных жаніхоў!»**

Ёсць у сям'і яшчэ і Ангеліна — прыёмная дачушка, у школу пакуль не ходзіць.

Чаму ж не хлопчыка было ўзяць?

— Дом пабудуем, то дваіх возьмем — мне памочнікі таксама патрэбныя, — тлумачыць Віктар Аляксеевіч. — Але пакуль не выходзіць, бо для хлопчыка патрэбны асобны пакой, а нашы дзяўчаты ў адным, вунь ложкі ў два паверхі. А ў Ангеліны, ва ўсякім разе, будзе ў жыцці шанц. Калі мы забіралі яе да сябе і пасадзілі ў машыну, то дзяўчынка, якая была панурай, раптам заспявала, а гэта кранае.

Падчас размовы мне падалося, што сям'я Абрамчукоў даволі гарманічная.

Старэйшая дачка Ала вучыцца завочна ва ўніверсітэце імя Максіма Танка на гісторыка і марыць пра магістратуру, а Ларыса — навучэнка каледжа лёгкай прамысловасці, марыць, каб у яе была вялікая і дружная сям'я. Ірына закончыла школу і будзе фінансістам — паступае ў мясцовы ўніверсітэт. Анжэла на першым курсе музычнага вучылішча, іграе на флейце і ўжо думае пра кансерваторыю. Дзяўчына вельмі ўжо адданая музыцы і кожны дзень яе пачынаецца а палове пятай.

Дарэчы, сям'я вельмі музычная, бо іграюць таксама і бацькі. Пяцікласніца Вікторыя добра спявае і выступае на розных канцэртах.

Самая малодшая, Ангеліна, яшчэ гуляе з цацкамі, якіх тут мноства, і, напэўна ж, мае сваю маленькую мару, а вось Света — хоць толькі ў трэцім класе, але іграе на фартэпіяна і сказала, што добра было б стаць пісьменніцай. На яе, напэўна, зрабілі ўплыў творы таты, якія ён часам чытае.

Многа дзяцей, то і клопату, напэўна ж, з імі хапае. У кожнага свой характар і ад гэтага нікуды не падзецца. За нейкую там правіннасць бацькі на дачок не крычаць, а стараюцца спакойна ўказаць на памылку.

— У сямейных адносінах галоўнае не гарачыцца і не спяшацца з высновамі, — выказвае сваю думку Віктар Аляксеевіч, — сказаў крыўднае слова, папракнуў нечым жонку — з'явілася трэшчынка, парвалася нітачка, якую затым ужо цяжка склеіць і звязаць. Давер павінен быць паміж бацькамі. Неабходна давяраць дзецям, тады яны адкажуць узаемнасцю.

Дочкі вучацца на васьмёркі і дзясяткі і бацькі лічаць, што разумнаму чалавеку лягчэй жыць.

У Маларыцкім раёне ёсць у Абрамчукоў дача — хата засталася ад бацькоў. Вось дзяўчаты на ўсё лета выязджаюць туды адпачываць і працаваць на 30 сотках. І нарыхтоўка прадуктаў ідзе маштабная: 150 слоікаў кампоту, 70 — салатаў, 50 — памідораў.... кансервуюцца, марынуюцца і прывозяцца ў падвал. Гаспадары прапанавалі зазірнуць у сваё сховішча. Пяць радоў паліц былі ўстаўлены трохлітровымі слоікамі, праўда, у большасці ўжо пустымі, бо неўзабаве неабходна будзе думаць пра новыя запасы.

— Вось у нас усе дзяўчаты і я, адзіны мужчына ў доме, адчуваю сябе вельмі камфортна. Самае важнае, каб у сям'і панавала любоў. Сям'я — апора чалавека і нават калі з ім нешта здарыцца, падвядзе здароўе, то сям'я падтрымае. Гэта калі сям'я здаровая і адносіны ў ёй нармальныя. А сыны ці дочкі... Вось мы гадуем і выхоўваем нявестаў, якія, спадзяёмся, будуць добрымі жонкамі і маці. А тыя, у каго хлопцы, няхай паступаюць такім жа чынам і выхоўваюць сапраўдных мужчын, якія змогуць несці адказнасць за свае сем'і. Так што гадуйце нам жаніхоў!

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Наш культурны асяродак*

# Жырандоля

*Выпуск № 5 (27)*

## МУЗЕЙ ПАЛЕСКАГА ГОРАДА

***Трыццацігадовага ўзросту дасягнуў Лунінецкі раённы краязнаўчы музей. Акрамя пастаяннай краязнаўча-гістарычнай экспазіцыі, у сценах старажытнага будынка штогод адбываюцца дзесяткі выставак народнага і прыкладнога мастацтва, майстроў пэндзля, дзіцячых прац. Цяпер у музеі праходзіць выстаўка дзівосных вырабаў з саломкі, якая прыцягвае ўвагу многіх жыхароў палескага горада.***





**На здымку:** *дырэктар музея Наталля КЛЕЎЖЫЦ і супрацоўніца гэтай установы Ніна ЛУД на фарміраванні новай экспазіцыі.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ДЗЕЦІ ТЭАТРА, ці Homo teatricus

**Да Міжнароднага дня тэатра Купалаўскі тэатр падышоў на ўздыме: вядуцца размовы пра капітальны рамонт, але пры гэтым планы будучых грандыёзных пастановак ніхто не адмяняе. Вось і гучная прэм'ера сакавіка ўзварухнула тэатральную грамадскасць: беларускі тэатр звярнуўся да рускай класічнай драматургіі. Яго рэжысёр Аляксандр Гарцуеў здзіўляў дагэтуль сваімі сучаснымі пастаноўкамі, пошукамі новых формаў і поглядаў на тэмы. Цяпер таксама здзівіў: «Дзеці Ванюшына» — пастаноўка, якая выканана ў класічных традыцыях, а яе прэм'еру публіка сустрэла аншлагамі. Сакрэт поспеху спектакляў беларускага тэатра нам сёння дапаможа вызначыць адзін з рэжысёраў-купалаўцаў Аляксандр Гарцуеў. Як і зразумець псіхалогію «чалавека тэатра».**





Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА.

### Новае

— Сталею, мне пад пяцьдзесят, і з сівізной у валасах я пачынаю больш цаніць сапраўдныя каштоўнасці, разумець, што лепш за класіку нічога не бывае, — гаворыць рэжысёр. — Разумею, чаму гэтая драматургія стала класічнай. У школе мы ўяўлялі класіку як нешта нудотнае, несучаснае. Але ўжо на маіх вачах многія пісьменнікі і драматургі, якія з'явіліся 20—30 гадоў таму, некуды зніклі. Ці страцілі актуальнасць іх творы. А тое, што застаецца хоць бы на пяцьдзесят, на сто гадоў — ужо ёсць класіка. А калі на працягу двухсот ці трохсот гадоў яно камусьці патрэбна, ужо праверана папярэднімі пакаленнямі, — то яно будзе цікавае і нам. На мой погляд, п'еса Сяргея Найдзёнава «Дзеці Ванюшына» цудоўная. Для яе пачаўся новы час, я лічу, цяпер другое нараджэнне гэтай тэмы. Так, яна 30—40 гадоў таму ставілася ў тэатры. Але тады гэта было крытычнае адлюстраванне нораваў канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, крызісу буржуазнай сям'і. Прайшоў час — і так усё празрыста, так зразумела для нас. Гэта, аказваецца, не крызіс буржуазнай сям'і, а проста крызіс сям'і як такой, які адлюстраваны ў гэтай п'есе. Крызіс у адносінах бацькоў і дзяцей, які замешаны на грашовых «разборках». Калі бацька клапаціўся пра здабыванне грошай і лічыў, што тым самым клапоціцца пра сям'ю, пра дзяцей. Ён самаадданна працаваў, але дзецям казкі не распавядаў. Вось гэта размова пра якое стагоддзе?.. А чалавеку ж ва ўсе часы хочацца думаць пра чалавечае.

Тое, што цяпер я ўзяўся за класіку, не значыць, што я адмаўляюся ад нейкіх ранейшых знаходак. Не значыць, што цяпер буду займацца толькі рэалізмам, «бытавізмам». Мне не хацелася б быць абсалютна пазнавальным, аднолькавым. Але галоўнае, каб была цікавасць да тэмы і матэрыялу, з якім працуеш. Патрэбны рух душы. Я зразумеў, што кожны год, які праходзіць, пакідае табе нейкі шлейф, базу твайго жыццёвага вопыту. І ўзнікае жаданне гаварыць пра нешта. Цяпер, напэўна, ад таго, што я ўжо дарослы бацька, мне цікава паразважаць пра адносіны бацькоў і дарослых ужо дзяцей.

Калі я пачаў рабіць спектакль, свядома адмовіўся ад псеўданаватарскіх штучак. Таму што можна забрудзіць п'есу і згубіцца зерне. І калі наконт дэкарацый з мастаком Ігарам Анісенкам думалі, то хацелі, каб было вобразна, але рэалістычна: стол, крэслы, тры паверхі. Таму што ў аўтара ўсё дакладна: тут дзеці, там бацькі, а ніжэй яшчэ адна дачка. Вось гэтая знешняя празрыстасць дала магчымасць паказаць складанасць узаемаадносінаў усіх прадстаўнікоў сям'і Ванюшыных.

### Акцёрскае

*— Над чым з большай цікавасцю працуюць акцёры: над эксперыментальнымі спектаклямі ці над класікай?*

— Акцёры заўсёды любяць працаваць над класікай. Таму што для акцёра неабходны матэрыял, калі ёсць з чаго рабіць ролю. Гэта ўзаемаадносіны паміж героямі, шчыльнасць эмацыянальных перажыванняў, дзе можна быць розным. У класічных творах гэта, як правіла, ёсць. З Генадзем Аўсяннікавым я дагэтуль не працаваў. Я яго вельмі добра разумеў і, здаецца, ён мяне таксама. Я вельмі задаволены, як ён зрабіў ролю Ванюшына. Ён вялікі артыст, апошні народны артыст Савецкага Саюза ў нашым тэатры, і ён спраўджвае гэтае званне.

### Зразумелае

*— Ці трэба рэжысёру быць зразумелым, ці трэба, каб яго разумелі?*

— Я ведаю розных сваіх калег, якія па-рознаму ставяцца да гэтай праблемы. Вядома ж, мне хочацца перш за ўсё, каб мяне разумелі. А быць зразумелым усім і заўсёды — не лепшае імкненне, і не вельмі цікава так працаваць. Таму што людзі розныя, з розным культурным і інтэлектуальным узроўнем. Заўсёды хочацца, каб цябе разумеў глядач самага высокага ўзроўню.

Быць рэжысёрам па-за сваім часам... Не хацелася б. Бывае такое, калі казалі: ён працаваў на дваццаць гадоў наперад, яго ў свой час не разумелі. Але адна справа, калі б гэта быў пісьменнік, драматург, ці рэжысёр кіно. А што ж тэатральнаму рэжысёру працаваць на будучыню?.. Успаміны пра спектакль застаюцца на паперках, у фотаздымках. Але ж перавага тэатра перад іншымі відамі мастацтва — яго непасрэднае ўздзеянне на публіку. Узнікае рэаліці-шоў, як цяпер кажуць: тое, што адбываецца менавіта зараз, у гэты момант, няхай і адрэпетаванае. Тэатр бярэ праўдай перажыванняў. Таму што, калі працаваць па сістэме Станіслаўскага, то акцёр перажывае тое, што перажывае яго герой. І ў гледачоў узнікае адчуванне праўды, яны нават суперажываюць. І тады ўзнікае той знакаміты катарсіс — вышэйшае дасягненне, калі глядач зліваецца з дзеяннем і адчувае высокі духоўны уздым. Гэта можа быць толькі цяпер, у гэты момант. Кожны ў тэатры працуе дзеля гэтага моманту.

*— Які тэатр цяпер шукаюць гледачы: зразумелы ці той, дзе трэба разумець?*

— Гледачы таксама розныя. Большасць, на жаль, ходзяць у тэатр, шукаючы забавы. Акрамя эстрады, ёсць і тэатр такі, ёсць лёгкія, вясёлыя спектаклі пра каханне, з песнямі і танцамі. Гэта ўсё мае права на існаванне. Таму што шырокі слой публікі кажа: дайце мне адпачыць, я ў жыцці так стамляюся, што ў тэатры хачу расслабіцца. Яны маюць на гэта права. Але мне хацелася б усё-такі прабівацца да душ і сэрцаў публікі, якая хоча думаць, якая жадае адкрыццяў, чакае высокіх вострых адчуванняў менавіта сёння.

Тэатр — гэта ж нешта вельмі ілюзорнае. Спектакль быццам бы ёсць, пастаўлены — але дзе ён? Ёсць твор мастацтва «Дзеці Ванюшына». Я заходжу ў залу, зараз стаіць пустая сцэна. І я думаю: а дзе мой спектакль? А раптам нешта здарыцца — і не будзе яго?.. Ён жа не прадмет, які існуе сам па сабе, а ён залежыць ад многіх падзей і людзей. Гэтая ілюзорнасць тэатральнай справы і палохае, і заварожвае. Мы ніколі не ведаем, калі і які спектакль іграем апошні раз. Проста раптам даведваешся, што вось такі спектакль вырашылі больш не ставіць у праграму. Добра, каб загадзя ведаў гэта і на высокай ноце з ім развітаўся — усё такі гэта частка тваёй душы...

### Лёсавызначальнае

— Лёс спектакля залежыць не заўсёды толькі ад наведвання публікі. І ад аб'ектыўных паказчыкаў, і ад суб'ектыўных фактараў. Напэўна, крытэрыем павінна быць яго мастацкая якасць. Але ў нас няма такіх тэрмометраў, вагаў, вымяральнікаў, каб вызначыць: спектакль сваё аджыў. Як вымераць працу тэатральнага калектыву за некалькі гадоў, калі спектакль ішоў? Я думаю, кіраўніцтва тэатра, якое вырашае гэтае пытанне, знаходзіцца ў найскладанейшай сітуацыі. Тут трэба ўлічваць і занятасць акцёраў: калі для паважанага акцёра гэта выйгрышная роля, то трэба даць яму працаваць, падтрымаць гэты спектакль. Але ёсць такое паняцце: спектакль прайшоў. Сярэдні тэрмін жыцця, напэўна, сем-восем гадоў. Для звычайнага спектакля тры-чатыры гады — таксама нармальны тэрмін. Не кожны спектакль дажывае да ста паказаў. Безумоўна, бывае і па дзвесце, і па трыста — гэта ўжо ў асаблівых заслужаных. Ёсць і выключныя — як «Паўлінка»... Але калі сто разоў спектакль прайшоў, як правіла, сваё ён ужо пражыў. Таму што павінны з'яўляцца новыя. І кіраўніцтва тэатра бярэ на сябе вялікую адказнасць, калі вырашае лёс спектакляў...

### Аптымістычнае

*— Колькі гадоў нам кажуць, што тэатр памірае. Няўжо гэта так?*

— За сто апошніх гадоў, калі з'явілася кіно, ужо стаміліся гаварыць пра гэта. Цяпер ужо прыйшла іншая тэхніка, лічбавая, а тэатр усё жыве. І ён будзе заўсёды па адной простай прычыне: непасрэднасць таго, што адбываецца, жывое дзеянне, якое не створыць і не заменіць ніякая галаграма. Нават калі створаць тэатр з галаграфічных акцёраў — яны ўсё роўна будуць штучныя. І гэта будзе зусім не той тэатр. А вось іншая справа — формы тэатра. Тут я не магу сказаць, які стане тэатр, які выгляд ён будзе мець. Не выключаю нават, што галаграфічныя выявы будуць дапамагаць акцёрам. Так ліха было б, здаецца, калі б з'явіліся галаграфічныя дэкарацыі: бах — і замак стаіць... Але жывы чалавек — аснова тэатра. Людзі заўсёды цягнуцца адзін ад аднаго. Шмат што можа змяніцца, але тое, што жывыя артысты будуць несці жывыя пачуцці з дапамогай жывога слова і эмоцый — наўрад ці.

### Сямейнае

*— Ці лёгка працаваць са сваімі блізкімі на сцэне?*

— І лёгка, і цяжка. З дачкой працей — мы генетычна звязаныя з Валянцінай, яе псіхафізіка падобная на маю, і я лёгка знаходжу, на што націснуць. Гэта амаль што я. Мы нібыта тэлефоны адной маркі. З жонкай трошкі складаней. Таму што Зоя Белахвосцік генетычна больш далёкі чалавек ад мяне, актрыса, да якой трэба падабрацца, яна можа нешта не ўспрымаць. Я разумею, што трэба ўвайсці ў меню, пашукаць кропачкі, на якія націснуць. Калі я працую, то ў мяне няма думак пра тое, што гэта жонка, а гэта дачка, і да іх трэба па-іншаму ставіцца. У кожнага свая роля і свая функцыя, на якую трэба працаваць.

### Міжнароднае

*— Вы працуеце ў беларускім тэатры, часта з імі бываеце на міжнародных фестывалях, дзе не заўсёды разумеюць нашу мову. А наш тэатр разумеюць?*

— Так, я шмат бываў на фестывалях, і мы ігралі на сваёй мове для людзей, якія яе не ведаюць. Я сам глядзеў спектаклі на замежных мовах, якіх не ведаў. Глядач ува мне зразумеў: калі штосьці сапраўднае адбываецца на сцэне, то гэта можна адчуць. У Таліне на фестывалі я глядзеў Ізраільскі тэатр, пад кіраўніцтвам Канеўскага. Яны ігралі на іўрыце. Я ніводнага слова не ведаю, але адчуванне было неверагоднае, ад таго, як гэта было зроблена. Гэта вельмі заварожвала. Калі мы выязджалі з «Крывавай Мэры», дзе тэкст па вялікім рахунку ўспрымаецца як музыка, дзе ёсць адна эмоцыя, яна праходзіла заўсёды на «ўра». У Румыніі нас ледзь не «парвалі», такога апафеозу я нідзе не адчуваў. Мова ў тэатра свая. І калі гэта сапраўднае мастацтва — яна зразумелая паўсюль.

*— У Беларусі былі спектаклі, пасля якіх вас гатовыя былі «парваць»?*

— У Беларусі не такая публіка. Мы ж еўрапейцы... паўночныя. Прыязджаеш у Эстонію: пляскаюць у далоні — выдатна. Ва Украіне зусім іншая рэакцыя. А ў нас прынята ўставаць пасля кожнага спектакля, што для Еўропы — нонсенс. У некаторых краінах уставаць лічыцца ўвогуле непрыстойным. У нас гэта — добры тон. Калі не ўстануць пасля спектакля — лічы, правал. Але я такога не памятаю. Вельмі добрыя ў нас людзі.

### Адданае

*— Матывацыя, з якой вы маладым артыстам прыходзілі ў тэатр, і матывацыя, з якой працуеце цяпер, вельмі змянілася?*

— Вельмі. Магчыма, адно засталося — адчуванне захаплення. А стаўленне да прафесіі, падыход да яе абсалютна змяніліся. Я гадоў у сем абраў для сябе прафесію, не марыў быць ні касманаўтам, ні ўрачом. Так у ёй і жыву. За гады маё разуменне, што такое акцёр, што такое рэжысёр, што такое творчая асоба — стала больш ёмістым, і больш шырокім. Для мяне аснова працы — сумленне. Калі можна гаварыць пра нейкія рэчы, якія табе баляць, гаварыць шчыра, адкрыта. Я думаю, што тэатральны чалавек у гэтым сэнсе не адрозніваецца ад іншай творчай асобы. Гэтая праца замешаная і на асабістых амбіцыях. Я гэтага пачуцця напачатку баяўся, потым зразумеў, што гэта той выпадак, калі амбіцыі не шкодзяць справе, а наадварот, даюць штуршок.

*— Няўжо не было сумненняў і расчараванняў?*

— Былі дробныя расчараванні, пабытавыя, жыццёвыя, а калі прафесійныя, то з-за дробязяў. Хоць гадоў дзесяць—пятнаццаць таму былі розныя думкі... Крызіс сярэдняга ўзросту. Я яго перажываў бурна і складана. Але перажыў. І ў выніку так атрымалася — стаў рэжысёрам. Проста павінен быць рух. Я не люблю спыняцца. Мне сумна становіцца, навальваецца дэпрэсія, калі я нічога не раблю. Цяпер дзве прэм'еры паралельна выпусціў, буду брацца за трэці спектакль. Баюся не рабіць — і так шмат чаго цікавага ў жыцці прапусціў. А тэатральнае жыццё не спыняецца і не чакае. Калі хочаш быць у тэатры — жыві ім.

**Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.**

### Конкурс мастацкіх работ на тэмы «Раздайся, звон» і «Вялікдзень чырвоны» аб'яўлены ў Мінску

**Школа званароў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення аб'явіла адкрыты гарадскі конкурс мастацкіх работ на тэмы «Раздайся, звон» і «Вялікдзень чырвоны» ў намінацыях: жывапіс, літаратура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Аб гэтым паведамілі ў цэнтры асветы і міласэрнасці Беларускага экзархата «Усіх тужлівых Радасць».**

Да ўдзелу запрашаюцца дзеці да 15 гадоў і моладзь ад 15 да 23 гадоў. Пераможцаў конкурсу чакаюць каштоўныя падарункі. Выстава лепшых работ адкрыецца 28 красавіка ў галоўным корпусе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

**Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, БЕЛТА.**

**Ивенецкий поселковый исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**
проводит открытый аукцион по продаже 4 (четырех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

**Лот 1** — земельный участок в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1914 га, начальная стоимость 5 000 000 белорусских рублей; **Лот 2** — земельный участок в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1520 га, начальная стоимость 4 200 000 белорусских рублей; **Лот 3** — земельный участок в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1914 га, начальная стоимость 5 000 000 белорусских рублей; **Лот 4** — земельный участок в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1520 га, начальная стоимость 4 200 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Имеется в непосредственной близости газ и центральное водоснабжение. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3604614090006 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк» код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13. УНП 600037277 ОКПО 04432328 Ивенецкий поселковый исполнительный комитет. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 20 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 18 апреля 2008 г. в 15.00 по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2, 2-й этаж, зал заседаний.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 17 часов 17 апреля 2008 года по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2, кабинет секретаря.

**Контактный телефон: 8 017 272 53 367.** УНП 600037277.

**Муз-news**

### Закулісная рэальнасць у кліпе

**Гурт «J:морс» скончыў працаваць над кліпам на песню «Адлегласць» — загалоўную кампазіцыю з беларускамоўнага альбома, што выйшаў напрыканцы мінулага года. Убачыць відэа ўжо можна на афіцыйным сайце калектыву.**

Аснову відэакліпа склалі аматарскія здымкі канцэртаў і закулісных падзей, зробленыя музыкантамі і персаналам у апошнія некалькі гадоў. Усё гэта рэжысёр Юлія Геляжунас разбавіла фрагментамі фільма «Адлегласць: падарожжа па Беларусі» — і атрымалася цэласная карціна гастрольнага жыцця.

«У кліпах многія артысты спрабуюць стварыць сабе пэўныя вобразы, каб прыцягнуць увагу гледачоў. Мы ж не зрабілі ніводнага пастановачнага кадра, пастараліся перадаць рэальную атмасферу гастроляў, — расказвае Уладзімір Пугач. — Можна сказаць, што вы бачыце ўсё нашымі вачыма». «Усё» — гэта пераезды і саўндчэкі перад выступленнямі, грымёркі і стасункі з публікай, вясёлыя рожыцы, якія курчаць музыканты, пераноска інструментаў і размінка перад выхадам на сцэну... Словам, удзельнікі гурта паказалі, што ў жыцці яны гэткія самыя, як і на сцэне — ніякай «зорнасці», усё адкрыта і празрыста.

Здымкі кліпа не перашкодзілі і не паўплывалі на гастрольны тур па Беларусі, які «J:Морс» цяпер працягвае. У бліжэйшы час выступленні калектыву чакаюцца ў Лідзе, Гомелі і Гродне.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**На конкурс апавяданняў**

***Чаканне — ці не самы распаўсюджаны стан сённяшняга чалавека. Чаканне і самота — ці не яны адраджаюць нас. Нараджаюць думку і даюць творчы імпульс таму, што да пары да часу дрэмле ў чалавеку; дазваляе зірнуць на сябе крыху збоку, а мо і зверху, сумна ўсміхнуцца і паведаць іншым нешта невядомае нават самому сабе, як гэта зрабіў мінчук Аляксандр Васюшын.***

**Віктар КАЗЬКО.**

**Аляксандр ВАСЮШЫН**

## Хто чакае, той...

Чаканне — найвялікшая пакута. Знямогла чакае пустыня дажджу. Хвіліны чакання каханай тупымі нажамі пілуюць мужчынскае сэрца, матуля начамі не спіць і чакае прапаўшага сына. Нішто, гэта ўсё дробны пыл, калі ты ніколі не бачыў апошнія хвіліны апошняга ўрока другой змены. Сапраўднае — гэта сорак чыстых, бы ў мадонны з карціны, вачэй з недзіцячым пытаннем «За што???» і з адчайным і дзікім жаданнем свабоды.

«Яны гатовы аддаць усю гісторыю разам з гісторыкам за адзін гэты агідны гук званка... гмм, магчыма, і я таксама...» — такая крымінальная думка нахабна прабралася нават у настаўніцкія звіліны. Язык жа, рукі, вочы і ўсё цела Аляксея Пятровіча жыло ўжо аўтаномна ад свядомасці — шоў павінна было працягвацца, і ўрок ішоў сваім ходам.

Нарэшце званок, бы хваля цунамі, злізаў шасцікласнікаў і панёс іх па калідорах і лесвіцах. Як заўсёды пасля шторму, засталося шмат смецця ды бруду пад сталамі, і Алеся ўжо цягнула швабры, шчоткі і вядро. «Эх, цётка, прачысці ты і мае мазгі пасля гэтага вар'яцтва. Ну ці можа гісторыя цікавіць гэтых чыпсаедаў, і Радзівілы не цвікі, каб гвалтам убіваць іх у апухлыя ад камп'ютараў галовы...» — думаў Аляксей Пятровіч, складваючы стосы вучнёўскіх сшыткаў у аб'ёмісты партфель.

За акном жамчужнае восеньскае паветра песціла сцягі на вежах, нізкае сонца клала агністыя блікі на шызую ваду ў ірвах. Сінявокі рыцар на моцным кані чакаў ля магутных варот магнацкага замка, і трубы спявалі:

— Барбара, любая, я прыйшоў, я вярнуўся, я прайшоў гэты свет з мячом і шчытом, і не было ваяра за мяне больш адважнага. Я набіў золатам мяхі, я скараў гарады, я змагаўся з волатамі — усё для цябе, каханая...

Тонкая постаць на галерэі зрабіла знак слугам, і вароты паволі пачалі адчыняцца...

— Аляксей Пятровіч, мне трэба тут падмесці! — горш за нямазаныя петлі зарыпеў голас прыбіральшчыцы, і замак абярнуўся супермаркетам, у які чародамі і па адной уваходзілі і выходзілі звычайныя гараджанкі, і да ну не студэнтаў, а такіх, як ты... Лёша, зараз ты будзеш знаёміцца! А то ў тваёй школе ты ці застанешся халасцяком, ці станеш педафілам. Ух, гэтыя вучыхалкі, правільныя істэрычкі, шэрыя пацукі з валасамі ў гульку...

князёўнаў ім было да-ле-ка-вата!

«Вось яна, сучасная паненка — у сінім мурзатым халаце на працы, у аблезлым кітайскім — дома», — з прыкрасцю падумаў Аляксей Пятровіч, адыходзячы ад акна. «Дзе ж вытанчанасць, адухоўленасць вачэй, высакароднасць рухаў, чароўны голас? Ну і што, што прыбіральшчыца, ты ж маладая жанчына, яе вялікасць Жанчына!». Але ён нічога не сказаў, запхнуў карты ў брыдкага колеру шафу і пайшоў.

Рэшту вечара з'елі сшыткі і планы, і толькі паўтары гадзіны заставалася да поўначы, як бура прыгнала Паліну, сястрычку-лісічку. Што ж, нарадзілася рыжай — жыві лісічкай...

— Ну здароў, вялікі брат! — усміхаючыся на ўсе зубы, павіталася яна і ўскочыла ў мяккае камп'ютарнае крэсла. Аляксей Пятровіч яшчэ толькі ўваходзіў у пакой, а Паліна ўжо лезла ў Інтэрнэт, нецярпліва перабіраючы пад сталом ножкамі ў высокіх вышываных боціках.

— Прабач, я не разулася. Але іх так цяжка здымаць... затое сядзяць як улітыя... увесь заробак ляснуў, на адну стыпендыю трэба два тыдні існаваць!

— Ліска, ну куды ты лезеш, што гэта за дзікі сайт? Пасля ад вірусаў не адчышчуся...

— Лёш, я ведаю, што раблю! Тут класна! Мы знаёмімся праз Інтэрнэт, так здорава! І тут вось мы знайшлі нават дарослых людзей...

Аляксей Пятровіч толькі скрывіў цвёрдыя вусны ва ўсмешку. Настаўніц ён ніколі не ўспрымаў як жанчын. Вечныя курыныя клопаты і сумятня ў настаўніцкай і паратройка калег-мужчын па кутках хутка зрабілі яго неадчувальным да стараннага какецтва маладых — і не вельмі — саратніц па журналах і двойках.

— Шчыры, рамантычны, адукаваны, шчодры, разумны... ага, цудоўныя сінія вочы, адкрытая ўсмешка, хм, гарбузок замест магутнага прэса... не бойся, я гэтага не пішу! — бойка ляпала на клавішах Паліна, рэгіструючы яго на чортведама якім сайце знаёмстваў. Аляксей Пятровіч падумаў, што нядрэнна было б наведаць зубнога, і стаў проста назіраць, як працуе сястра, гэта ён любіў яшчэ з дзяцінства. Малая была яго найлепшай цацкай, і часта яна тварыла што хацела ў яго пакоі і з яго рэчамі, а ён проста глядзеў на безупынны рух гэтага жывога шарыка ртуці. Пухлае дзяўчо стала моднай, па-сучаснаму высокай і худзенькай прыгажуняй, зусім не падобнай на брата ні знешне, ні характарам, што не перашкаджала яму моцна любіць яе. Але нават Паліна была далёкай ад яго ідэала жанчыны — летуценнай, загадкавай, таямнічай.

— Ну, брат, давай свой нік, які ты выбіраеш? Радзівіл? Пане Каханку? Шляхціц Завальня?

Ах, лісічка, ну што смешнага ў тым, што твой брат любіць старасвецкую беларушчыну больш за твае свецкія тусоўкі...

— Які хочаш, малая, — паціснуў плячамі Аляксей Пятровіч.

— Йее, тады ты будзеш... Хуан!

— Чаму — Хуан?!!

— Коратка і шматзначна — нагадвае дон Жуан і... ну не хочаш — не трэба..., — пакрыўдзілася Паліна.

— Не-не, хай сабе і Хуан, — паспешліва сказаў Аляксей Пятровіч.

— Добра, Ххxуан, — чмыхнула сястрыца, — а цяпер вось тут уводзь пароль!

Яна порскнула ад стала і карціна затуліла далонямі вочы.

Што ж, пароль будзе Барбара...

— І што мне цяпер з гэтым рабіць, малая?

— А, знойдзеш што! Глядзі фоткі, знаёмся, закахайся, ажаніся...

Паліна ўжо астыла ад новага праекта, а можа, выдумала штосьці яшчэ. Апошні час яна рэдка затрымлівалася ў брата больш чым на паўгадзіны.

Было ўжо добра за поўнач, калі Аляксей Пятровіч вылез з Інтэрнэта. Так, на свеце ёсць яшчэ жанчыны, акрамя настаўніц. Яны — студэнткі, бухгалтаркі, пенсіянеркі, прадаўшчыцы, мастачкі, хатнія гаспадыні — цікавяцца паэзіяй сярэбранага веку, кітайскімі баевікамі, філасофіяй Ніцшэ, дыскатэкамі, грашыма, пакаёвымі кветкамі, носяць доўгія, кароткія, пышныя, гладкія, цёмныя і светлыя валасы, а дзве саплюшкі былі нават з паголенымі галовамі. Гэтыя прыгажуні, кракадзілкі, зайкі і малпачкі глядзелі на свет шырокімі вачыма і шукалі там бедных, багатых, простых, сэксуальных, прыдуркаватых, адукаваных слесараў, дыпламатаў, бізнэсменаў, бібліятэкараў, пісьменнікаў і беспрацоўных. Але сярод дзяўчат, жанчын, баб і лэдзі не было ніводнай Дамы, і ні адной з іх не патрэбен быў сінявокі, крыху шчарбаты настаўнік гісторыі сярэдняга веку. Дарэчы, як і яны яму.

— Ххxуан, халера! — плюнуў Аляксей Пятровіч, выключаючы камп'ютар. Хацелася курыць і давялося ісці ў начнік за «Уінстанам».

Агні факелаў змагаліся з цемрай у вялікай зале. Музыкі гралі, весела гаманілі госці, з асалодай запускаючы пальцы ў шыкоўныя стравы, блазны стараліся як ніколі. Толькі сумнавокая Барбара сядзела за поўным келіхам, ловячы самыя ціхія гукі ў доўгім-доўгім чаканні срэбнага голасу труб ля замкавых варот.

Дзынкнулі дзверы.

Барбара хуценька падняла галаву з прылаўка — прыйшоў Яго вялікасць Пакупнік...

Грозны мужык спытаў два пачкі чырвонага «Уінстана», і дзяўчына з прафесійным аўтаматызмам падала яму цыгарэты, адлічыла грошы і выбіла чэк. «Табе б «Арбіту» лепш у твае шчэрбы», — нязлосна падумала яна і зноў прысела на прылавак. Але дрымота не ішла, і амаль уся ноч была яшчэ наперадзе.

**Тэлесеткі**

### «Песню для Еўрабачання» спяюць 20 чалавек

**Менавіта столькі, паводле правілаў адборачнага этапу, прайшлі ў паўфінал Рэспубліканскага дзіцячага конкурсу. Імёны шчаслівчыкаў, адабраных з 84 прэтэндэнтаў, сталі вядомыя напрыканцы мінулага тыдня, а днямі паўфіналісты сустрэліся з членамі прафесійнага журы для праслухоўвання і кансультацый. На тое, каб выправіць пэўныя хібы і наблізіць песню да ідэалу, канкурсантам адведзена амаль 2 месяцы.**

Паўфінал конкурсу адбудзецца напрыканцы мая ў эфіры Першага канала — у фармаце канцэрта, па выніках якога журы вызначыць 10 фіналістаў. А ўжо фінал, нагадаем, прызначаны на верасень гэтага года — і пераможцу тады вызначаць сумесна журы і тэлегледачы.

Старшыня прафесійнага журы, народны артыст Беларусі Васіль Раінчык адзначыў прыемную тэндэнцыю — сёлета на рэспубліканскі конкурс «Песня для Еўрабачання» пададзена ўдвая больш заявак, чым у 2007 годзе. Але да наступнага этапу ўсё адно дапушчаны толькі 2 дзесяткі юных выканаўцаў (усім ім на момант падвядзення вынікаў адборачнага этапу павінна быць не менш як 10 гадоў, а на момант правядзення міжнароднага конкурсу — не больш як 15). Цалкам спіс у алфавітным парадку выглядае так:

*1. Валазнёў Раман, г. Мінск — «Матуленька».*
*2. Ганчарова Кацярына, Карчэўскі Дзмітрый, г.п. Бераставіца, Гродзенская вобл. — «А там, за горизонтом».*
*3. Громава Дыяна, г. Гомель — «Та-ру-рам».*
*4. Гузіно Дыяна, г. Гродна — «Number One».*
*5. Дубоўская Марыя, г. Мінск — «Ромашки».*
*6. Дутчык Паліна, Сасуноў Міхаіл, г. Брэст — «Одноклассница».*
*7. Ермакоў Кірыл, г. Мінск — «Я пою для вас».*
*8. Ермузевіч Дзмітрый, г. Гомель — «Все мы дети земли».*
*9. Журовіч Мікіта, г.п. Лельчыцы, Гомельская вобл. — «Мечтать».*
*10. Конарава Аліна, г. Віцебск — «Волшебные сны».*
*11. Кузняцова Серафіма, г. Віцебск — «Не унывай!».*
*12. Кулагіна Ірына, г. Лепель, Віцебская вобл. — «Купальская».*
*13. Лемяшэўская Марыя, г. Кобрын, Брэсцкая вобл. — «SMS MMS».*
*14. Мяжэнная Кацярына, г. Мінск — «Пины-коды».*
*15. Міхайлава Дар'я, г. Віцебск — «Ода джазу».*
*16. Машчэнка Аліна, г. Магілёў — «Время».*
*17. Надзіна Дар'я, Жуковіч Карына, Молаш Аліна, г. Мінск; г. Баранавічы і г. Івацэвічы, Брэсцкая вобл. — «Сердце Беларуси».*
*18. Сарока Дар'я, г. Мінск — «Со-Да-Супер Стар».*
*19. Стэльмах Аляксандра, г. Гродна — «Молодое R`-n-B`».*
*20. Шульгіна Дар'я, г. Гродна — «Танцуем-танцуем».*

Амаль палова сёлетніх паўфіналістаў спрабуе свае сілы ў нацыянальным адборы не першы раз. Зрэшты, і леташняму пераможцу — як рэспубліканскага, так і міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне-2007» Аляксею Жыгалковічу — фартуна ўсміхнулася не з першага разу. Так што пажадаем удачы ўсім без выключэння, а перамога няхай, як заведзена, наймацнейшы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**